№ 25 (431) 8 ліпеня 2005

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Сапега вярнуўся ў горад-герой Быхаў**

Рэпартаж Аляксея Бацюкова. старонка 7

**Самі з вусамі**

Выбар нацыянальнага кандыдата: Статкевіч падтрымаў Мілінкевіча.

старонка 2

**Мода на XX стагодзьдзе**

Стыль лета.

старонка 16

ПАЛІТЫКА

### Форум мозгазнаўцаў

Беларускія ўлады на форуме «Эўропа: вынікі году перамен» прадстаўляў Сяргей Гайдукевіч. Апазыцыю — акадэмікі Аляксандар Вайтовіч і Анатоль Міхайлаў, экс-рэктар БДУ Аляксандар Казулін і кіраўнік Рады беларускай інтэлігенцыі Ўладзімер Колас. З штатных менскіх мозгазнаўцаў прысутнічаў Андрэй Суздальцаў. Менавіта Суздальцаў разам з Паўлоўскім узначалілі экспэртную групу па Беларусі. Артыкул Рамана Якаўлеўскага — **старонка 3.**

БІБЛІЯТЭКА

### Зьненавідны Яндарбі

Зелімха Яндарбі быў віцэ-прэзыдэнтам Ічкерыі, у 1996 г. выконваў абавязкі прэзыдэнта. Потым крывавая завіруха чачэнскай вайны закінула яго ў эміграцыю, у Катар, дзе ў 2004 г. ён загінуў у выніку тэракту, зьдзейсьненага супрацоўнікамі расейскіх спэцслужбаў… Гэтае імя — Зелімха Яндарбі — накрэсьлена на вокладцы кнігі вершаў «Сэрца майго сьвятыня» ў перакладах Рыгора Барадуліна. Рэцэнзія Валянціна Тараса. **Старонка 10.**

ГУТАРКА

### Чаму жанчыны галасуюць за Лукашэнку?

Пры ўсіх адрозьненьнях між уладаю і апазыцыяй іх яднае аднолькавае стаўленьне да жанчын і жаночае праблематыкі. Гутарка зь філёзафам Альмірай Усманавай. **Старонка 15.**

### Дык падпісвайся!

На любой пошце можна аформіць падпіску на ліпень-сьнежань. Падпісны індэкс газэты «Наша Ніва» 63125. Падпіска для прыватных асобаў будзе каштаваць 4510 рублёў у месяц, для арганізацыяў — 5631 рубель. Падпіска на шапіке «Белсаюздруку» таньнейшая: 3340 рублёў на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень.

# Два сьвяты, два сьветы



Тысячы жыхароў прадмесьцяў сьцякаюцца на Кастрычніцкую плошчу, каб выпіць на праспэкце і плюнуць на геаграфічны цэнтар Рэспублікі Беларусі. Хмель, поп і разгул — карнавал эпохі Лукашэнкі. Старонка 12. Пад шум адовішчаў спрабуюць рэабілітаваць Сталіна. Старонка 11. Як іншы сьвет — фэст Маці Божай Будслаўскай. Старонка 13.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Ампутацыя прыватнікаў

Апэрацыя па выдаленьні з рынку камэрцыйных мэдыцынскіх цэнтраў працягваецца. Рэпартаж Алеся Кудрыцкага.

Перад шкляным будынкам з надпісам «Экамэдсэрвіс», які паўколам раскінуўся на вуліцы Таўстога, завяршаюцца апошнія працы. Будаўнікі прымацоўваюць рэшты фасадных плітаў, кладуць апошнія цагліны ў ходнікі, зьмятаюць пясок. Усё гатова для ўрачыстага адкрыцьця. Яно мусіць адбыцца акурат да дзесяцігодзьдзя мэдыцынскага цэнтру. Калі толькі дзясяты год ня зробіцца апошнім.

Працяг на старонцы 5.

## Сьмерць Купалы: усё ж забойства

Уладзімер Някляеў сабраў факты, што даказваюць: сьмерць Купалы не была самагубствам. Нітачка цягнецца да НКВД і літкрытыка Кучара. Піша Адам Воршыч.

Уладзімер Някляеў агучыў на радыё «Свабода» і апублікаваў у «Народнай волі» сваю вэрсію загадкавай сьмерці Янкі Купалы. На яго думку, гэта было забойства, учынілі яго савецкія спэцслужбы, а штуршком да гэтага стала фатальная памылка. Зь Менску прыйшла інфармацыя, што немцы назвалі адну з вуліц у імя Івана Луцкевіча. Энкавэдысты паблыталі адраджэнца, стваральніка Віленскага беларускага музэю Луцкевіча з паэтам Луцэвічам. Бачачы ў Купалу патэнцыйнага нацыянальнага лідэра, яны вырашылі яго ліквідаваць.

**Віталь Скалабан: Сказаць важкае слова магла б крымінальная справа па факце сьмерці Купалы**

«Наша вайна ня будзе скончана, пакуль не даведаемся, дзе крыж Эўфрасіньні і чаму загінуў Купала».

Працяг на старонцы 8.

50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

ХЛЕБ І ВІДОВІШЧЫ. «Народ, што заваяваў сьвет, цяпер патрабуе аднаго: хлеба і відовішчаў», — сказаў пра сваіх суродзічаў Ювэнал. Менск на дзяржаўныя сьвяты больш нагадвае позьні Рым, чым Савецкі Саюз. У савецкія часы такіх оргій не было. Тады цаніўся «парадак». Цяпер — «веліч», у сэнсе — «размах».

СТАРТ ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ ЛУКАШЭНКІ. Поп-канцэртам Лукашэнка фактычна распачаў сваю выбарчую кампанію. Усё было выдатна зрэжысавана. Добра разагрэты натоўп сустрэў свайго лідэра скандаваньнем «Бе-ла-русь!». Адметна, што не «Лукашэнка», не «СССР». Лукашэнка прамаўляў, урэзваючы ў сьвядомасьць простыя й бясспрэчныя словы. Пра моцную, прыгожую Беларусь, пра гарачыя маладыя сэрцы й сьветлую будучыню. Такі тон зададзены: нацыяналістычная рыторыка, барацьба за галасы моладзі. Трыюмфатар у сьветла-блакітным гарнітуры — у такіх нашыя спартоўцы крочылі на адкрыцьці Алімпіяды — танцаваў пад папсу (**старонка 12**). Рэакцыя на шоў на інтэрнэт-форумах пераважна рэзка адмоўная. Ня ўсе яшчэ, значыць, праніклісь дасягненьнямі перадавое музыкі.

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ. Гулянка 3 ліпеня праходзіць амаль адначасова зь іншым народным фэстам — у Будславе — і моцна кантрастуе зь ім. Там мала п'яных і звышкансэрватыўная традыцыя. Там зьбіраецца ў дзесяць разоў менш народу. Але там прысутныя дух і ідэя. Чаго ня маюць «культурныя канфармісты», як называе іх філёзаф Валер Булгакаў.

3 ліпеня рэанімавала ў мяне адно старое і мо не зусім карэктнае адчуваньне: усё ж наша беларуская культура вышэйшая за гэтую савецкую. Наша эстэтыка больш вытанчаная, правілы паводзінаў больш складаныя, этыка больш ашчадная да чалавека і яго набыткаў. Такое пякучае пачуцьцё эўрапейца — і яно абавязвае моцна. Так, хам дыктуе моду. «Усё схвачана», і хлеба досыць. І поп-канцэрты зьбіраюць сотні тысяч. Але… наша цывілізацыя вышэйшая. Таму яны нас не асымілююць. Мы іх асымілюем.

# Самі з вусамі

Прыхільнікі Статкевіча падтрымалі Мілінкевіча. Што ні кажы, а аксамітны голас Мілінкевіча мае на кабет лёгкае гіпнатычнае ўзьдзеяньне.

2 ліпеня цэнтральны камітэт БСДП (Народная Грамада) вызначыўся з тым, якога кандыдата партыя падтрымае на Кангрэсе дэмакратычных сілаў. Зрэшты, непрызнаная Міністэрствам юстыцыі партыя дала адказ на гэтае пытаньне яшчэ ў лютым, калі вылучыла ў прэзыдэнты свайго лідэра Міколу Статкевіча. Але апошні прысуд Статкевічу — два гады абмежаваньня волі за арганізацыю пратэстаў на выніку рэфэрэндуму-2004 — зрабіў яго ўдзел у прэзыдэнцкай кампаніі немагчымым. Перад БСДП (НГ) і салідарнай зь ёю Эўрапейскай кааліцыяй паўстала пытаньне: каго падтрымаць?

Паседжаньне кіраўніцтва партыі Статкевіч распачаў з набалелага — няпростых дачыненьняў сацыял-дэмакратаў з прыхільнікамі Казуліна. «Як толькі прэзыдэнцкія выбары, дзьве рэчы адбываюцца з партыяй: ствараецца клон і заводзіцца крымінальная справа ў дачыненьні да старшыні», — абураўся кіраўнік БСДП (НГ). — «Але калі людзі ёсьць, партыя будзе. А без паперкі аб рэгістрацыі мы абыдземся — мець гэтую паперку зараз небясьпечна».

Статкевіч заклікаў не вылучаць новага кандыдата ад партыі ці Эўрапейскай кааліцыі, а даверыцца аднаму з палітыкаў, якія ўжо актыўна ўдзельнічаюць у кампаніі. Такім чынам, сацыял-дэмакраты прагаласавалі за тое, каб пацьвердзіць вылучэньне Статкевіча кандыдатам у прэзыдэнты, аднак, з аб'ектыўных прычынаў, адначасова падтрымаць яшчэ аднаго прэтэндэнта. На суд партыйцаў вынесьлі дзьве кандыдатуры — Анатоля Лябедзькі і Алеся Мілінкевіча. «Я зьвяртаю вашую ўвагу на тое, што сёньня тут мы можам вырашыць вынік Кангрэсу», — папярэдзіў Статкевіч. Рэч у тым, што на Кангрэсе прыхільнікаў пераменаў, які мае адбыцца сёлета ўвосень, партыя Статкевіча разам са структурамі Эўрапейскай кааліцыі будзе мець каля 100 галасоў — гэтага цалкам дастаткова, каб схіліць шалі на той ці іншы бок.

Абодва кандыдаты прэзэнтавалі свае праграмы па-беларуску. Анатоль Лябедзька пачаў з таго, што параўнаў сябе з чалавекам, які ўзімку выйшаў у поле: «Калі я спынюся, то проста зьмерзну». Лідэр АГП паабяцаў ісьці наперад, да перамогі. «2006 год — гэта шанец. Для некаторых з нас — можа быць, і апошні», — заявіў ён, перасьцерагаючы ад спакусы ўжо зараз пачаць працаваць над «праектамі-2007-2011». Асаблівы акцэнт Лябедзька зрабіў на патрэбе распачаць кампанію «выбары без Лукашэнкі», мэтай якой будзе патлумачыць людзям, што сам удзел цяперашняга прэзыдэнта ў выбарах процізаконны.

Алесь Мілінкевіч пачаў з таго, што зрабіў камплімэнт прысутным жанчынам, і ім гэта спадабалася. Што ні кажы, а мяккі голас Мілінкевіча мае на кабет лёгкае гіпнатычнае ўзьдзеяньне. Як і Лябедзька, ён практычна нічога не казаў пра сваю асобу і ўсяляк падкрэсьліваў патрэбу ісьці на выбары адзіным фронтам. Абодва кандыдаты аднагалосна заявілі пра тое, што ня вераць у перамогу праз выбары бяз выхаду на вуліцы.

Актывістаў БСДП (НГ), перш за ўсё, цікавіла тое, як найлепш даносіць да людзей пункты праграмы кандыдатаў, асабліва датычна эканомікі. Апрача добра вядомых захадаў па лібэралізацыі гаспадаркі, Анатоль Лябедзька прапанаваў арыгінальную мадэль пераўтварэньня Беларусі ў другую Швайцарыю, у банках якой бізнэсоўцы зь нестабільнай Расеі маглі б захоўваць свае капіталы. Алесь Мілінкевіч выказаў упэўненасьць, што наш асноўны рэсурс — людзі.

У выніку Мілінкевіч набраў 46 галасоў супраць 11 за лідэра АГП. «Для мяне гэта сапраўды вялікі гонар, страшэнная адказнасьць, — падзякаваў за давер Алесь Мілінкевіч. — Калі мы ўсе разам папрацуем, у нас ёсьць добры шанец на перамогу». Такім чынам, Мілінкевіч апынуўся на першым месцы, але Лябедзька наўрад ці мусіць адчуваць сябе пераможаным — і перамогі, і паразы цяпер адны на ўсіх.

**Алесь Кудрыцкі**



## Сівакоў у адстаўцы. Вяртаецца ў войска?

6 ліпеня прэзыдэнт падпісаў указ аб адстаўцы міністра спорту і турызму **Юр'я Сівакова** і прызначыў новага кіраўніка — кіраўніка Фэдэрацыі боксу **Аляксандра Грыгарава**. Кандыдат пэдагагічных навук А.Грыгараў нарадзіўся ў 1948 г. у Баранавічах, скончыў Менскі інстытут фізычнай культуры і Вышэйшую партыйную школу, працаваў настаўнікам у Барысаўскім раёне, намесьнікам старшыні Добраахвотнага таварыства «Ўраджай», у 1987—1996 г. узначальваў рэспубліканскі фізкультурна-спартовы клюб «Спорт». У 1996—2003 г. — намесьнік міністра спорту, пакінуў пасаду пасьля прыходу ў міністэрства Ю.Сівакова. Апошнія два гады быў дарадцам Выканаўчага камітэту СНД.

Што да экс-міністра, то ён «**будзе працаваць па профілі сваёй адукацыі**», цытуе БелТА словы прэзыдэнта. У 1977 г. Ю.Сівакоў скончыў Ваенную акадэмію бранятанкавых войскаў. У 1999—2000 г. Ю.Сівакоў займаў пасаду міністра ўнутраных спраў. Яму закідалі датычнасьць да зьнікненьняў Ю.Захаранкі, А.Красоўскага, В.Ганчара.

PHOTO.BYMEDIA.NET

# Божае кіно



АНДРЭЙ РАСІНСКІ

Чысьценькія ўтульныя дамы з разнымі ліштвамі, каляровыя арнамэнты з імхоў і пункт продажу спадарожнікавых талерак. Такім убачылі Глыбоччыну госьці І Міжнароднага фэстывалю хрысьціянскіх фільмаў «Магніфікат». Рэпартаж **Андрэя Расінскага**.

## Мосарскі цуд

Мосар — гэта вёска, дзе п'юць найменей у Беларусі. Зялёнаму зьмію, пошасьці, што не шкадуе ні сталіцы, ні правінцыі, абвясьціў вайну ксёндз **Юозас Булька (на фота)**. Гэтая вайна ўжо абрасла паданьнямі, пра яе сьведчаць агітацыйныя стэнды, аздобленыя разнаякаснымі самагоннымі апаратамі, здадзенымі жыхарамі.

А яшчэ Мосар завуць Беларускім Вэрсалем. Ксёндз Юозас, калі прыехаў у прыход, пабудаваў пры касьцёле Сьвятой Ганны маленькі вэрсальскі ляндшафт з масткамі, сажалкамі, альтанкамі і лілеямі. Да сьвятой крынічкі вядзе акуратная сьцежка, а стэлы з малюнкамі нагадваюць новазапаветную гісторыю — пакуты Хрыстовы, уваскрэсеньне, каранаваньне Маці Божай.

**Працяг на старонцы 9.**

IN MEMORIAM

## Яўген Ціхановіч



Пайшоў з жыцьця найстарэйшы мастак Беларусі — Яўген Ціхановіч. Ён пражыў доўгае жыцьцё — 94 гады і быў апошнім прадстаўніком мастакоўскае дынастыі Ціхановічаў, перажыўшы сына Генрыха і ўнука Яна. Ягоны старэйшы брат — славуты графік Валянцін Ціхановіч.

Ціхановічу выпала вучыцца ў мурах славутага Віцебскага мастацкага тэхнікуму, настаўнікамі і калегамі былі клясыкі эўрапейскага мастацтва. Нехта стаў ахвярай сталіншчыны, як ягоны цесьць — Уладзіслаў Галубок. Іншыя палеглі ў вайну. Шмат каго нялітасьцівы лёс раскідаў па сьвеце.

Яўген Ціхановіч браў удзел у мастацкіх выставах ажно ад 1932 г. За гэты час ім створаныя дзясяткі жывапісных палотнаў, сотні графічных работаў, ілюстрацыяў і экслібрысаў. Я.Ціхановіч быў і выдатным мэмуарыстам. Ён быў знаёмы з усёй палітычнай і культурнай элітаю Беларусі савецкай і часоў нямецкае акупацыі. Да канца дзён сваіх быў адданым беларускім патрыётам і працавітым творцам.

Вечная памяць.

**СХ**

# Форум мозгазнаўцаў

Крэмль у беларускім пытаньні зьвяртаецца па дапамогу да тых паліттэхнолягаў, якія ўжо паказалі свой палітычны дальтанізм ва Ўкраіне. І запрашае да «размовы» толькі тых беларускіх палітыкаў, каго не разглядае ў якасьці сур'ёзных кандыдатаў на выбарах 2006 году. Піша **Раман Якаўлеўскі**.



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

Адначасова зь менскім Зьездам славян сьвету ў Маскве адбыўся міжнародны форум «Эўропа: вынікі году перамен», дзе агучваліся ідэі Ўсходне-Эўрапейскага саюзу. У ім бралі ўдзел Паўлоўскі, Ніканаў, Караганаў, Цыпко, Затулін. Гэтыя прозьвішчы добра знаёмыя беларускім тэлегледачам, якіх цікавіць тое, што пра Беларусь думаюць у элітарнай Маскве. Гэтыя тлумачальнікі ўсяго і ўсіх вядомыя таксама сваім суўдзелам ва ўкраінскай рэвалюцыі на баку «сініх», Януковіча. Дарэчы на блатным жаргоне «сінімі» называюць татуяваных крымінальнікаў.

Накаўтаваныя «аранжавымі», маскоўскія мозгазнаўцы пэўны час ачомваліся, і вось цяпер да іх ізноў зьвярнуўся Крэмль, які не разумее, што ўсё-такі адбываецца на постсавецкай прасторы, дзе Расея церпіць адну паразу за другой? Улада спалохалася каляровых рэвалюцый. Тэма гэтая пачала публічна абмяркоўвацца. І ня столькі ў пляне магчымасьці ажыцьцяўленьня каляровай рэвалюцыі ў той ці іншай краіне, колькі ў пляне яе папярэджаньня. І як бы ні казалі ў Маскве пра стабільную Беларусь, ад таго, што адбываецца на постсавецкай прасторы, ніхто не застрахаваны.

Паводле слоў некаторых удзельнікаў «Расейскага гуманітарнага Давосу», як вырашылі сябе абазваць тыя, хто сабраўся на маскоўскім форуме, сам тэрмін «рэвалюцыя» ў дачыненьні да тых палітычных працэсаў, якія мелі месца ў Грузіі, Украіне і Кыргызстане, на пленарных паседжаньнях і ў межах круглых сталоў форуму быў аднагалосна адкінуты з прычыны поўнай яго неадпаведнасьці маштабу падзей. Нідзе дзяржаўны лад скінуты ня быў, дзеяньне Канстытуцый фармальна захоўвалася. Так што гаварыць можна толькі пра варыянты дзяржаўных пераваротаў (Кыргызстан), рэвалюцыянізаваныя спосабы адстойваньня вынікаў высокатэхналягічных выбараў (Украіна)… і, як вынік, адбіраньне ўлады ў кіроўнай эліты. А любыя праявы грамадзянскай актыўнасьці трэба расцэньваць як антыдзяржаўную дзейнасьць.

Калі стала вядома, што сярод запрошаных на гэты форум значыцца і кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта Беларусі Віктар Шэйман, падумалася, што Паўлоўскі &Co задумалі правесьці нейкі КВК. Цяжка прыгадаць, каб такая сур'ёзная фігура беларускай улады, якой лічыцца Шэйман, наважылася ўшанаваць сваёй прысутнасьцю такую маскоўскую тусьню. Аднак пазьней стала вядома, што запрашалі на «расейскі Давос» і кіраўніка крамлёўскай адміністрацыі Дзьмітрыя Мядзьведзева. Праўда, падзякаваўшы за запрашэньне, ён спаслаўся на моцную занятасьць (праводзіў з ЦВК сэмінар чыноўнікаў па правільным правядзеньні выбараў) і даслаў свайго намесьніка Ўладзіслава Суркова. А гэты кадар вядомы як лялькавод партбудаўніцтва, СМІ і «смотрящий» за ўнутранымі працэсамі ў краінах СНД.

Кіраўнік адміністрацыі беларускага прэзыдэнта вырашыў гэты «Давос» праігнараваць, і беларускія ўлады прадстаўляў дэпутат ніжняй палаты парлямэнту Сяргей Гайдукевіч. А апазыцыю — экс-прэзыдэнт Нацыянальнай акадэміі навук акадэмік і экс-сьпікер Савету Рэспублікі Вайтовіч, рэктар выгнанага зь Беларусі Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту акадэмік Анатоль Міхайлаў, а таксама экс-рэктар БДУ Аляксандар Казулін. Запрошаны быў і кіраўнік незарэгістраванай «Рады беларускай інтэлігенцыі» Ўладзімер Колас. Што да штатных менскіх мозгазнаўцаў, то на форуме іх не назіралася. Хіба што палітоляг Андрэй Суздальцаў, дыягназы і аналізы якога ў сфэры расейска-палітычных адносінаў часьцяком друкуюць апазыцыйныя беларускія газэты.

Менавіта Суздальцаў разам з Паўлоўскім узначалілі нейкую экспэртную групу, створаную на форуме па прапанове акадэміка Вайтовіча. Кажуць, гэтае рашэньне, прынятае пры відавочным патураньні Крамля, выклікала нэгатыўную рэакцыю ў адміністрацыі прэзыдэнта Беларусі.

Сярод менскіх мозгазнаўцаў дамінуе думка, што мерапрыемства «контрарэвалюцыянэра» Паўлоўскага, які адзначыў 10-годзьдзе сваёй «канторы» — Фонду эфэктыўнай палітыкі (ФЭП), мела выключна маніпуляцыйны характар. З аднаго боку, Захаду дэманстравалася гатоўнасьць Расеі размаўляць з рознымі палітычнымі сіламі ў Беларусі; з другога боку, Аляксандру Лукашэнку давалася зразумець, што запрашаюцца да «размовы» толькі тыя беларускія палітыкі, каго Расея не разглядае ў якасьці сур'ёзных самастойных кандыдатаў на выбарах 2006 году. Тым ня менш, як уяўляецца, на маскоўскім форуме мозгазнаўцаў гучалі ўсё-такі і вельмі цікавыя меркаваньні. Напрыклад: «Ніякія ЗША, Расея альбо Кітай ніколі не змаглі б і ня змогуць разгайдаць палітычную сытуацыю ў гэтых краінах у тых жа маштабах, як яе разгойдваюць мясцовыя палітычныя рэжымы, што выхваляюцца праслаўтай стабільнасьцю і псэўдадабрабытам». Адзін з удзельнікаў форуму — зьбеглы экс-прэзыдэнт Аскар Акаеў — не пагадзіўся з такім сьцьверджаньнем, што цалкам зразумела…

У кулюарах форуму можна было пачуць і такое: «Усе працэсы, якія адбываюцца на постсавецкай прасторы — найперш, ва Ўкраіне, у Грузіі, — зьяўляюцца натуральнымі працэсамі. А вось тыя, хто спрабуе стрымліваць разьвіцьцё гэтых краін па дэмакратычным шляху, спрабуюць зьдзейсьніць контрарэвалюцыю. Рэжым, які існуе ў Беларусі, не адпавядае ні часу наагул, ні таму, што трэба самім беларусам. І не павінна быць аніякіх сумненьняў, што гэткі рэжым мае вельмі кароткае жыцьцё».

**Беларускія ўлады** на маскоўскім форуме прадстаўляў Сяргей Гайдукевіч. А **апазыцыю** — акадэмікі Аляксандар Вайтовіч і Анатоль Міхайлаў, экс-рэктар БДУ Аляксандар Казулін і кіраўнік Рады беларускай інтэлігенцыі Ўладзімер Колас. **З штатных менскіх мозгазнаўцаў** прысутнічаў Андрэй Суздальцаў. Менавіта Суздальцаў разам з Паўлоўскім узначалілі экспэртную групу па Беларусі.

# Быкаў
## не для продажу

Выйшлі першыя тры тамы з поўнага збору твораў Васіля Быкава. Маштабны праект рэалізуе грамадзкая ініцыятыва «Воля народу» пры ўдзеле Саюзу беларускіх пісьменьнікаў.

Каардынатар праекту, старшыня СБП Алесь Пашкевіч называе гэты праект агульнагрaмадзкім. Задума выдаць поўны збор твораў пісьменьніка была агучана два гады таму, калі адбылося першае пасяджэньнне па ўшанаваньні памяці пісьменьніка. «Васіль так хацеў убачыць свой збор твораў, але ён выйшаў запозна. Хоць кажуць, што лепей так, чым ніколі», — гаворыць Ірына Быкава, якая ўвайшла ў рэдакцыйную калегію. Выданьне рыхтавалася па плянах-праспэктах, якія пасьпеў падрыхтаваць аўтар. «Гэта неакадэмічны збор, бо творы зьмяшчаюцца не ў храналягічным парадку. У першым томе апублікаваны апошнія па часе напісаньня творы — аповесьці «Аўганец» і «Ваўчыная яма», апавяданьні і прыпавесьці. Менавіта першы том уразіў старшыню СБП болей за ўсё. «Падчас працы над ім я зразумеў, што Васіль Быкаў ня толькі пісьменьнік XX ст., яго можна лічыць мастаком XXI ст. У прыпавесьцях ён алегарычна асэнсоўвае сучаснасьць, мадэлюе будучыню», — зазначае А.Пашкевіч.

Плянуецца, што ўсяго будзе 14 тамоў. У апошні будуць уключаны ўсе тэксты, якія адшукаюцца падчас працы над выданьнем, а таксама дыхтоўны фотаальбом на крэйдаванай паперы. «Ужо знайшліся некаторыя запісы Васіля, нясконачаныя творы і задумы», — кажа Ірына Быкава.

Кіраўніком праекту выступае Аляксандар Казулін. Па яго задуме, збор твораў Быкава будзе некамэрцыйным выданьнем. Увесь наклад у 3000 асобнікаў пойдзе ў бібліятэкі і на падарункі.

**Сяргей Будкін**

# У прэзыдэнцкім гаражы зьявіліся БТРы?

У мінулую пятніцу кар. «НН», праходзячы па вул. Чырвонаармейскай у Менску, нямала зьдзівіўся — па накірунку ад прэзыдэнцкага гаражу ехалі два БТРы. Нямала зьдзівіўся такому і кіраўнік прэс-службы прэзыдэнта Мікалай Лёгкі, у якога мы запыталіся, што могуць рабіць БТРы ў мірны час у цэнтры гораду: «Я не магу пацьвердзіць гэты факт, сам ня бачыў і ня схільны такім плёткам давяраць». Сп.Лёгкі іранізуе: «Вы шукаеце чорную котку ў цёмным пакоі, якой, да таго, у ім няма. Калі б мне сказалі, што ў палескіх балотах упаў тунгускі мэтэарыт, я б такой чутцы ня даў веры. Тое самае і тут. БТРаў у прэзыдэнцкім гаражы дакладна няма, значыць, і выяжджаць адтуль яны не маглі».

Выходзіць, што кар. «НН» злавіў галюцынацыю...

**Мікола Бугай**

## СЬЦІСЛА

### Скрабец адрокся абаронцы

Палітвязень Сяргей Скрабец адрокся паслуг адваката М.Хоміча. Жонка экс-дэпутата палаты прадстаўнікоў тлумачыць, што гэта зьвязана з матэрыяльнымі цяжкасьцямі, якія спазналі родныя палітыка.

### Грошы на этэр

У бюджэт ЗША на ажыцьцяўленьне замежнапалітычнай дзейнасьці ў 2006—2007 г. закладзена $10 млн для «павелічэньня вяшчаньня на Беларусь». Законапраект вынесены на разгляд Палаты прадстаўнікоў Кангрэсу ЗША.

### Каб не пілі

У палату прадстаўнікоў паступіў законапраект, які прадугледжвае крымінальную адказнасьць — пазбаўленьне права займаць пэўныя пасады з выплатай штрафу, альбо прымусовыя працы на тэрмін да двух гадоў ці арышт на паўгоду — за кіраваньне транспартным сродкам у стане ап'яненьня. Адказнасьць наступіць у тым выпадку, калі парушэньне ўчынена цягам году пасьля накладаньня адміністрацыйнага спагнаньня за гэтыя ж дзеяньні. Будзе больш жорсткім і адміністрацыйнае пакараньне за кіраваньне аўтамабілем у нецьвярозым стане — штраф ад 15 да 35 базавых велічынь з пазбаўленьнем правоў на тры гады альбо адміністрацыйны арышт з пазбаўленьнем правоў.

### Эх, дарогі!

Толькі 50% працягласьці дарог у Беларусі адпавядаюць нормам, — канстатуюць у дэпартамэнце «Белаўтадор». Не забясьпечана патрабаваная роўнасьць на 5,5 тыс. км дарог, 7650 км маюць недастатковую трываласьць «дарожнага адзеньня».

### Лёндан-2012

Летнія алімпійскія гульні 2012 году пройдуць у Лёндане. Так пастанавілі чальцы МАК на пасяджэньні 6 ліпеня ў Сынгапуры. Супернікам брытанскай сталіцы быў Парыж, якому не дапамагло ні тэатралізаванае спартовае шоў месяц таму на Елісейскіх палях, ні прэзэнтацыйны ролік сусьветнавядомага Люка Бэсона. Масква выбыла ў першым туры адбору.

**АГ; belta.by, svaboda.org**

# Супадзеньне ў часе,
## або Сьвята на чужой вуліцы




**Прысутнасьць на прэс-канфэрэнцыі пасла Вялікабрытаніі Браяна Бэнэта і паслоў іншых дзяржаў Эўразьвязу — суседзяў Беларусі не выглядала звычайным супадзеньнем, а тым больш фармальнасьцю. Справа — Януш Анышкевіч, у цэнтры — амбасадар Яе вялікасьці Браян Бэнэт.**

Расейская дыпляматыя імкнецца перашкодзіць інтэграцыі новых краінаў Усходняй Эўропы з Эўропай Заходняй. Аднак ня ўсе на Захадзе адракліся Беларусі, піша **Віталь Тарас**. 1 ліпеня беларускую сталіцу наведала дэлегацыя Эўрапарлямэнту на чале зь віцэ-сьпікерам Янушам Анышкевічам.

1 ліпеня Менск наведала дэпутацыя Эўрапарлямэнту — старшыня фракцыі «Саюз лібэралаў і дэмакратаў дзеля Эўропы» Грэхэм Уотсан і сябар гэтай фракцыі, віцэ-старшыня Эўрапарлямэнту Януш Анышкевіч. Акрамя сустрэчы зь лідэрамі партый, што ўваходзяць у «Пяцёрку+», Анышкевіч прысутнічаў на падвядзеньні вынікаў конкурсу «Што я ведаю пра Эўропу?», арганізаванага Беларускім таварыствам імя Робэрта Шумана. Фактычна гэтым праграма бліц-візыту эўрапарлямэнтароў была вычарпаная. І наўрад ці ўвага да яго з боку журналістаў была б колькі-небудзь значнай, калі б ня шэраг акалічнасьцяў.

Па-першае, з 1 ліпеня старшынства ў Эўразьвязе на паўгоду перайшло да Вялікабрытаніі. Праўда, Г.Уотсан прадстаўляе ня партыю кансэрватараў, а іх колішніх палітычных спаборнікаў — нашчадкаў «вігаў». І сам ён падчас прэс-канфэрэнцыі, якая праходзіла ў брытанскім пасольстве, запэўніваў, што візыт проста выпадкова супаў у часе з брытанскім старшынствам. Тым ня менш, прысутнасьць на прэс-канфэрэнцыі пасла Вялікабрытаніі Браяна Бэнэта і паслоў іншых дзяржаў ЭЗ — суседзяў Беларусі не выглядала звычайным супадзеньнем, а тым больш фармальнасьцю.

Па-другое, прэс-канфэрэнцыя была зладжана Беларускай асацыяцыяй журналістаў. І гэты факт назваць выпадковым таксама нельга. Менавіта фракцыя лібэралаў выступіла ініцыятарам уганараваньня БАЖ сахараўскай прэміяй Эўрапарлямэнту за 2004 год. Гаворка тут не пра абмен дыпляматычнымі рэвэрансамі ці звычайную ветлівасьць. Анышкевіч — колішні прэс-сакратар, сябра кіраўніцтва польскага руху «Салідарнасьць», удзельнік круглага стала, што прывёў да дэмакратычных зьменаў у Польшчы, — бадай, як ніхто іншы разумее ключавую ролю незалежных масмэдыя ў дэмакратычных пераўтварэньнях. Сучасную беларускую сытуацыю палітык ведае не з чужых слоў — ён шмат разоў наведваў Беларусь, рэгулярна сустракаўся з палітыкамі й грамадзкімі дзеячамі. У сувязі з падрыхтоўкай Польшчы да восеньскіх прэзыдэнцкіх і парлямэнцкіх выбараў адзін зь лідэраў правых сіл Анышкевіч, як можна было пераканацца, не выпускае сытуацыю ў Беларусі з-пад кантролю й не зьбіраецца зьбаўляць палітычнай актыўнасьці ў гэтым кірунку.

У адрозьненьне ад свайго старэйшага калегі Г.Уотсан — знаўца эўрапейскай грашова-эканамічнай палітыкі — Беларусь наведаў упершыню. Ён уваходзіў у камісію па прамысловай палітыцы, камітэт па бюджэце, а таксама выконваў абавязкі старшыні камісіі Эўрапарлямэнту па свабодах і правах грамадзян. Тым ня менш, менавіта брытанскі дэпутат, зацікаўленьні якога, на першы погляд, далёкія ад беларускіх палітычных праблем, падкрэсьліў прынцыпова важны момант. Паводле ягоных слоў, цяпер некаторыя сілы ў Эўропе — і левыя й правыя — імкнуцца выкарыстаць крызіс Эўразьвязу, каб пакласьці канец далейшаму яго пашырэньню. Аднак эўрапейскія лібэралы, працягвае брытанскі дэпутат, выступаюць за няўхільнае спрыяньне развіццю дэмакратыі ў суседніх з Эўразьвязам краінах — у тым ліку ў Беларусі. А ў пэрспэктыве — за далучэньне іх да сям'і дэмакрытычных эўрапейскіх дзяржаў.

Адзін з пунктаў палітычнай платформы Саюзу лібэралаў і дэмакратаў гучыць так: «…гарантаваньне ўсім эўрапейскім грамадзянам асноўных правоў да ліквідацыя ўсялякіх формаў дыскрымінацыі, зьвязаных з тым, што Эўропа зьяўляецца зьвязам меншасьцяў… Бясьпечная ды справядлівая Эўропа для ўсіх — гэта адназначна Эўропа, якая дае аднолькавыя правы ўсім тым, хто шукае ў ёй прытулку ці новага жыцьця». Цікава, што беларускія журналісты змаглі атрымаць перад прэс-канфэрэнцыяй інфармацыйныя матэрыялы як на ангельскай, так і клясычным беларускім правапісам.

Між іншым, свой выступ Грэм Уотсан пачаў з прабачэньняў за тое, што ён не гаворыць па-беларуску, паабяцаўшы, што, калі Беларусь стане сябрам Эўразьвязу, дэпутаты ягонай фракцыі ў Эўрапарлямэнце ў абавязковым парадку вывучаць беларускую мову.

Зразумела, залішняга аптымізму ў выступах дэпутатаў Эўрапарлямэнту што да пэрспэктыў беларускай дэмакратыі й адносінаў Беларусі з Эўразьвязам не было. Нават у такім пытаньні, як адкрыцьцё прадстаўніцтва ЭЗ у Менску, дагэтуль няма яснасьці, заўважыў пасол Бэнэт, адказваючы на адно з пытаньняў журналістаў.

Зразумела, што найбліжэйшыя паўгоду намаганьні краін Эўразьвязу будуць засяроджаны ў асноўным на вырашэньні ўнутраных праблем, спробах выйсьці з таго крызісу, які засьведчылі адмоўныя вынікі рэфэрэндумаў па эўрапейскай канстытуцыі. А тут яшчэ паміж Вялікабрытаніяй ды іншымі магутнымі дзяржавамі — такімі, як Нямеччына й Францыя, — узьнікла разыходжаньні ў сфэры поглядаў на эканамічную палітыку Зьвязу (найперш, адносна эўрапейскіх сельскагаспадарчых субсыдый).

І тым ня менш, многія эўрапейскія палітыкі разумеюць, што пытаньне замежнай бясьпекі Эўразьвязу, незалежна ад таго, будзе ён пашыраецца хуткімі тэмпамі ці не, у значнай ступені залежыць сёньня ад сытуацыі на ўсходзе Эўропы. Паводзіны Расеі не пакідаюць іншай альтэрнатывы. Масква ад дэклярацый на тэму вяртаньня сваёй былой велічы на эўрапейскай мапе і зьняважлівых выказваньняў на адрас суседніх эўрапейскіх краін пераходзіць да адпаведных дзеяньняў. Адкліканьне подпісаў пад дамовай аб дзяржаўнай мяжы з Эстоніяй — прыклад гэткай новай «дыпляматыі». Гэтая дыпляматыя, выглядае, будуецца на тым, каб калі не перашкодзіць інтэграцыі новых эўрапейскіх дзяржаў з Заходняй Эўропай, дык стварыць ім, а таксама Эўропе ў цэлым максымум нязручнасьцяў і праблем. Успамінаецца стары жарт на гэтую тэму: «Ня зьем, дык пакусаю».

Яшчэ адзін прыклад новых падыходаў Крамля да адносін з Эўропай — сьвяткаваньне 750-годзьдзя Калінінграду. Само словазлучэньне гучыць настолькі недарэчна, што нават расейскія камэнтатары паставіліся да яго з пэўнай іроніяй. Ім давялося згадваць нямецкую назву гораду Кёнігсбэрг ды яго славутага жыхара Імануіла Канта.

Адкрытая, нават дэманстратыўная непавага да гісторыі іншых краін, гістарычнага мінулага ўвогуле — адна з прымет новай замежнай палітыкі Крамля. Згадка эстонскімі парлямэнтарамі пры ратыфікацыі дамовы аб мяжы з Расеяй Тартускага дагавору 1920 году, а таксама факту анэксіі Эстоніі Савецкім Саюзам у 1940-м выклікала абурэньне Масквы. Ад непавагі да мінулага — адзін крок да сучаснага палітычнага хамства. Яно вылілася, у прыватнасьці, у тое, што на сустрэчу з прэзыдэнтам Пуціным у Калінінград не былі запрошаны ні прэзыдэнт Літвы Адамкус, ні прэзыдэнт Польшчы Квасьнеўскі. Абедзьве краіны, як вядома, маюць свой погляд на гісторыю ды прыналежнасьць Калінінграду. Ніхто ня быў, праўда, запрошаны туды і ад Беларусі.

Затое прыезд у Калінінград прэзыдэнта Францыі Шырака й канцлера ФРГ Шродэра павінны быў прадэманстраваць Эўропе й сьвету новую геапалітычную ролю Крамля. Пуцін паабяцаў Нямеччыне пастаяннае месца ў Радзе Бясьпекі ААН, тым самым нагадаўшы яшчэ раз і пра перамогу СССР у Другой сусьветнай вайне, вынікам якой стаў яго ўдзел у заснаваньні ААН. Праўда, у цяперашні момант невядома, якую ролю будзе адыгрываць Рада Бясьпекі ААН і ці захавае ўвогуле свае ролю гэтая арганізацыя, якая ўсё больш дэманструе сваю груваскасьць і неэфэктыўнасьць у сучасных умовах.

Урачыстасьць моманту падчас сустрэчы «трыюмвірату» ў Калінінградзе азмрочвалі некаторыя палітычныя рэаліі. Правал рэфэрэндуму па эўрапейскай канстытуцыі у Францыі, ініцыяванага асабіста Шыракам, уласна, каталізаваў цяперашнія крызісныя працэсы ў Эўразьвязе, за што нясе значную долю адказнасьці французскі прэзыдэнт. А «вотум недавеpу», якога дамагаецца канцлер ФРГ з мэтай датэрміновых парлямэнцкіх выбараў таксама не дадае яму цяпер палітычнай вагі на эўрапейскай арэне. Тым ня менш, замежнапалітычныя рухі Крамля ясна паказваюць, што ён так і не пазбавіўся ад свайго імпэрскага комплексу і не зьбіраецца лічыцца з інтарэсамі малых краін і народаў, калі толькі яго да гэтага не прымусіць скаардынаваная, пасьлядоўная палітыка эўрапейскіх дзяржаў, Эўразьвязу ў цэлым.

Тым часам Менск застаецца адлучаным і ад эўрапейскіх працэсаў, і ад расейскіх сьвятаў. Юбілей Калінінграду стаў для беларускага кіраўніцтва сьвятам на чужой вуліцы. Кампэнсаваць гэты прыкры факт павінна было, відаць, зладжанае ў Менску грандыёзнае шоў з ілюмінацыяй, салютам, канцэртамі да дзьвюх гадзін ночы з нагоды Дня Рэспублікі… Праўда, пасьпешлівасьць падвяла арганізатараў. Новыя шыльды на праспэкце Скарыны з надпісам «Праспект Незалежнасці», тэрмінова разьвешаныя напярэдадні 3 ліпеня, атрымаліся бел-чырвона-белыя: чырвоныя літары на белым фоне. Гэта, кажуць, вельмі не спадабалася высокаму начальству, і таму шыльды неўзабаве будуць мяняць ізноў.

Ну што ж, за незалежнасьць трэба плаціць.

# Ампутацыя прыватнікаў

Працяг са старонкі 1.

Натальля Крамнёва, якая адказвае за сувязі «Экамэдсэрвісу» з грамадзкасьцю, заходзіць праз галоўныя дзьверы ў хол, пакрыты мармурам крэмавага колеру, і бярэ ў адміністратуры, якая, хутчэй, нагадвае рэцэпцыю ў гатэлі, ключы ад аднаго з кабінэтаў. «У старым будынку «Экамэдсэрвісу» цеснавата — там усяго 12 пакояў, а тут — больш за 5 тысячаў квадратных мэтраў плошчы», — кажа яна. Як на беларускія меркі, будынак шыкоўны. Таму можна лёгка ўявіць, якую рэакцыю выклікала рашэньне Міністэрства аховы здароўя ануляваць ліцэнзію «Экамэдсэрвісу» ў яго супрацоўнікаў і ўладальнікаў (сузаснавальнікі гэтага амэрыканска-беларускага прадпрыемства — прыватныя асобы).

«Нашае кіраўніцтва дагэтуль схільнае разглядаць тое, што адбываецца, як непаразуменьне», — кажа Натальля Крамнёва. Вышэйшы гаспадарчы суд, які разглядае скаргу «Экамэдсэрвісу» на дзеяньні Міністэрства аховы здароўя, часова прыпыніў дзеяньне рашэньня аб пазбаўленьні ліцэнзіі, таму цэнтар працуе ў ранейшым рэжыме. Натальля Крамнёва распавяла, у чым заключалася «грубае парушэньне», за якое зьбіраюцца зачыніць «Экамэдсэрвіс»: «Наш кардыёляг — гэта чалавек, які быў загадчыкам кардыялягічнага аддзяленьня дзяржаўнай клінікі, мае 20 гадоў стажу ў кардыялёгіі, кандыдат мэдыцынскіх навук. Яна мае вышэйшую катэгорыю па тэрапіі і першую катэгорыю па кардыялёгіі. На наш погляд, гэта не супярэчыць палажэньню аб ліцэнзаваньні, але Міністэрства аховы здароўя патрабуе, каб была выключна вышэйшая катэгорыя. Падобная сытуацыя і з нашым псыхатэрапэўтам».

Цяпер у краіне дзейнічае **3 183 арганізацыі**, якія маюць ліцэнзію на мэдыцынскую дзейнасьць. Па выніках сёлетніх праверак былі **ануляваныя 23 ліцэнзіі — 0,7%** ад агульнага ліку. У колькасным выражэньні — лёгкая карэкціроўка рынку, а ў якасным — амаль зачыстка: права лячыць людзей пазбавіліся такія гіганты, як **«Экамэдсэрвіс», «Нардын» і «Сучасная мікрахірургія вока».**

Зачыняць цэнтар, які дае працу дзьвюм сотням мэдыкаў, і да якога, як да паліклінікі, замацаваныя 15 тысячаў чалавек толькі з-за таго, што два дактары маюць не вышэйшую, а першую катэгорыю? Выглядае на звычайную прыдзірку. Праўда, закон не пакідае іншай магчымасьці — калі ў штаце прыватнага мэдцэнтру адзін і больш супрацоўнікаў маюць «неадпаведную» кваліфікацыю, санкцыя адна: пазбаўленьне ліцэнзіі.

Цяпер у краіне дзейнічае 3 183 арганізацыі, якія маюць ліцэнзію на мэдыцынскую дзейнасьць. Па выніках сёлетніх праверак былі ануляваныя 23 ліцэнзіі — 0,7% ад агульнага ліку. У колькасным выражэньні — лёгкая карэкціроўка рынку, а ў якасным — амаль зачыстка: права лячыць людзей пазбавіліся такія гіганты, як «Экамэдсэрвіс», «Нардын» і «Сучасная мікрахірургія вока».

Новы закон «Аб ахове здароўя», які паступіў на абмеркаваньне ў палату прадстаўнікоў, канчаткова зьнішчыць платныя кабінэты ў дзяржаўных паліклініках. Замест іх будзе створаная падвойная сыстэма мэдыцынскага абслугоўваньня: дармавыя паслугі ў дзяржаўных паліклініках і шпіталях, платныя — у новых дзяржаўных мэдцэнтрах. Ці не спрабуе дзяржава пазбавіцца ад непатрэбных канкурэнтаў, ладзячы маштабныя праверкі прыватных мэдцэнтраў?

На думку Натальлі Крамнёвай, дзяржава мусіла б стварыць роўныя ўмовы для ўсіх удзельнікаў рынку — прыватнікі зьнялі б зь дзяржавы патрэбу абслугоўваць кліентаў, якія могуць за сябе заплаціць, а зэканомленыя такім чынам бюджэтныя грошы можна было б накіраваць на патрэбы бедных пацыентаў.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Але дзяржава ў нас цяпер таксама думае, як бізнэсовец, і з радасьцю возьме на сябе «цяжар» абслугоўваньня багацеяў. Што з таго, што «Экамэдсэрвіс» сплочвае штогод каля паўмільёна даляраў падаткаў, калі дзяржава можа атрымліваць увесь ягоны прыбытак, стварыўшы ўласны платны цэнтар на замену зачыненаму прыватнаму?

Ліквідацыя прыватнікаў не пагражае рынку дэстабілізацыяй: недзяржаўныя мэдыцынскія цэнтры займаюць ня больш за 10% рынку мэдыцынскіх паслуг. Але непакоіць тое, што стварэньне дзяржаўнай платнай мэдыцыны можа зрабіць долю платных паслуг значна большай за тыя 10%. Пры гэтым дзяржава пераходзіць да стварэньня сыстэмы платнай мэдыцыны пры недаразьвітай сыстэме страхаваньня. Жыхары заходніх краінаў скардзяцца на тое, што мусяць плаціць высокія страхавыя ўнёскі, але ім і ў найгоршым сьне не прымроіцца, каб давялося плаціць за лекаваньне самім, без аніякіх страховак. У нас ідзе менавіта да гэтага. У найгоршым выпадку ў Беларусі можа скласьціся сыстэма, пры якой эфэктыўна лячыцца змогуць толькі тыя, хто будуць мець грошы, а ўсе астатнія будуць вымушаныя спадзявацца на дактароў у бясплатных мэдустановах. І наўрад ці ўзровень абслугоўваньня ў іх будзе такі самы, як і ў платных дзяржаўных мэдыцынскіх цэнтрах.

**Алесь Кудрыцкі**

КАМЭНТАР

## Доктар Андрэй Вітушка: «Мэдыкам далі сыгнал»

*Лідэр незарэгістраванай Асацыяцыі беларускіх мэдыкаў камэнтуе падзеі вакол закрыцьця прыватных мэдыцынскіх цэнтраў.*

Калі кіраваца лёгікай інспэктараў, можна сьмела ліквідаваць многія дзяржаўныя ўстановы аховы здароўя. Напрыклад, толькі Менску бракуе каля 400 лекараў пераважна ў паліклінічным зьвяне.

Большасьць мэдыкаў зьвязваюць эпапэю з мэдычнымі цэнтрамі з стварэньнем міністэрствам аховы здароўя ўнітарных прадпрыемстваў, якія будуць аказваць платныя мэдычныя паслугі па-за межамі дзяржаўных паліклінік. Грамадзтву далі сыгнал: прыватныя мэдычныя цэнтры ненадзейныя і дарагія, лепш зь імі ня зьвязвацца.

Яшчэ адзін выразны знак адрасаваны кваліфікаваным лекарам, якія імкнуцца сумяшчаюць працу ў дзяржаўнай лячэбнай установе з падпрацоўкай у прыватнай. Маўляў, хочаце падпрацоўваць — калі ласка, але – на дзяржаву ў межах згаданых унітарных прадпрыемстваў.

Але Міністэрства аховы здароўя традыцыйна эканоміць на заробках лекараў. Ужо было, калі платныя паслугі ўводзілі ў дзяржаўных установах аховы здароўя. Экспэрымэнт скончыўся тым, што нічым ад бясплатных паслугі не адрозьніваліся, а лекары ад «платнікаў» атрымлівалі адно толькі дадатковую працу за нязьменны заробак.

Што да разнастайнасьці відаў паслуг, то тут першымі пацерпяць праграмы комплекснай ацэнкі, адсочваньня і карэкцыі стану здароўя, такія, як «Асабісты лекар вашага дзіцяці» ці «Асабісты тэрапэўт», папулярныя ў сучасных буйных мэдычных цэнтрах.

Дый бараніцца пацыенту ад несумленных лекараў стане шматкроць цяжэй. У 2004-м у ГА «Абарона спажыўца» паступіла больш за 30 скаргаў на дзейнасьць установаў прыватнай мэдыцыны. Толькі 10 зь іх дайшлі да суду, астатнія ж былі залагоджаны у дасудовым парадку з выплатай пацярпелым сум нашмат большых за тыя, якія выплачваюцца па суду. Зьвязана гэта з тым, што судовы канфлікт з пацыентам непазьбежна цягне за сабой разнастайныя праверкі органаў кантролю, а значыць і амаль непазьбежныя страты. У выпадку ж зь дзяржаўнымі камэрцыйнымі паліклінікамі імавернасьць дасудовага вырашэньня справы мінімальная.

ГАСПАДАРКА СЬЦІСЛА

### «Інтэграл» вядзе перамовы

НПА «Інтэграл» распачаў перамовы пра пастаўкі тэхналягічнага абсталяваньня зь нямецкай фірмай «Sander». Яно патрэбна для рэалізацыі праекту «Субмікрон» па вытворчасьці інтэгральных мікрасхем. Каштаваць праект будзе $21 млн, зь якіх $10,5 млн інвэстуе «Інтэграл». Мікрасхемы пойдуць на патрэбы беларускіх і замежных вытворцаў тэлевізараў ды іншай электроннай апаратуры.

### У першай тысячы

Брытанскі часопіс «The Banker» згадаў два беларускіх банкі ў сьпісе тысячы найбольш уплывовых банкаў сьвету. «Белаграпрамбанк» заняў у рэйтынгу «The Banker» 678 месца, а «Беларусбанк» — 938-е. У параўнаньні зь мінулым годам «Белаграпрамбанк» узьляцеў на 107 пунктаў, а «Беларусбанк» апусьціўся на 22.

### «Белая Русь» банкрутуе

Гаспадарчы суд Менску распачаў справу пра банкруцтва дзяржаўнай фірмы «Белая Русь». Пасьля арышту Галіны Жураўковай прадпрыемства ўзялі ў аблогу крэдыторы. Суд прызначыў «ахоўны пэрыяд» тэрмінам на адзін месяц, на працягу якога «Белая Русь» можа не выплачваць пазык. Канчатковае рашэньне пра лёс фірмы будзе прынятае ў канцы ліпеня.

### У Гомелі зьменшаць стаўку

Гомельскі аблвыканкам прапанаваў зьменшыць стаўку адзінага падатку для мясцовых прадпрымальнікаў у сярэднім на 30%. Арэндная плата на рынках Гомельшчыны ўжо зьменшана на 16,5%. Праўда, нездавальненьне прадпрымальнікаў з прычыны запланаванага на жнівень пачатку спагнаньня ПДВ з прывезеных з Расеі тавараў не зьнікае. Прапановы мясцовых уладаў наладзіць цэнтралізаваныя пастаўкі тавараў з Расеі падтрымкі сярод бізнэсоўцаў не знайшлі.

### Ні на будоўлю, ні на подыюм

Права займацца працаўладкаваньнем беларусаў за мяжой атрымала толькі адна фірма. Астатнія 29 так і ня здолелі атрымаць адпаведных ліцэнзій ад Міністэрства ўнутраных спраў, бо не змаглі заключыць кантракты непасрэдна з замежнымі працадаўцамі. Падобныя праблемы маюць і мадэльныя агенцтвы. Пакуль што ніводнае зь іх ня здолела атрымаць ліцэнзію на дзейнасьць ад Мінадукацыі.

### Піўное замірэньне

Бровары «Крыніца» і «Балтыка» падпісалі міравое пагадненьне. «Крыніца» згадзілася выплаціць «Балтыцы» $2,7 млн да канца году. Раней «Балтыка» патрабавала 3,5 млн, але вырашыла, што лепш атрымаць меней, чым працягваць судовы разбор.

### Літва — за эўра

Літоўскі сойм прагаласаваў супраць правядзеньня рэфэрэндуму адносна ўвядзеньня ў краіне эўра. Пытаньне пра рэфэрэндум узьняла Лібэральна-дэмакратычная партыя, якая патрабуе захаваць літ у якасьці нацыянальнай валюты. Такім чынам, эўра заменіць-такі літ 1 студзеня 2007 г., калі рашэньне будзе ўхвалена Радай ЭЗ.

**АК, АФН**

КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 7 ліпеня:**

1 амэрыканскі даляр — 2 150 рублёў
1 эўра — 2 564,30 рубля.
1 латвійскі лат — 3 684,35.
1 літоўскі літ — 742,65.
1 польскі злоты — 632,20
1 расейскі рубель — 74,60.
1 украінская грыўна — 427,14.

**Паводле Нацбанку**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**АМОН затрымлівае актывістку АГП Натальлю Лявонаву 3 ліпеня ў часе акцыі супраць перайменаваньня праспэктаў Скарыны і Машэрава. Усяго ў той дзень было затрымана 8 чалавек. Пасьля канфіскацыі агітацыйных матэрыялаў іх адпусьцілі.**

# Гістарычныя акалічнасьці

Заўзяты краязнавец цяперака супрацоўнічае з чорнымі капачамі. Кансультуе на гістарычную тэму. Піша **Руслан Равяка**.

Калі б гісторыкі выступілі адзіным фронтам супраць націску на Сагановіча, магчыма, чыноўнікі пабаяліся б яго звальняць. Але змаўчалі, праглынулі, пабаяліся паўстаць супраць дурных загадаў. Бо дзе ім пасьля гэтага карміцца і працаваць. Вось толькі іх зьнікненьне для сапраўднай навукі Беларусі адбудзецца незаўважна.

Зьмяняюцца сёньня падыходы і ў сапраўдных дасьледчыкаў гісторыі, асабліва ў правінцыі. Адараўшы ўсё жыцьцё на гістарычнай ніве, шмат хто кінуў пісаць кніжкі па краязнаўстве ў стол, а пачаў зарабляць грошы.

Заўзяты апантаны краязнавец цяперака супрацоўнічае з чорнымі капачамі. Кансультуе на гістарычную тэму. Кажа, што апошнім часам зьмяніў адмоўнае стаўленьне да іх. Маўляў, лепей хай нешта трапіць у прыватныя калекцыі ў Беларусі, чым будзе яшчэ стагодзьдзі гнісьці ў зямлі. Дзяржаву ж цяпер цікавіць толькі пэрыяд Другой сусьветнай вайны…

Паводле расказаў людзей, па ўсёй Беларусі паціху зьнікаюць экспанаты музэяў навучальных установ. Нідзе не зафіксаваныя, няўлічаныя розныя каскі, багнэты, мэдалі, акамянелыя косткі мамантаў, збанкі і іншая спадчына прадаюцца замежным і ў найлепшым выпадку нашым калекцыянэрам. Прадаюцца настаўнікамі гісторыі, якія адказваюць за тыя музэі. За гэта можна злупіць добрыя грошы. Дарэчы, і насельніцтва больш не прыносіць у музэі знойдзеных старажытнасьцяў. Цягне адразу ў антыкварныя крамы. Пасьля зь іх тыя рэчы большай часткай перапрадаюцца на Захад ці на Ўсход, багатым зьбіральнікам. Зрэшты, тое самае адбываецца і ў нашых суседзяў — палякаў, украінцаў, літоўцаў, расейцаў. Нам іх ужо не дасьледаваць, дый проста ня ўбачыць. Хаця нават тое, што застанецца, дасьледаваць ня будзе каму. Тыя, хто пройдзе ідэалягічную і матэрыяльную чыстку, будуць дасьледаваць толькі «лінію Сталіна» ды абарону Магілёва зь Берасьцейскай крэпасьцю.

# Ліцэісты ў Польшчы

1 ліпеня Беларускі ліцэй пачаў новы навучальны год у Польшчы. Клюб каталіцкае інтэлігенцыі, улады гораду Варшава запрасілі 85 ліцэістаў і 20 выкладчыкаў ды бацькоў на «летнюю сэсію».

У выдатных умовах, на базе дзьвюх найлепшых у сталіцы Польшчы ліцэяў, беларускія «падпольныя» ліцэісты маюць штодзённыя заняткі па ўсіх дысцыплінах, уключна з заняткамі плаваньнем у басэйне, багатую экскурсійную праграму, у тым ліку наведваньне Гданьску і Кракава.

12 ліцэістаў пасьля асноўных заняткаў праходзяць месячныя паскораныя курсы тэлежурналістыкі пад кіраўніцтвам знакамітага польскага рэжысэра-дакумэнталіста Міраслава Дэмбіньскага, а яшчэ шасьцёра навучаюцца газэтнай журналістыцы. Гэта робіцца зь вераю, што надыдзе той час, калі ў Беларусі спатрэбіцца замена Казіяткам і Росьціцкавым.

А перад пачаткам вучобы ў Варшаве, 30 чэрвеня, госьці зь Менску мелі дзьвюхгадзінную сустрэчу з сусьветна вядомым рэжысэрам Анджэем Вайдам. Спадар Вайда адказаў на два дзясяткі самых розных пытаньняў выкладчыкаў і навучэнцаў Ліцэю, што датычыліся і ягонай творчасьці, і ягонай грамадзка-палітычнай дзейнасьці. Сталічная «Газэта выборча» зьмясьціла вялікі рэпартаж пра гэтую сустрэчу і фота сп.Вайды зь ліцэістамі. Увогуле інтарэс польскае прэсы да побыту Ліцэю ў Польшчы надзвычайны: пра яго пісала таксама «Жэчпасполіта», рабілі рэпартажы розныя каналы польскага тэлебачаньня.

Наперадзе ў ліцэістаў найцікавейшае спатканьне з Кшыштафам Занусі, экс-прэм'ерам Тадэвушам Мазавецкім, кіраўніцтвам польскага Міністэрства адукацыі і ўправы Варшавы. Хачу нагадаць, што ў першай палове чэрвеня III курс ліцэю правёў плённую сэсію, узяў удзел у днях беларускае культуры ва Ўроцлаве.

Сёньня можна з пэўнасьцю гаварыць: Эўропа зразумела і падтрымала Беларускі ліцэй за яго мужную і пасьлядоўную пазыцыю ў адстойваньні беларускасьці і свабоды.

**ЛБ, Варшава**

## СЬЦІСЛА

### Бязь зьменаў

**28 чэрвеня Менскі гарадзкі суд пакінуў безь зьмяненьняў прысуд у дачыненьні да старшыні БСДП («Народная грамада») Міколы Статкевіча** і аднаго зь лідэраў «Маладога фронту» **Паўла Севярынца**. Згодна з рашэньнем суду, палітыкі прыгавораныя да двух гадоў абмежаваньня волі («хімія»).

Вышэйшы гаспадарчы суд адхіліў пазоў **рэдакцыі «Народнай волі»** да Мініфармацыі і пакінуў у сіле папярэджаньне газэце за дзьве публікацыі, выдрукаваныя ўвесну. Газэта зьбіраецца абскардзіць рашэньне яшчэ раз — у прэзыдыюме Вышэйшага гаспадарчага суду.

### У Смургонях

Прадстаўнік Смургонскай раённай пракуратуры Сяргей Кавальчук абскардзіў рашэньне суду, які ў сьнежні 2004 году вынес рашэньне аб амністыі **Рамуальда Ўлана**. На думку пракуратуры, нягледзячы на амністыю Ўлан павінен адбыць пакараньне тэрмінам адзін год. Лёс былога дэпутата Смургонскага райсавету цяпер будзе вырашаць Гарадзенскі абласны суд.

### Леванеўскі і Марыніч у бальніцы

27 чэрвеня **Валер'я Леванеўскага** перавялі з Івацэвіцкай калёніі ў Рэспубліканскую турэмную больніцу. Палітвязень мае патрэбу ў лячэньні пасьля галадоўкі — у яго павысіўся ціск і баліць сэрца.

Туды ж перавялі зь менскай калёніі УЖ 15/1 **Міхаіла Марыніча** з прычыны праблем са здароўем. 1 ліпеня начальнік менскай калёніі Яўген Лось не дазволіў сыну Паўлу спаткацца з бацькам у больніцы.

### У Івацэвічах

29 чэрвеня супрацоўнікі Івацэвіцкага РАУС склалі пратакол на актывіста АГП **Станіслава Халадовіча** за распаўсюд друкаванай прадукцыі. Халадовіч раздаваў улёткі кааліцыі «5+» у вёсках Івацэвіччыны, а таксама брашуру Васіля Лявонава «Бяз права на памылку».

### Міравое пагадненьне

29 чэрвеня прадстаўнікі прадпрыемства «Беларуськалій» прапанавалі **рэдакцыі «Народнай волі»** мір. Пазоўнік адмаўляецца ад прэтэнзій і бярэ на сябе аплату судовых выдаткаў, а «Народная воля» павінна да 15 ліпеня даць абвяржэньне апублікаваных зьвестак і папрасіць прабачэньне. Пазоў «Беларуськалію» тычыўся артыкулу «Такая воля народу», дзе ішла гаворка пра стварэньне грамадзкага руху «Воля народу» і сьцвярджалася, што подпісы ў яго падтрымку паставілі шэраг супрацоўнікаў прадпрыемства.

### Чучман зломак

29 чэрвеня віцебскі лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту» **Яніс Чучман** вырашыў прасіць палітычнага прытулку ў Бэльгіі.

Прычынаю тэрміновага ад'езду называецца міліцэйскі ды судовы перасьлед за ўдзел у апазыцыйных акцыях.

### Прафсаюзы выйгралі

28 чэрвеня суд Ленінскага раёну Менску пастанавіў спагнаць сярэдні заробак за затрымку разьліку пры звальненьні на карысьць сябра прафсаюзу РЭП (АМ) **Максіма Вахрушава**.

1 ліпеня Рэчыцкі суд абавязаў прадпрыемства «Рытм» выплаціць кампэнсацыю ў памеры дзесяціразовага сярэднямесячнага заробку звольненым супрацоўніцам і сябрам РЭП **Ірыне Паплаўнай** і **Сьвятлане Ўсхопавай**.

### У Калінкавічах

29 чэрвеня ў Калінкавічах міліцыя затрымала актывіста незарэгістраванага праваабарончага цэнтру «Вясна» з Мазыра **Ўладзімера Целепуна** пасьля таго, як намесьнік старшыні абласной арганізацыі АГП Уладзімер Кацора перадаў яму адрамантаваны прыватны кампутар. Сьледчы міліцыі Сурма і міліцэйскі экспэрт Валяк растлумачылі затрыманьне тым, што гэты кампутар быў скрадзены ў нейкай невядомай арганізацыі.

У гэты ж вечар у Калінкавічах пяцёра афіцэраў міліцыі, якіх узначальваў маёр Таран, уварваліся ў прыватную кватэру на вуліцы Князева, 9. Тут ладзіўся сход па выбраньні дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў. Міліцыянты спрабавалі сарваць выбарчы сход.

### Чыноўнік адмовіўся

30 чэрвеня начальнік упраўленьня спорту і турызму Гарадзенскага гарвыканкаму У.Чыгірынаў адмовіўся даць інфармацыю журналісту **Аляксандру Дварэцкаву**. Адмову чыноўнік растлумачыў тым, што «не размаўляе з вольнымі журналістамі».

### У судзе Горадні

30 чэрвеня гарадзенскі аблсуд не задаволіў скаргу **актывістаў АГП** на рашэньне суду. Пяцёра чалавек былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасьці за ўдзел у акцыі памяці Юр'я Захаранкі 7 траўня і пакаралі штрафамі на 25 б.в., а былы сябар БНФ **Раман Юргель** атрымаў штраф у 160 б.в. за паўторнае затрыманьне. Актывісты АГП будуць абскарджваць рашэньні гарадзенскіх судоў у Вярхоўным судзе.

### Скрабца пакінулі ў турме

1 ліпеня судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску Алена Ільіна не задавола хадайніцтва **Сяргея Скрабца** аб вызваленьні пад падпіску аб нявыезьдзе. Палітык па-ранейшаму застаецца пад арыштам у Берасьцейскім сьледчым ізалятары.

### Сканфіскавана 70 тысячаў бюлетэняў

1 ліпеня групай супрацоўнікаў праваахоўных арганаў на выезьдзе зь Менску былі затрыманы рэгіянальныя каардынатары незарэгістраванай грамадзянскай ініцыятывы «Партнэрства» **Станіслаў Шаламаў** з Гомелю, **Алег Пашкевіч** зь Віцебску і **Іна Апанасенка** зь Берасьця. Яны былі дастаўлены ў Савецкі РУУС Менску, дзе ў іх канфіскавалі 70 тыс. інфармацыйных бюлетэняў. У гэты ж дзень быў апячатаны гараж, што належаў аднаму з актывістаў ініцыятывы.

### Сходы сарваныя

На Віцебшчыне сарваліся тры сходы па выбарах дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сіл. 2 ліпеня сход не адбыўся ў Мёрах, Сяньне і Бешанковічах. Напярэдадні на сеньненскіх апазыцыянэраў пачаўся ціск, і яны адмовіліся ад заплянаванага.

### На Дзень Рэспублікі

Мастак **Алесь Пушкін** за пэрформанс, які ён зладзіў а пятай раніцы 4 ліпеня ля будынку Нацыянальнага мастацкага музэю, дастаўлены ў РУУС Ленінскага раёну. Разам зь ім у міліцыю трапілі фотакарэспандэнт агенцтва Associated Press **Сяргей Грыц** і фотакарэспандэнтка газэты «Наша Ніва» **Юлія Дарашкевіч**.

Генэральнага консула Польшчы ў Горадні **Анджэя Крантоўскага** і старшыню Саюзу палякаў Беларусі **Анжаліку Борыс** не пусьцілі ў Польскі дом, які знаходзіцца ў Шчучыне.

Перад пачаткам яшчэ адной акцыі супраць перайменаваньня — на рацэ Сьвіслач — былі затрыманы актывісты Партыі БНФ **Андрэй Сухаверхі** і **Зьміцер Казлоўскі**.

**Сяргей Будкін**

# Вяртаньне Сапегаў у горад-герой Быхаў

Быхаўскі замак арандаваў Максім Сапега. Ён фэрмэр і займаецца лесам. Рэпартаж **Аляксея Бацюкова** з гораду-героя беларуска-расейскай вайны.



АЛЯКСАНДАР АРЦЕМ'ЕЎ

**СІНАГОГА З БАЙНІЦАМІ і абарончай вежай у XVII ст. бараніла заходнюю мяжу Быхава.**

Покуль рэдакцыйная машына млява люляе ў сваім аксамітным нутры нашы целы, я прыгадваю, што ведаю пра Быхаў. За саветамі — горад стратэгічных бамбардзіроўшчыкаў і ваенных маракоў Балтыйскага флёту. Але найперш горад славутай абароны падчас вайны Рэчы Паспалітай і Расеі. Нарэшце, Дняпро, і даўжэзны безгустоўны мост, і шэры прастакутнік палацу па-над ярам, прыцярушаны лісьцем.

## Мілітарызаваная сынагога

Ня можа так выглядаць горад, які разам з Крапівенскім полем сымбалізуе сярэднявечную вайсковую славу беларусаў. Прывідам зь мінуўшчыны палац праплыў за сьпіны, у вочы разанула косая лінія вежы. Нахіленая над ярам, яна нядаўна абвалілася на чвэрць, у правале зеўрае сонца. Год таму гэты палац гарэў, а два месяцы таму рухнуў кавалак сьцяны. Быхаў — горад руінаў. У краязнаўчым музэі ўся ўласная экспазыцыя звалена ў калідоры на другім паверсе, бо ўжо каторы год ідзе рамонт. На самым уезьдзе ў горад высіцца сынагога з абарончай вежай. Як вам сама ідэя — мілітарызаваная сынагога? XVII ст. вы тут убачыце непасрэдна — ад моманту стварэньня муроў не кранала рука рэстаўратара. Затое кранала рука нэафашыста. Яшчэ зь зімы ўсьцяж дзьвюх сьцен, якраз зьвернутых на цэнтральны праспэкт, расьцягнуліся чорныя надпісы «РНЕ».

Стаім, здымаем сынагогу. Асьцярожны кашаль за сьпінай, маёр міліцыі ветліва знаёміцца і пераходзіць да справы. «Вы ня ведаеце, што такое «РНЕ»? А то адзін вэтэран зьвярнуўся ва ўпраўленьне з запытам, дык цяпер трэба ў рапарце напісаць». Расказваю грунтоўна, назіраючы, як не мяняецца і ня ўздрыгвае ніводным мускулам ветлівы твар пад фуражкай. «Я проста бачу, людзі вучоныя, трэба спытаць», — дзякуе, ківаючы на камэру.

## Горад-герой

У сярэднявечным Быхаве сынагога бараніла заходнюю мяжу гораду. Замак — усходнюю. Дзьвесьце крокаў напрасткі. Сучаснымі меркамі мы пераадолелі квартал. Старажытнымі — прайшлі праз увесь горад.

Зручнейшае месца для замку знайсьці немагчыма. Нездарма Быхаў — адна з самых трывалых цытадэляў ВКЛ. Натуральныя равы з трох бакоў, над равамі — вежы.

Яшчэ адзін складнік ваенных посьпехаў — артылерыя. У горадзе працавала *людвісарня*, дзе адліваліся марціры, гарматы, гакаўніцы, мушкеты, шматствольныя арганы. На ўзбраеньні быхаўскіх абаронцаў былі нават ручныя гранаты — мэталічныя, драўляныя, шкляныя.

Замак (цэнтар адміністрацыйнай адзінкі, ад адной назвы якой растае сэрца, — Быхаўскага графства) сьпярша будавалі кіеўскія князі Хадкевічы, затым некалькі пакаленьняў ім валодалі Сапегі. Яны завяршылі палац, і пры іх Быхаў стаў непрыступным. Пазьней, за расейскім панаваньнем, ён ператвораўся ў «заштатны».

За Сапегамі цьвярдыня на Дняпры была ключом да ўсёй Беларусі. Прынамсі, такое значэньне надавалася Быхаву казацкімі атаманамі. Гісторыкі згаджаюцца, узялі б Быхаў войскі Гаркушы ў 1648-м (Гаркуша сам быў быхавец) — і казакі кантралявалі б усё. У 1654—1655 гадах, падчас славутай абароны быхаўскага гарнізону ад казакаў Залатарэнкі і адзінаццаці маскоўскіх палкоў, Быхаў быў адзіным з падняпроўскіх гарадоў, што выстаяў на першым этапе вайны. Новы казацкі атаман Нячай узяў яго ў 1657-м, але неўзабаве перайшоў на бок Рэчы Паспалітай. На 30 гадоў рашэньнем караля і Сойму Рэчы Паспалітай горад быў пазбаўлены ўсіх падаткаў за абарону 1654—1655 гадоў. У паваеннай спустошанай Беларусі гэта, аднак, не дало штуршку для эканамічнага росту.

## Новыя гаспадары

Праход да замку закрыты высокімі варотамі. Цытадэль за савецкім часам была мэблевай фабрыкай, падпарадкоўвалася яго інфраструктуры, абрасла цаглянымі хлеўчукамі і страціла ўсе ўмацаваньні, апроч палацу і тых дзьвюх вежаў. Яшчэ дзьве вежы ўплецены ў архітэктуру палацу.

Насустрач нам з-за варотаў выйшаў высокі бялявы малады хлопец. Гаспадарчыя пабудовы мэблевай фабрыкі арандуе ягоная сям'я, яны фэрмэры і займаюцца лесам. А паколькі замак быў на балянсе фабрыкі, ім жа даверылі яго догляд. Хлопец адчыняе нам дзьверцы, вядзе па калідорах. На адных зь дзьвярэй крэйдай няроўна выведзена — «Музэй». Тут яны з бацькам складваюць усе цікавосткі, што знойдуць у замку. Увесь агромністы стол уздоўж сьцяны завалены бітымі гаршкамі, косткамі, магчыма, не чалавечымі. Падлога пасярэдзіне пакою разабраная, унізе выразна відаць яміна, зь якой тырчыць рыдлёўка. «Нікому не кажыце, што нешта капалі, — раю хлопцу, — гэта забаронена законам». Замак — помнік рэспубліканскага значэньня. І як пра ўсё, што ў Беларусі ёсьць славутага, але што не ўпісана ў шаблённы набор нацыянальных скарбаў, рэспубліка пра замак памятае, але на адлегласьці. Чыноўнікі ад міністэрства культуры не прыяжджалі ў замак ні пасьля леташняга пажару, ні пасьля сёлетняга абвалу.

Помнікі рэспубліканскага значэньня не прадаюцца? Максім адказвае як практык: сёлета з нас бяруць 30 тысяч даляраў. Летась патрабавалі пятнаццаць.

**Быхаў** — горад на Дняпры ў Магілёўскай вобласьці. Упершыню згадваецца ў 1430. Належаў Гаштальдам, Жыгімонту Старому, Хадкевічам, Сапегам. У к.XVI — п.XVII ст. гетман Ян Караль Хадкевіч пачаў, а Леў Сапега завяршыў будаўніцтва ў Быхаве мураванага замку. Горад трываў аблогі расейскіх і казацкіх войскаў у 1654, 1659, 1660, 1702. У 1707 г., пасьля некалькіх дзён бамбардзіроўкі, горад захапілі войскі Пятра І. Расейцы разбурылі мураваныя замкавыя брамы. Цягам XIX ст. Быхаў ператварыўся ў заштатны горад Беларускай губэрні з 6 тыс. жыхароў. Цяпер раённы цэнтар.

## Рэха

Абгарэлы шкілет верхняй столі губляецца ў самой сьцяне. Гарэла перакрыцьце, закладзенае яшчэ пры Хадкевічах. Па сьцяне з-пад абвугленага верху выпаўзае трэшчына і цягнецца да самага нізу. Наступнай зімой можна чакаць новага абвалу.

— Дарэчы, як цябе завуць? — зьвяртаюся да хлопца.

— Максім Сапега.

— Як?! — утрымліваюся, каб не падскочыць.

Прадзед Сапегаў-фэрмэраў быў афіцэрам царскай арміі, паходзіў зь вёскі, што належыла Сапегам-магнатам. Далейшую повязь з тым славутым родам трэба яшчэ шукаць, прызнаўся пазьней бацька Максіма, але надзея ёсьць.

«Сапега» — праз усё наша далейшае гасьцяваньне ў замку гэтае імя рэхам адбівалася ад сьцен. Ці, можа, сачылася з гэтых сьцен? Сачылася, вабіла, паклікала блакітныя кроплі ў жылах нашчадкаў, як тая Шапэнгаўэрава воля, вярнуцца ў спакутаваныя сьцены гаспадарамі…

Максім водзіць нас па паверхах, паказвае ўпэўненымі рухамі гаспадара. Тут дымаход, праз гэтую трубу відаць неба. На ўвесь палац некалькі камінаў, але сыстэма дымаходаў такая прадуманая, што гэтыя каміны праграваюць увесь будынак. Вось тут сутарэньне — гэта ўжо ў паўночнай, больш-менш ацалелай частцы замку. Каменныя зводы апускаюцца ў рызьзё і ламаныя вёдры. Дзесьці адсюль пачынаўся падземны ход — у яго вачах прачынаецца азарт — шукаю.

У сьмелых марах старэйшага Сапегі, Мікалая, выкупіць замак і адрэстаўраваць. На маю ўпэўненасьць, што помнікі рэспубліканскага значэньня не прадаюцца, Максім адказвае як практык — сёлета з нас бяруць 30 тысяч даляраў. Летась патрабавалі пятнаццаць. У падобных выпадках дзяржава толькі радая, што руінамі нехта зацікавіўся.

## Колькі разоў пра гэта гаварылі?

У сярэднявечным Быхаве мураваных будынкаў было ўсяго два — сынагога і замак. І абодва выстаялі дзеля нас. Як хворыя пад вокнамі бальніцы, нема крычаць і ўзіраюцца ў сваё адлюстраваньне ў зачыненых вокнах. Наўрад ці ў найбліжэйшы час ім лёс дакрычацца да вокан на верхніх паверхах. Цікавасьць да той жа сынагогі закончыцца, як толькі праз пару дзён замажуць фарбай на сьцяне «РНЕ». Наўрад ці сьветлыя мары Сапегаў-фэрмэраў — нешта большае, чым мары. Трыццаць тысяч даляраў — гэта толькі каб купіць палац, а каб рэстаўраваць? Хіба што прывід Лява Сапегі зьявіўся хлопцу Максіму і расказаў, дзе ляжаць фамільныя скарбы.

Ці ёсьць у Беларусі грамадзянская супольнасьць ці проста жменька спэцыялістаў, што прыехала б да быхаўскага палацу, дапамагла б тым жа Сапегам разабраць ламачча, вывучыць бітыя гарлачы і пад аховай «адкрытага ліста» пакалупацца ў той яміне бяз рызыкі трапіць пад крымінальны артыкул? І ці ўвогуле патрэбная памяць пра вайсковую славу даўняй Беларусі?

**23 ліпеня** фільм «Мой горад Быхаў», зьняты ў час гэтай паездкі, будзе паказаны на канале «Лад».



**Аляксей Бацюкоў** — пісьменьнік, журналіст. Жыве ў Магілёве.

# Сьмерць Купалы: усё ж забойства

Працяг са старонкі 1.

## Загадкавы В.Б.Г.

Меркаваньне Някляеў падмацоўвае наступнымі аргумэнтамі.

1. Справу па факце сьмерці Купалы вёў вайсковы пракурор Масквы. Аднак дамагчыся доступу да яе, адшукаць яе ў архівах пакуль не ўдалося нікому. Справа захоўваецца ў архіве прэзыдэнта Расеі — былым архіве ЦК КПСС.

2. Купалу рыхтаваліся забіць і менавіта таму нават не зьбіраліся сьвяткаваць ягоны юбілей (у ліпені 1942 г. яму спаўнялася 60 гадоў) у адрозьненьне ад Коласа. І ў Маскву выклікалі Купалу ўрадавай тэлеграмай аднаго, не дазволіўшы ўзяць жонку.

3. Самому Купалу ўвялі ў вушы, што вуліца ў Менску названая ягоным імем. І паэт выкрываў немцаў за гэтую вуліцу ў выступе на сэсіі Акадэміі навук БССР у пачатку 1942 г.

4. Блытаніна з прозьвішчамі Івана Луцэвіча (Янкі Купалы) ды


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Уладзімер Някляеў: Бачачы ў Купалу патэнцыйнага нацыянальнага лідэра, яны вырашылі яго ліквідаваць.

Івана Луцкевіча праходзіць праз усе дакумэнты савецкіх спэцслужбаў 1942 году. У спэцпаведамленьні на імя Берыі гаворыцца пра сьмерць «Івана Дамінікавіча Луцкевіча».

5. Пра тое, што Купала быў забіты, упэўнена гаварыла народная артыстка Беларусі Ларыса Александроўская. Някляеў рабіў запіс яе ўспамінаў пра Купалу ў 1970-х. Некаторыя моманты не ўвайшлі ў кнігу «Такі ён быў» (1975). Так, Л.Александроўская называла літаратара, паводле даносу якога Купалу й зьнішчылі. Някляеў называе яго В.Б.Г. (па першых літарах мянушкі), або «Вершнік без галавы». Некаторыя дасьледчыкі зьвязваюць гэты псэўданім з Айзікам Кучарам, зацятым крытыкам Купалы і магільшчыкам (амаль у прамым сэнсе слова) не аднаго беларускага літаратара.

Што праўда, Арыядна Ладыгіна, пляменьніца сьпявачкі й аўтарка кнігі пра яе, сумняецца ў Няклявеўскіх сьведчаньнях: «Александроўская была вельмі стрыманая. Калі яна не казала такога нават нам, сваякам, дык наўрад ці яна дзялілася такімі ўспамінамі з малазнаёмым маладым чалавекам».

## Такое магло быць

Архівіст Віталь Скалабан — гісторык, які найлепш ведае ўсе дакумэнты і абставіны таго часу, захоплены ўвядзеньнем у навуковы ўжытак новых момантаў — успамінаў Л.Александроўскай і асобы В.Б.Г. Аднак у някляеўскім аналізе яму бачацца некаторыя супярэчнасьці.

Так, купалаўскі юбілей афіцыйна быў замоўчаны. Больш за тое, паэта дэманстратыўна крыўдзілі. Павал Кавалёў, памочнік партыйнага бонзы Беларусі Панамарэнкі, 5 чэрвеня 1942 г. піша ліст Купалу: «Пачынаем рыхтавацца да юбілею Якуба Коласа, які, напэўна, афіцыйна будзе праводзіцца ў кастрычніку. Пажадана, каб і вы некалькі радкоў цёплых прысьвяцілі яму». Пра юбілей самога Купалы — ані згадкі.

Аднак казаць, што юбілей Купалы зусім не рыхтаваўся, нельга, лічыць архівіст. Вядомы беларускі журналіст Яфім Садоўскі піша ліст Ц.Гарбунову: «7 ліпеня Іван Дамінікавіч сьвяткуе сваё 60-годзьдзе. /…/ Ці намячаецца шырока сьвяткаваць гэтую дату? Мне хацелася б арганізаваць яму ліст ад беларусаў-франтавікоў». Звароты грамадзкасьці, лічыць Скалабан, мелі свой уплыў. Але адзначаць Купалаў юбілей меліся прыхавана. На першую палову ліпеня плянаваўся пленум Саюзу пісьменьнікаў БССР у Маскве. У парадку дня быў пазначаны і даклад Крапівы «Пра літаратурную дзейнасьць Янкі Купалы і Якуба Коласа» (пастанова ЦК КП(б)Б ад 21 чэрвеня 1942). Прычым Коласа сюды ніхто не запрашае, яго няма. Запрасілі Купалу. «Дык што гэта? Схаваная форма юбілею!» — мяркуе архівіст. Выклікалі ў Маскву Купалу акурат пад гэты пленум. І пасьведчаньне выдалі ад 8 чэрвеня «ў тым, што ён сапраўды камандзіруецца Вярхоўным Саветам БССР у г.Маскву са зваротным вяртаньнем у Казань». Менавіта гэтак — зь вяртаньнем!



Сумнеўным Скалабану падаецца сьцьверджаньне Няклява наконт забароны браць з сабой жонку: «Няма такога сьведчаньня, каб «ня браць жонку». Дзе гэта? Купала з Уладзіслаўай Францаўнай перад паездкай, відаць, пасварыліся, адносіны былі ня лепшыя. У доказ сваёй вэрсіі ён прыводзіць ліст Уладзіславы Францаўны да Купалы за 27 чэрвеня 1942 г., атрыманы ў Маскве 6 ліпеня 1942.

## Дзе прамова паэта?

Вуліца Луцкевіча — самы загадкавы момант у гісторыі з Купалам. Першым Георгі Колас у 1993 г. напісаў, што з гэтым можа быць зьвязана таямніца Купалавай сьмерці. «Але ўсё на гэтым заціхла. Ніхто ня ўзяў на сябе клопату пашукаць», — кажа В.Скалабан.

У сувязі са згадваньнем Купалам вуліцы ўсплывае й яшчэ адна загадка. Дзе знайсьці беларускі арыгінал той Купалавай прамовы? У зборніку паэтавай публіцыстыкі 1972 г. прамова «Айчынная вайна і беларуская інтэлігенцыя» друкуецца, як пазначана, паводле арыгіналу дакладу, які захоўваецца ў музэі Купалы. Як кажа Скалабан, гэтага арыгіналу там няма: «Я яго шукаў, Інстытут літаратуры шукаў — і не знайшлі». Публікацыя ў нядаўнім Поўным зборы твораў рабілася па расейскім тэксьце, надрукаваным у казанскім выданьні 1942 г. Але гэты тэкст не ідэнтычны беларускаму! У беларускім станоўча згадваецца кампазытар Туранкоў, які акурат у вайну сядзеў у акупаваным фашыстамі Менску. Ёсьць і іншыя адрозьненьні.

Беларускага тэксту цяпер няма, ёсьць толькі расейскі. «Але быў жа! І яшчэ ня так даўно, — кажа Скалабан. — Можа, праз сувязь з трагедыяй гэты тэкст і зьнік».

Выснова Скалабана: «Я падтрымліваю вэрсію забойства, але не аргумэнтацыю Няклява». У забойства Купалы не было нейкай адной прычыны. Проста сабраны НКВД «кампрамат на Купалу выбухнуў у 1942 годзе».

Ускосна на карысьць забойства Купалы, кажа Скалабан, сьведчыць забойства Саламона Міхоэлса: «Калі такое было ўчынена там, дык магло быць зроблена і тут».

## Важкае слова

На думку Віталя Скалабана, сказаць важкае слова магла б крымінальная справа па факце сьмерці Купалы. Справа 1941 году мусіць захоўвацца ў Маскве, у прэзыдэнцкім архіве, але дастуціца да яе не ўдалося нават у 1990-я. На пачатку 1990-х запыты ў Маскву дасылаў дэпутат Яўген Цумараў і маскоўскія беларусы. Тагачасны старшыня КДБ Лавіцкі абяцаў спрыяньне ў пошуках дакумэнтаў. Была і прапанова стварыць адмысловую камісію. Пастанова пра неабходнасьць камісіі падпісана намесьнікам старшыні Саўміну М.Дземчуком. У адказ на яе тагачасны в.а. генпракурора Беларусі Кандрацьеў зазначыў, што бачыць стварэньне такой камісіі «ў цяперашні момант заўчасным» і лічыць патрэбным накіраваць работніка ў архіў расейскага Міністэрства абароны ў Падольску пад Масквой. У архіве, аднак, захоўваюцца дакумэнты вайсковых часьцей. Дакумэнтаў пра сьмерць Купалы там ня можа быць. Натуральна, што афіцыйны адказ з архіву гучаў так: «У Цэнтральным архіве ў Падольску ніякіх дакумэнтаў па гэтай справе няма».

## Дзьве вялікія таямніцы

Уладзімер Някляеў ставіцца да магчымасьці ўзнаўленьня крымінальнай справы скептычна: «Адзіная крымінальная зачэпка, якая ёсьць, гэта кроў ужо на лесьвіцы 7-га паверху. Калі чалавек падаў з 9-га паверху, вельмі сумнеўна, што ўжо на 7-м было б столькі крыві. Пра гэта мне казаў адзін крыміналіст. На жаль, іншых дакумэнтальных сьведчаньняў няма. Расьследаваць цяпер можа толькі нейкая грамадзкая камісія — мы з вамі».

Някляеў пэсымістычна заўважае, што імавернасьць дакапацца да ісьціны становіцца ўсё меншай. Скалабан наадварот лічыць, што час працуе на дасьледчыкаў: «Я думаю, мы набліжаемся да раскрыцьця. У вайне ёсьць дзьве вялікія тайны — тайна крыжа Эўфрасіньні Полацкай і тайна сьмерці Купалы. Гавораць: вайна ня скончана, пакуль не пахаваны апошні салдат. Дык наша вайна ня будзе скончана, пакуль не даведаемся, дзе крыж і чаму загінуў Купала».

Віталь Скалабан: Сказаць важкае слова магла б крымінальная справа па факце сьмерці Купалы.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Ці можна распачаць крымінальную справу аб забойстве Купалы?

**Валянцін Стэфановіч,** юрыст:

Малаімаверна. Тэрмін даўнасьці вычарпаны, калі заводзіць справу па артыкуле «забойства». Дадатковая складанасьць палягае ў тым, што няма суб’екту злачынства. Праўда, тэрмін даўнасьці ня дзейнічае, калі справу разглядаць сёньня ў межах сталінскага тэрору. Аднак рэабілітаваць Купалу няма патрэбы, бо яго «ворагам народу» не называлі.

**Міхаіл Пастухоў,** юрыст БАЖ, былы судзьдзя Канстытуцыйнага суду:

Тут два варыянты: ці аднавіць справу з прычыны акалічнасьцяў, якія сталі вядомы, ці распачаць новую. Калі беларуская пракуратура прыме рашэньне распачаць справу, можна зьвярнуцца ў архіўныя фонды, прагледзець дакумэнты НКВД, падняць архівы ў фондзе прэзыдэнта Расеі і высьветліць акалічнасьці сьмерці паэта. Аднак, калі высьветліцца прозьвішча Купалавага забойцы, да адказнасьці яго прыцягнуць будзе нельга, нават калі ён яшчэ жывы. Прысуд будзе такі: «Без прымяненьня пакараньня з прычыны заканчэньня тэрміну даўнасьці». Я мяркую, што ў пракуратуры ня пойдуць на завядзеньне крымінальнай справы і спашлюцца на розныя фармальнасьці (час, адсутнасьць сьведкаў). Але, прынамсі, можна падаць заяву.

**Міхаіл Чудакоў,** загадчык катэдры міжнароднага і параўнальнага права Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнце РБ:

— Казаць, што тэрмін даўнасьці ў справе Купалы прайшоў, можна толькі тады, калі крымінальная справа не была заведзена ў 1942 г. Калі ж распачыналі, то цяпер яе можна аднавіць, але толькі на тэрмін да году і толькі ў месцы зьдзяйсьненьня злачынства — г.зн. справу можа завесьці толькі пракуратура Масквы. Але гэта малаімаверна, бо павінны быць падставы, напрыклад, зьяўленьне сьведкі, дакумэнт, які б уносіў нешта новае.

# Божае кіно

Працяг са старонкі 2.

На пагорку ўдалечыні аграмадны — адусюль відаць — крыж.

Ля касьцёлу цёпла-шчырая, народная, драўляна-шэрая статуя Збаўцы. У касьцёле — рэліквіі сьвятога Юстына. Таго самага, што бараніў хрысьціян перад рымскім сэнатам у II ст.

Найбольшая колькасьць наведнікаў прыяжджае ў Мосар на дзень сьвятога Яна Хрысьціцеля, 24 чэрвеня. Ноч Сьвятога Яна сёлета ў Мосары сьвяткавалі з 25 на 26 чэрвеня. Сьвятар асьвячае вогнішча, у карагодзе дазволена танчыць і манашкам, так што гэта былі зусім не купальскія радасьці, а адмысловы хрысьціянскі фэст.

## Радзіма Драздовіча

Мясцовая заля, ашчадна адрэстаўраваная на грошы з прэзыдэнцкага фонду, названая ў гонар заснавальніка беларускага тэатру Ігната Буйніцкага. Напамін пра рэчаіснасьць — усутыч з заляй матэрыяльнамоўнае «Глыбокое — райгаз». Назвы вуліцаў: Маскоўская, Гагарына, Энгельса — і памяць пра землякоў Ластоўскага, Буйніцкага, Драздовіча. «Жыхары, у каго ёсьць дываны Драздовіча, ужо не аддаюць іх нам», — кажа супрацоўніца музэю.

У Глыбокім пацешны Ленін — з крывымі нагамі. Побач з помнікам — узьнёслыя храмы. «У нас палова вучняў з музычнай школы сьпявае ў праваслаўным храме, а палова — у касьцёле», — гаворыць Марыя Паляк, загадчыца аддзелу культуры Глыбоцкага райвыканкаму.

Царква Раства Багародзіцы — колішні касьцёл кармэлітаў — першаўзорнае віленскае барока, закінутае ў неба. Царква глядзіць на позьнебарочны Траецкі касьцёл — твар у твар, сьпеў да сьпеву, сьляза да сьлязы.

## Папскі нунцый і кінахлапушка

Кінафэстываль «Magnificat-2005» адкрываў папскі нунцый у Беларусі арцыбіскуп Марцін Відавіч. На мшы ў Мосары ён дабраславіў гэтае кінапачынаньне. А арганізатар фэстывалю рэжысэр і апэратар Юры Гарулёў прапанаваў і кінахлапушку, якой пазначаецца кожны дубль у фільме. Сёлетні дубль «Магніфікату» быў першым.

Зроблены кінадубль быў ва Ўдзеле, побач з касьцёлам францішканаў, ля помніка сьв. Максыміляну Кольбэ. Удзельскія парафіяне зь цікавасьцю глядзелі некалькі фільмаў, паказаныя ў мястэчку. Ледзьве месцаў хапіла. Асноўная частка фільмаў была паказана ў Глыбокім.

## Разгадка Глыбоччыны

Самае неверагоднае ў Глыбокім — людзкія твары, адкрытыя, чыстыя, асьветленыя спагадаю, цеплынёй і мудрасьцю; гэта атмасфэра наіўна-шчырага й штодзённага дабра і непрыметнай, але адчувальнай Прысутнасьці.

Немагчыма растлумачыць, што адбываецца ўнутры цябе, калі пабываеш на Глыбоччыне. Пекната, замілавальная наіўнасьць і адзнакі вечнасьці — штосьці на гэтай зямлі абуджае сэрца, дае надзею і суцяшэньне.

Проста на Беларусі Бог жыве. А Глыбоччына — Ягоны кінатэатар.



MAGNIFICAT 2005

**БІСКУП УЛАДЗІСЛАЎ БЛІН арганізаваў кінафэстываль у сваёй дыяцэзіі.**



АНДРЭЙ РАСІНСКІ

**МОСАР завуць Беларускім Вэрсалем.**




MAGNIFICAT 2005

**МАГНІФІКАТ: ДУБЛЬ ПЕРШЫ. З хлапушкай — Хрысьціна Лялько, нунцый Марцін Відавіч, Уладзіслаў Блін і рэжысэр Юры Гарулёў.**

## Кінафэст «Магніфікат»

сабраў 25 работ зь Беларусі, Украіны, Расеі, Польшчы, Мэксыкі, Францыі, Тайлянду. Беларусь была прадстаўлена 14 творамі. Гран-пры фэстывалю журы сёлета вырашыла не прысуджаць.

Дыплёмамі і прызамі журы адзначаны:

Фільм **«Божа мой»** («Беларусьфільм», 2004 г., аўтар сцэнару і рэжысэр — **Галіна Адамовіч**) — за рэжысуру. Гераіня карціны — старая вясковая скульптарка, якая жыве на беларуска-літоўскім памежжы. Юліта Кармаза робіць каплічкі й помнікі з цэмэнту.

За высокі прафэсіяналізм у адлюстраваньні гарманічнага і жыцьцесьцьвярджальнага сьветаўспрыманьня герояў у іх нацыянальным самавыяўленьні — фільм **«Прымакі»** (студыя «5-ты элемэнт», Менск, аўтар сцэнару і рэжысэр — **Уладзімер Бокун**). Фільм апавядае пра вядомы і шанаваны на Беласточчыне ансамбль «Прымакі» з Гарадку.

Фільм **«Даруй мне, Сяргей»** (каталіцкая тэлестудыя «Кана», Новасібірск, аўтар сцэнару і рэжысэр — **Даміян Вайцахоўскі**) — за арыгінальнае мастацкае раскрыцьцё тэмы пошукаў праўды.

(Падрабязьней аб прызах і намінацыях на сайце catholic.by.)

## Пра Сьвёнтка, езуітаў і каталіцкі фэст

Старшыня Каталіцкай асацыяцыі для камунікацый «Signis-Беларусь», арганізатар фэсту «Magnificat-2005» **Юры Гарулёў** адказвае на пытаньні «НН».

**«НН»: У свой час Вы былі на пэрспэктыўнай камсамольскай працы ў Ленінградзе – і раптам сышлі ў кінэматограф. Чаму?**

**Юры Гарулёў:** У кіно я хацеў трапіць заўжды. Яшчэ калі пабачыў у клюбе трафэйныя карціны, я проста ашалеў ад кіно. Але праз хрушчоўскія правілы трапіў у Ленінградзкі інстытут кінаінжынэраў і захапіўся грамадзкай працай. Арганізатарскія здольнасьці, патрэбныя для ладжаньня фэсту, я атрымаў там, у камсамоле.

Мне пасьля прапаноўвалі сьвінакомплекс пад Ленінградам, гэта была адказная праца і высокааплатная, пэрспэктыўная страшна, але ў мяне была мара, я сказаў: «Не, я зьяжджаю ў Менск…»

**«НН»: Сёньня Вы ўзначальваеце каталіцкі фэст. Як прыйшлі да гэтага з савецкіх атэістычных часоў?**

**ЮГ:** Першы штуршок быў, калі мы з Аркадзем Рудэрманам здымалі фільм пра мэліярацыю на Палесьсі і трапілі ў касьцёл у Пінску. Заходзіць экскурсія, вядзе яе стары чалавек – і ён так магутна распавядае – мы проста адкрылі рот. І савецкай уладзе даставалася – па справе. Гэта быў Казімір Сьвёнтак, тады ён быў простым ксяндзом. Мы, дарэчы, пра каталіцызм увогуле нічога ня ведалі. Каталіцызм – дык абавязкова злы чалавек, «езуіт». І я сутыкнуўся зь езуітам.

**«НН»: Як?**

**ЮГ:** Здымалі фільм «Арганы Беларусі». Калі сабраліся ў Пінск, Неўдах, сцэнарыст, кажа: «Тут мой знаёмы з Польшчы. Можна, паедзе з намі?» Прыходзіць хлопец у джынсах, куртка джынсавая, кашуля. І кажа: «Збышак, манах ордэну езуітаў». І я адваліўся. Манах! Хлопец у джынсах! Езуіт у маім разуменьні было – штосьці зьвярынае.

**«НН»: Калі ладзілі каталіцкі фэст, не баяліся абвінавачаньняў у празэлітызьме?**

**ЮГ:** Паглядзіце – тут і карціны пра праваслаўных, і пра каталікоў; шкада, што сёлета не было пра пратэстантаў. Тут нельга дзяліць. Усе вераць у Бога.

**«НН»: Чаму «Magnificat» арганізавалі менавіта на Глыбоччыне?**

**ЮГ:** Гэта сувязь з фэстывалем хрысьціянскага кіно «Непакаляны» ў Польшчы, які нам дапамог, фільмы прэзэнтаваў. Там – Максымілян Кольбэ, сьвяты патрон – і ва Ўдзеле помнік Максыміляну Кольбэ. І на Глыбоччыне багатыя традыцыі.

**Юры Гарулёў** – апэратар, рэжысэр-дакумэнталіст. Як апэратар зьняў дакумэнтальныя карціны «Тэатар часоў перабудовы і галоснасьці», «Цавэд танэм. Армэнія. Фрагмэнты трагедыі», «Арганы Беларусі». Як рэжысэр паставіў фільмы «Дэпутаты», «Філязофскае аддзяленьне», «Малітва». Заснаваў студыю «Стоп-кадар» для здымак рэлігійных фільмаў.

Зелімха Яндарбі — першы чачэнскі паэт, якога мы для сябе адкрываем. Добрыя перастварэньні — Барадулін ня ўмее перакладаць кепска. Кніга Яндарбі таксама выпрабоўвае нашы перадузятасьці. Піша **Валянцін Тарас**.



# Рытмы сэрца Яндарбі

У Расеі яго ведалі як «Зелимхана Яндарбиева», але гэта зрусіфікаваная форма ягонага імя і прозьвішча — у сваёй роднай Чачэніі ён зваўся Зелімха Яндарбі. Міжволі згадваецца, як на Беларускім тэлебачаньні тэлежурналіст Казіятка, калі бэсціў Васіля Быкава — вядома, па-расейску, — называў яго не Васілём, а Васіліем. Здавалася б, дробязь, аднак характэрная. «Дробязь» таго ж кшталту, што і «Белоруссия» замест «Беларуси»: найменьне «Беларусь» выклікае ў нашых фанатычна прарасейскіх казіятак ідэасынкразію, то бок псыхічную алергію. А ў расейскіх казіятак, акрамя таго, ідэасынкразія на чачэнскія імёны ў чачэнскай транскрыпцыі, а таксама на найменьне Ічкерыя, бо менавіта так стала называцца Чачэнія, калі абвясьціла сваю незалежнасьць ад Расеі ў сярэдзіне 1990-х. Дакладней, стала называцца Чачэнскай рэспублікай Ічкерыяй.

Зелімха Яндарбі быў віцэ-прэзыдэнтам Ічкерыі, у 1996 г. выконваў абавязкі прэзыдэнта. Потым крывавая завіруха чачэнскай вайны закінула яго ў эміграцыю, у Катар, дзе ў 2004 г. ён загінуў у выніку тэракту, зьдзейсьненага супрацоўнікамі расейскіх спэцслужбаў… Але яны забілі ня проста палітычнага дзеяча ненавіснай Ічкерыі — яны забілі паэта. Гэтае імя — Зелімха Яндарбі — накрэсьлена на вокладцы кнігі вершаў «Сэрца майго сьвятыня», выдадзенай сёлета ў Вільні выдавецтвам «Gudas» у перакладах Рыгора Барадуліна.

Першы чачэнскі паэт, якога мы для сябе адкрываем. Першыя ў гісторыі перастварэньні з чачэнскай мовы на беларускую. Добрыя перастварэньні — Барадулін ня ўмее перакладаць кепска, — і чытач можа толькі здагадвацца, якія цяжкасьці даводзілася пераадолець перакладчыку, каб убачыць за голым кустоўем падрадкоўніка лістоту паэтычнага зьместу, які паэтычны слых трэба мець, каб пачуць у празаічным пераказе мэлёдыку чачэнскага вершу, чачэнскай мовы. І якім майстэрствам трэба валодаць, каб зрабіць чачэнскія вершы зьявай беларускай паэзіі, захаваўшы пры гэтым іх першасную ўнутраную прыроду, іх чачэнскую адметнасьць. Безумоўна, ня ўсё ўдалося перастварыць бездакорна, сустракаюцца ў кнізе трохі груваскія пераклады, радкі, сэнс якіх даволі цьмяны. Але гэта дробязі, спыняцца на іх ня буду. Хачу сказаць, не магу не сказаць пра іншае — пра стэрэатыпы, зьвязаныя з вобразам чачэнца наагул. Перадусім згадваецца хрэстаматыйная «Казачья колыбельная песня» Міхаіла Лермантава, вялікага паэта Расеі, якога, дарэчы, вельмі люблю, аднак зь песьні слова ня выкінеш!

…По камням струится Терек,
Плещет мутный вал;
Злой чечен ползёт на берег,
Точит свой кинжал.
Но отец твой — старый воин,
Закалён в бою:
Спи, малютка, будь спокоен,
Баюшки-баю.
Сам узнаешь, будет время,
Бранное житьё;
Смело вденешь ногу в стремя
И возьмёшь ружьё.

Прадчуваў Міхаіл Юр’евіч, што і сыну старога воіна трэба будзе браць стрэльбу, каб дазаваёўваць Чачэнію. Сёньня мы ведаем, што і ўнуку даводзілася тое ж, і праўнуку, і прапраўнуку!.. Проста жахліва думаць, колькі пакаленьняў дзяцей у Расейскай імпэрыі слухалі гэтую лермантаўскую «Калыханку» і на ўсё жыцьцё запаміналі вобраз «злога чечена» з кінжалам! Нікому не прыходзіла ў галаву, што той чачэн караскаецца на свой *родны бераг*, каб помсьціць за тое, што гэты бераг адабралі ў яго «закалённые русские воины», апаэтызаваныя Лермантавым, дарэчы, адным з расейскіх афіцэраў, якія «замиряли Чечню» ў 30—40-я гады XIX ст. То бок — «усмиряли». Праўда, трэба памятаць і пра тое, што ў Лермантава гучыць і спачуваньне горцам Каўказу, захапленьне іхняй мужнасьцю, павага да іхняга пачуцьця годнасьці і гонару, да іхняга вальналюбства. І разам з «Калыханкай», разам з радкамі пра «злога чачэнца» згадваецца і той верш паручніка Лермантава, які ён напісаў, атрымаўшы загад адправіцца на Каўказ:

Прощай, немытая Россия,
Страна рабов, страна господ,
И вы, мундиры голубые,
И ты, послушный им народ.

Быть может, за хребтом Кавказа
Укроюсь от твоих царей,
От их всевидящего глаза,
От их всеслышащих ушей.

Так што ня зь Лермантава пачалося, ён толькі аддаў даніну традыцыі. Злавесны вобраз чачэнца пачала ствараць менавіта «немытая Россия» яшчэ напрыканцы XVIII ст., з моманту першых паходаў расейскага войска ў каўкаскія горы, з імпэрскай пыхай малявала яго дзікуном, барбарам, прыроджаным разбойнікам. Гэта закон псыхалёгіі: людзі вельмі ня любяць тых, каго пакрыўдзілі, падманулі, ашукалі, чый дом і багацьце захапілі.

Як крыўдзілі чачэнцаў, апісана ў гістарычным дасьледаваньні «Мусульманскі супраціў царызму. Заваёва Чачэніі і Дагестану» М.Гамэра — вялізны том гэтага дасьледаваньня я скончыў чытаць акурат перад тым, як атрымаў ад Рыгора Барадуліна кнігу вершаў Зелімхі Яндарбі. І, чытаючы іх, бачыў перад сабою ўсе этапы заваёвы Чачэніі Расейскай імпэрыяй, карныя апэрацыі, чуў стрэлы, якія адгрымелі 150 з гакам гадоў таму, і рэха тых стрэлаў зьлівалася зь сёньняшняй стралянінай у чачэнскіх гарах. І дзівіўся моцы маленькага чачэнскага народу, чыё сэрца ўвабраў у свае грудзі паэт Зелімха Яндарбі. Сэрца, поўнае болю памяці. Памяці і пра трыццацігадовую Каўкаскую вайну XIX ст., і пра сталінскую дэпартацыю чачэнцаў у казаскі стэп, і пра дзесяць гадоў найноўшай ельцынска-пуцінскай чачэнскай вайны, якая ўсё яшчэ працягваецца і атручвае сваім смуродам грамадзкае жыцьцё Расеі. Вайна, шчупальцы якой дацягнуліся да Яндарбі далёка за межамі Чачэніі. Шчупальцы нянавісьці тых расейскіх імпэрцаў, у чыіх вачох паэт быў і застаецца пасьля сьмерці спрадвечным ворагам, «злым чеченом», які, маўляў, у наш час зрабіўся заццятым тэрарыстам. Але ці быў ён тэрарыстам? Ці датычны ён пэрсанальна да выбухаў у маскоўскім мэтро і да захопу Дуброўкі? Расейская прапаганда сьцьвярджае, што датычны, аднак неабвержных доказаў не прыводзіць. Думаю, што доказаў і няма. Мяне асабіста пераконвае ў гэтым тое, што паэт сам гаворыць пра сябе ў сваіх вершах. Можна схлусіць у палітычнай прамове, у газэтным артыкуле, але ў вершах схлусіць немагчыма — у вершах паэт як на далоні, хоча ён гэтага ці не. На далоні ўвесь — як чалавек, як асоба. З усімі сваімі перакананьнямі, прынцыпамі, маральным крэда. Калі, вядома, ён паэт, а не спрактыкаваны вершаплёт, не імітатар пачуцьцяў. Ды імітацыя распазнаецца адразу, бо адрозьніваецца ад праўды паэзіі гэтак жа, як штучная кветка адрозьніваецца ад жывой. А Зелімха Яндарбі — само пачуцьцё, раскрытае людзям сэрца.

Некалі польскі паэт Уладзіслаў Бранеўскі параўнаў сваё сэрца з гранатай — мэтафара, якую, здавалася б, мог бы ўжыць і Яндарбі, ваяр нацыянальнага чачэнскага супраціву імпэрскага гвалту, — але сэрца Зелімхі не зарад ятры, а зарад гуманізму:

Здаецца, і хваляваецца ня сьлед,
Што ўзарвецца сэрца маё раптоўна,
Калі б не было пагрозы,
Што разбурыць яно цэлы сьвет…

Чую ў гэтых радках збой рытму сэрца, якое баліць, але ў іншым вершы, які так і названы — «Пра сэрца», паэт кажа:

— Баліць?
— Дык значыць, здаровае.
Ні кардыяграмы, ані рэнтгену
Ня трэба,
Каб ведаць гэна.
Ня верыш, спытайся ў таго,
Хто паможа табе разабрацца.
Сэрца? Гэта й ёсьць ягоная праца:
Балець,
Покуль ёсьць боль у сьвеце.
І яшчэ адно май на прыкмеце:
Сэрца плакаць павінна,
Покуль ёсьць для плачу прычына.
І яшчэ:
Покуль жывеш, яно, трапяткое,
Ня мецьме спакою.
Праўда — яна суровая.
Баліць?
Дык значыць, здаровае.

Кніга кожнага сапраўднага паэта — гэта кардыяграма ягонага сэрца. З усімі ягонымі рытмамі. І з арытміяй, з вострымі зубчыкамі нясьцерпнага болю, з усплёскамі радасьці і шчасьця. А ў гэтай кнізе б’юцца суладна два сэрцы — сэрца Яндарбі і сэрца перакладчыка. Яшчэ адно пацьверджаньне таго, што, як сказаў некалі Сяргей Ясенін, «паэт паэту ёсьць кунак». То бок сябра і брат. І тэма братэрства чачэнца Яндарбі зь Беларусяй, зь яе найлепшымі сынамі пранікнёна прагучэла ў ягонай кнізе. Адзін зь вершаў на гэтую тэму — «Сумленьне», з падзагалоўкам «На сьмерць Васіля Быкава»:

…Я ніколі ня верыў,
Што могуць музы маўчаць,
Калі
Прамаўляюць тамагаўкі альбо гарматы.
І калі нават атамны сьмерч
Спрабаваў стрэсьці мозаг Зямлі,
Сумленьне й толькі сумленьне
Ратавала Сусьвет ад страты.
Я ведаў,
Што велічы на зямлі няма ніякай.
Ёсьць Людзтва,
І вышэйшага за яго няма нічога.
І зноў пераканаўся ў гэтым,
Калі Вечнасьць забрала з сабой
Чалавека,
Чыё сумленьне, як дар нятленны, —
Ад Бога.

Напісаны гэтыя радкі 23 чэрвеня 2003 г., на другі дзень пасьля сьмерці Васіля. Працяг беларускай тэмы — у прысьвечаным Зянону Пазьняку вершы «Беларус» і ў вершы «Сябра», які прысьвечаны Р.Б. Няцяжка здагадацца, што Рыгору Барадуліну.

Бачу, што мая размова пра кнігу «Сэрца майго сьвятыня» атрымалася далёка ня поўнай, мабыць, залішне палітызаванай. Нічога я не сказаў пра лірыку Яндарбі, пра ягоныя вершы аб каханьні, роднай прыродзе, абмінуў драматычную паэму «Аружа» — аповед пра векавечныя чачэнскія звычаі, пра чачэнскі кодэкс гонару, мацнейшы за ўсё на сьвеце, нават за каханьне: юная чачэнка Аружа не даравала каханаму ганебнага ўчынку, нялюдзкага забойства. Спадзяюся, чытач усё гэта ацэніць сам. А для мяне галоўным быў сам выхад кнігі Яндарбі.

Закончыць хачу словамі самога Яндарбі з прадмовы да кнігі: «Гэтак ужо здараецца на зямлі, што знаходзіш сардэчных сяброў і пабрацімаў там, дзе зусім не чакаў іх сустрэць… У той момант, калі мне, закінутаму за межы Радзімы, вораг пачаў адразаць апошнія шляхі, адсякаць апошнія надзеі, Вы падалі мне і ўсяму чачэнскаму народу сваю шчодрую братэрскую руку і сэрца. Нехай аддзячыць Вам Звышні за чыстыя сэрцы і высакародны дух». Гэта апошнія словы Зелімхі Яндарбі, якія дайшлі да нас. Горка, што кнігі сваёй на беларускай мове ён не пасьпеў убачыць.




**Яндарбі Зелімха. Сэрца майго сьвятыня.** — Вільня, 2005.



**Валянцін Тарас** — пісьменьнік, удзельнік партызанскага руху ў час другой сусьветнай вайны.

# Лінія зь перагібам

Кіруецеся на «Лінію Сталіна»? Правіянт бярыце з сабою. І забудзьце пра гістарычную праўду. Рэпартаж **Алеся Кудрыцкага**.

«Дзе «Лінія Сталіна»? А халера яе ведае», — рэагуе на запыт дзядок у Заслаўі, падправіўшы адказ ладным мацюком. Мясцовы народ амаль нічога ня чуў пра адноўлены комплекс вайсковых умацаваньняў, што быў нядаўна з помпай адкрыты паблізу гораду. Толькі праз паўгадзіны роспытаў адзін заслаўскі дзядзька паказвае правільны напрамак. Наперадзе — шлях даўжынёй у 6 кілямэтраў уздоўж шашы, якая пралягае паўз парослыя лесам пагоркі.

Машыны не спыняюцца, бо набітыя пасажырамі: усе едуць у адпачынак. Хтосьці кіруецца да Нарачы, хтосьці ўсё-такі наважыўся паглядзець на тую «Лінію Сталіна», пра якую апошнім часам так шмат гавораць, пішуць і паказваюць па тэлевізіі.

Уік-энд на «Лініі Сталіна» задуманы як для сярэдняй клясы. Сьвежазбудаваны паркінг ля фартыфікацыйнага комплексу перапоўнены, зь легкавікоў выходзяць сем’ямі, пстрыкаючы бліскавіцамі сотавых тэлефонаў.

Першы ўдар турыстаў прымае экспазыцыя трафэйнай нямецкай тэхнікі, разьмешчаная ля самай паркоўкі. Малыя жменямі вісяць на грузавіках з чорнымі крыжамі ды, нібы тыя мурашкі, абляпляюць «фашысцкі» матацыкл з каляскай. «Мо табе й шмайсэр на грудзі даць?» — пытаецца дзядзька-наглядчык і вешае на грудзі хлопцу-«матацыклісту» плястмасавую копію аўтамата. «Ну, мы цяпер ужо Сашку ня здымем, давядзецца матацыкл да машыны чапляць», — махае на яго рукой жанчына ў летняй сукенцы.

Ад трафэйнай выставы наведвальнікі кіруюцца на ўзгорак, дзе за плотам выстаўлена савецкая ваенная тэхніка. Экспазыцыя досыць эклектычная — танкі часоў Другой сусьветнай мяжуюць з узорамі ваенных машын 1970-х. Дзеці ня могуць доўга ўседзець на распаленай сонцам брані, на якой хоць ты бліны смаж.

**З рэклямнага праспэкту:**

**«У нашай краіне шмат сярэднявечных замкаў і крэпасьцяў з памежнага крэпаснога поясу Расейскай імпэрыі, ёсьць бэтонныя мацаваньні Першай сусьветнай вайны, умацаваньні па мяжы 1939 г. т.зв. «Лініі Молатава». Але самым велічным фартыфікацыйным ансамблем зьяўляюцца умацаваныя раёны знакамітай «Лініі Сталіна», што перасякаюць усю тэрыторыю былога СССР ад Балтыйскага да Чорнага мораў».**

Далей турысты кіруюцца па трывалым мосьце са сьвежагабляваных дошак цераз сажалку, поўную мутнаватажоўтай вады (нядаўна напампавалі — гліна яшчэ не асела). Зноў пад’ём. На ўзгорку — пляцоўка інжынэрнай тэхнікі. Крыху наводдаль, ля крытага бляхай ангару, аголеныя па пояс салдаты млява рыюць нейкую яміну, смаляць цыгаркі і спадылба паглядаюць на турыстаў.

Далей пачынаецца агляд акопаў ды дотаў — доўгатэрміновых агнявых пунктаў. Жанчыны відавочна сумуюць, пакуль мужчыны з выглядам знаўцаў тлумачаць ім прызначэньне гэтых уросслых у зямлю бэтонных вежаў. «Во, туды трэба гранату кідаць!» — кажа бацька малому сыну, які зазірае ў байніцу камандна-назіральнага пункту №135. Дзеці з галёканьнем гойсаюць у лябірынтах акопаў, выкладзеных зь нуты акуратнымі круглымі бярвенцамі, і просяць пакатаць іх на невялічкай гармаце аднаго з агнявых пунктаў як на арэлях.

Сьцяжынкі, пасыпаныя жвірам ці выкладзеныя пліткай для ходнікаў, акопы, выкладзеныя бярвенца да бярвенца, акуратна нацягнуты калючы дрот — усё выглядае крыху цацачным. Тым больш што «лінія Сталіна» так ніколі і не была напоўніцу выкарыстаная па сваім абаронным прызначэньні. Дый «лініяй Сталіна» ніхто яе ў Беларусі ніколі не называў. А тым больш у суседніх вёсках, насельніцтва якіх было татальна рэпрэсаванае ў 1937 годзе. Натуральна, гэты факт арганізатарамі аднаўленьня комплексу не афішуецца. Комплекс прызначаны для слою, сярэдняга ня толькі па даходах, але і па ўзроўні адукацыі.

Але наведнікі ня лыкам шытыя. «Так, дасталося нашым бацькам і дзядам, — кажа сярэдняга веку кабета, сфатаграфаваўшыся зь сяброўкай ля бруствэру. — Але чаму немцы так хутка гэтыя ўмацаваньні прайшлі?» — «Ніхто не страляў, не пасьпелі яны страляць, — кажа бабулька ў хустцы, якую вядзе пад локаць маладзейшая кабета, відаць, дачка. — А камандзіры што? Яны здалёк камандавалі».

«У нас сваё стаўленьне да Сталіна, і кожны раз яны розныя», — тлумачыць выбар назвы комплексу палкоўнік Аляксандар Мятла, прэзыдэнт фонду «Памяць Аўгану», праводзячы экскурсію для наведвальнікаў. «Нас да апошняга моманту трэціравалі з гэтай назвай, казалі, што мы Сталіна праслаўляем. Але няхай з гэтым гісторыкі разьбіраюцца. Назва гэтая — у гонар гістарычнай справядлівасьці. І Сталіна».

«Тата, я хачу піць», — плача хлопчык. Бацька толькі разводзіць рукамі. Навокал няма нават шапіка, у якім можна было б набыць мінэралкі. Платны туалет — адзіны пункт сэрвісу, які пасьпелі збудаваць. І гэта пры тым, што Лукашэнка заявіў, што «лінія Сталіна» павінна быць самаакупнай.

Зь невялічкага латка ля выезду з комплексу прадаюць кніжкі пра вайну, у тым ліку «Сталіну, Эўропа, пакланіся» (5 тысяч рублёў). Побач — вайсковая фляга з выявай «правадыра» (7 тысяч). «Дык што ж гэта, Сталін ёсьць, а вады няма?» — запытваемся ў людзей у форме чырвоных камандзіраў. «А набудзьце флягу і набярыце вады ў Заслаўі!» — рагатнулі нам у адказ. На вайне як на вайне.

**СТАЛІНІЗМ — ПАТРЫЯТЫЗМ СЁНЬНЯ. Услаўленьне Сталіна разглядаецца як служба радзіме. Прэзыдэнт фонду «Памяць Аўгану» Аляксандар Мятла атрымаў атрымаў дзяржаўны ордэн «За службу радзіме» III ступені «за асаблівыя заслугі падчас будаўніцтва «Лініі Сталіна».**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

МУШТАРДА

## Першы рэвалюцыйна-бюргерскі, імя Мілтана Фрыдмана полк

**АЛЕСЬ БЕЛЫ**



Калі пад эўфэмізмам «прадпрымальнік» разумець дробнага гандляра кантрабандай на рэчавым рынку, дык нідзе ў сьвеце не было такіх ільготных умоў для прадпрымальніцтва, як у нас. Іпэшнік — ніякі не фэрмэнт для буржуазных рэвалюцый.

Лібэральныя палітыкі працягваюць заляцацца да індывідуальных прадпрымальнікаў (ІП), спрабуючы нацкаваць іх на ўрад. Маўляў, злачынныя спробы ўсталяваньня кантролю над стыхійна-народным імпартам тавараў з Расеі чарговы раз сьведчаць пра антынародны характар рэжыму. Даеш поўную легалізацыю «кантрабасу»! А калі адмовіце — штурмам возьмем Рэзыдэнцыю і пераабсталюем пад народны рэчавы рынак.

Палітыкі пасьпелі ўсім паабяцаць удзел ІП у прызначанай на наступны год «каляровай рэвалюцыі». Баечны Насрэдын-хаджа быў больш адказным: паабяцаўшы навучыць ішака размаўляць, ён папрасіў у шаха 20 гадоў, цьвяроза разьлічыўшы, што хто-небудзь з траіх зацікаўленых у экспэрымэнце бакоў пакіне гэты недасканалы сьвет раней.

Дзьве рэчы прымушаюць сумнявацца ў посьпеху гучнага праекту.

Па-першае, іпэшнік — ніякі не фэрмэнт для буржуазных рэвалюцый. Гэта не галяндзкі гёз XVI ст., не ангельскі сквайр XVII ст. і нават не чылійскі «дальнабойшчык» пачатку 1970-х. Гэты клясычны беларус літаратурнага канону, які заўжды застанецца шчырым беларусам, у дэкарацыях што прыгонна-калгаснай вёскі, што постмадэрнісцкага мэгаполісу. Жыве ён, далібог, нармальна, *паціху*.

Грошай хапае выпіць-пад’есьці, схадзіць штотыдзень у лазьню зь «цёлкамі», на тачку 7-гадовай даўніны і кватэру ў Малінаўцы на 11-м паверсе панэльнага гмаху. Са сваім прадпрымальніцтвам ён разьвітаецца бяз жалю і драматызму, вярнуўшыся да больш звыклых абавязкаў дробнага чыноўніка. За паўтара году, дадзеных адпаведным указам на роздум, самыя абачлівыя якраз і пасьпеюць уладкавацца праз сваякоў у тыя кабінэты, заміж таго каб браць іх штурмам.

Па-другое, калі пад эўфэмізмам «прадпрымальнік» разумець дробнага гандляра кантрабандай на рэчавым рынку, дык нідзе ў сьвеце не было такіх ільготных умоў для прадпрымальніцтва, як у нас апошнія 5 гадоў. Нават там, дзе ўнівэрсытэцкія сьцены спрэс завешаныя партрэтамі Фрыдмана і Гаека. Ну дзе яшчэ дазволена ў адкрытую і ў незьлічонай колькасьці гандляваць таварам, *паціху* прывезеным з суседняй дзяржавы, без аплаты мыта, заплаціўшы толькі фіксаваны падатак? Але занадта сур’ёзныя людцы стаяць за праектамі гіпэрмаркетаў, што растуць у сталіцы і абласных цэнтрах як чарнобыльскія грыбы, каб дазволіць суіснаваньне ў адной краіне дзьвюх абсалютна розных сыстэм падаткаабкладаньня імпарту. Да выбараў, вядома, ІП ніхто па-сур’ёзнаму чапаць ня будзе. Хай сабе соваюцца па сваё барахло ў Маскву і назад, заміж таго каб біць шыбы ў выканкамах. Яшчэ паўтара году іх можна пацярпець.

Што ж, сьмерць ішака ў нейкім сэнсе выйсьце — што для шаха, што хаджы... Абодва захаваюць рэпутацыю ў сяброў і прыхільнікаў.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Яны сьвяткуюць як паложана. Бо ўсе сьвяткуюць. Разам нас багата. Яны ўглядаюцца на далёкую сцэну. Лаў мі тунайт! Якое шчасьце — бачыць у бінокль Анжаліку, якая бачыла «Эўрабачаньне».

# Два сьвяты,


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Гульні для плебсу

Калі разьюшаныя маладзёны засьвісталі мэтра савецкае эстрады Мікалая Гнацюка, які быў завёў свой каронны «Малінавы звон», Ягор Хрусталёў, ідэоляг лукашэнкаўскіх шоў, мусіў стукаць кулакамі па стале. Маўляў, казаў жа я: прасьцей трэба, яшчэ прасьцей. Гані забаву. Дайце плебсу тое, што ён хоча чуць, і вы атрымаеце ад яго ўсё, што вам трэба атрымаць.

3 ліпеня, 9 траўня і Дні гораду ў Менску ператвараюцца ў калясальныя гулянкі. Заахвочаныя тэлебачаньнем, сотні тысяч жыхароў прадмесьцяў і прыгарадаў сьцякаюцца ў цэнтар сталіцы. Сюды едуць з Барысава й Шабаноў, каб выпіць на цэнтральным праспэкце і плюнуць на геаграфічны цэнтар Рэспублікі Беларусі. Хмель, поп і разгул — беларускі карнавал эпохі Лукашэнкі.

Абвешаныя біжутэрыяй дзяўчаты ў топіках зь меліраванымі валасамі; хлопцы ў спартовых штанах, закарэлыя пальцы зь вялікімі пярсьцёнкамі сьціскаюць пакецікі з гарэлкай, півам і запівонам. На салют зьбіраюцца не студэнты філярмоніі. Тут народ «папрошча». Твары людзей нібы сышлі з раманаў Эміля Заля. А можа, гэта баліварыянцы спусьціліся з горных шанхаяў у Каракас, каб падтрымаць свайго Чавэса.

Яны сьвяткуюць як паложана. Бо ўсе сьвяткуюць. Разам нас багата. Яны ўглядаюцца на далёкую сцэну. Лаў мі тунайт! Якое шчасьце — бачыць у бінокль Анжаліку, якая бачыла «Эўрабачаньне».

Чалавеку з багатым унутраным сьветам гэтае сьвята — зусім не сьвята. Прымітыў. Фанэрныя напевы скарасьпелай беларускай эстрады. Шарыкі, сьцяжочкі, выступы спартоўцаў на пэрыфэрыі. Міязмы, найбольш перагар. Рэляксацыя забясьпечваецца алькаголем. Гэта карнавал нашых дзён. Адно што ўлада не зьнікае на час карнавалу, як было ў сярэднія вякі. Яна над намі, яна скрозь і не дае сябе забыць. Гэта ў Вялікім Княстве на дзень усеагульнага расслабленьня жабрак мог стаць князем, а князь — блазнам. Менскі карнавал мае іншыя мэты — будзьце ўдзячныя таму, хто дорыць вам мір, стабільнасьць і сьвята. Ён тут, на сцэне.

9 траўня, 3 ліпеня, Дзень гораду — сьвяты-блізьняты, што праходзяць па аднолькавай схеме. Яны не беларускія ў тым сэнсе, якія надаюць слову «беларускае» чытачы «Нашай Нівы». Аднак такія сьвяты цалкам задавальняюць чаканьні натоўпу. Які, дарэчы, інакш як плебсам сапраўды не назавеш. Свабодныя людзі, але палітычна нічога ня значаць. Сваё права голасу яны мяняюць на хлеб і відовішчы.

«Чарка і скварка» — міна запаволенага дзеяньня пад Беларусь. Сучасная эканоміка трымаецца на разумным, мабільным і самастойным работніку, здатным адаптавацца да зьменлівае каньюнктуры ва ўмовах імклівага памнажэньня ведаў і тэхнічнага прагрэсу. Калі мы хочам мець канкурэнтаздольную эканоміку,


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Старым — Сталіна, моладзі — «Атлянтыку».

нам патрэбная кваліфікаваная працоўная сіла. А людзі зь нізкімі культурнымі і палітычнымі запатрабаваньнямі ня могуць быць эфэктыўнымі работнікамі ў высокатэхналягічным грамадзтве. Палітыка Лукашэнкі ўжо супярэчыць вымогам вытворчых адносінаў. Яна апраўданая толькі з пункту гледжаньня захаваньня надзённае палітычнае стабільнасьці. Уладзе выгадна, каб плебс меў сьціплыя культурныя запатрабаваньні. Трымаючы людзей у папсе і палітычным ідыятызьме, улада гарантуе поўны кантроль. Тыя, хто хоча больш за чарку і скварку, за такую ўладу не галасуюць, бачачы яе ўбоства.

Эканоміка патрабуе культурнага работніка, а нашы кіраўнікі захапляюцца кітайскай мадэльлю, што грунтуецца на наяўнасьці неабмежаванай колькасьці працоўных рук і традыцыях усходняй дэспатыі. У гэтым драма нашае малое эўрапейскае нацыі.

Усьмешку выклікаюць рапарты МУС пра спакойную атмасфэру падчас гуляньняў. Паркі былі ўсьцеленыя сьмецьцем, Сьвіслач прыняла сьмяротную дозу ПЭТ-бутэлек. Мінімальная колькасьць туалетаў ператварыла ў прыбіральні закуткі самых прэстыжных будынкаў гораду. Жыхары цэнтру звыкаюцца зь неабходнасьцю вывозіць дзяцей за горад на час «сьвята», жанчыны без патрэбы не пакідаюць кватэраў. Затое ў цэнтральныя пункты прыёму шклатары на раніцу панядзелка павыстройваліся чэргі шчасьлівых людзей, палова зь якіх кранальна трымала чырвона-зялёныя сьцяжочкі.

Гулянкі супалі з правядзеньнем у Менску IX Усеславянскага зьезду, на які сабраліся дэлегаты з тузіна краінаў, сярод якіх былі й прадстаўнікі славянства з Канады і Эстоніі. Дзяжурнымі вясельнымі маршалкамі былі дзяржсакратар саюзу Беларусі і Расеі Павал Барадзін і лідэр расейскіх камуністаў Зюганаў. Які першай справай памчаў пад Заслаўе, каб


PHOTO.BYMEDIA.NET

# два сьветы

паглядзець на «лінію Сталіна». Пра павагу ўлады да свайго народу («ён усё сха́вае») сьведчыць падача зьезду ў дзяржаўных мэдыях як «падзеі сусьветнага маштабу». У тэлежурналістаў не выклікалі ўсьмешак ні «казакі» ў сваёй блазенскай уніформе, што віталі дэлегатаў ля КЗ «Менск», ні харчаваньне ўсяго зьезду на менскай птушкафабрыцы №1.

Такой кашай з славянства і папсы, савецкасьці і спажывецтва кормяць лукашэнкаўцы свой электарат. Старым — Сталіна, моладзі — «Атлянтыку». Жары, пі ды раві пад салют. Меней думай.

Гарантуючы яму ўсё, у тым ліку і думаньне за яго, рэжым мусіць гарантаваць (і даваць!) усё болей. Ён бярэ на сябе тую частку праблемаў, якую людзі ў свабодным грамадзтве спакойна вырашаюць самі.

Велізарная маса ахмялелых людзей выпраменьвае калясальны зарад энэргіі. Плебс прагне відовішча. Натоўп — арганізм, якім лёгка кіраваць. Але аднойчы плебс можа абсьвістаць ня толькі старога сьпевака, але й старога кіраўніка. Уявіце карцінку: ён стаіць сівы, а плебс сьвішча…

Сёньняшняе пакаленьне беларусаў, якое ўлады сьвядома трымаюць у інфантыльным стане, заўтра можа стаць некантраляванай разбуральнай сілаю. І гэта робіць спакой у нашым мізэрным усеславянскім «Рыме» прывідным.

Дзеці пралетарыяту дзеляцца ўражаньнямі ў трамваі: «Ты Лукашэнку відзеў? Ён п'яны быў! Зь дзеўкамі зажыгаў. А ахрана якая!» Яны мадэлююць сытуацыю ў звыклых для сябе рэаліях. Раз танцаваў — значыць, п'яны. Яны захапляюцца Бацькам, як хацелі б захапляцца родным бацькам. Яны яўна ня першы раз выпіўшы. Праз год ім першы раз галасаваць.

**Андрэй Скурко, Сяргей Харэўскі**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Абаронцы Божага Дому

Будслаўскі фэст сабраў дваццаць тысяч чалавек. Добрая палова іх прыйшла ў госьці да Маці Божай пешкі. Ішлі й ішлі ў Буду пілігрымы. Маладыя, спаленыя сонцам, прытомленыя беларускімі дарогамі. Будслаўскі ксёндз і ягоныя калегі-суседзі завіхаліся, разьмяшчаючы гасьцей у парафіяльных вёсках. Адны Крывічы прынялі некалькі сотнь.

Кульмінацыяй паломніцтва стаў вечар 1 ліпеня. Групкі пілігрымаў на будслаўскім шляху зьліваліся, ператвараючыся ў натоўпы. Над галовамі ўспыхвалі бел-чырвона-белыя сьцягі, электрызуючы атмасфэру. Дзе ўздымаць нацыянальны сьцяг, як не на радзіме Паўліны Мядзёлкі й прэзыдэнта БНР Жук-Грышкевіча? Дзе, як ня побач зь першай беларускай гімназіяй? І сьцягі ўспыхвалі цягам усяго сьвята, хоць ахоўнікі дзяржаўнага спакою пільнавалі навідавоку: на страсе гаспадарчага будыначку побач з касьцёлам.

Дзеля нечуванага, нават у параўнаньні зь мінулымі гадамі, напльву людзей, давялося карэктаваць старадаўні звычай. Раней ахвяру ў скарбонку ля цудатворнай іконы несьлі, ідучы на каленях па каменных плітах касьцельнай падлогі. Сёлета, каб усе ахвотныя пасьпелі да пачатку начное службы, пакуту адмянілі: тыя дзесяць крокаў праходзілі ня кленчачы.

Яшчэ навіна: ад храму адагналі гандляроў. Яткі з трантамі й ежай-піцьвом гэтым разам стаялі воддаль.

Сьвята дае неблагі прыбытак парафіі. Трохсотгадовыя ж будынкі патрабуюць дагляду, як малыя дзеці. А чалавек, ахвяруючы на храм, працягвае спрадвечную эстафэту. Бярэ на сябе частку адказнасьці за сьвятыню, за калектыўную памяць, якая робіць сьціжму людзей адзіным народам. За Дом Божы і краіну, якія ня зь неба зваліліся, але мазалём тваіх бацькоў і тваім уласным мазалём на зямлі стаяць.

**Вацлаў Зьвяруга, Мядзел**

## Разбураны бастыён

У працяг тэмы, узьнятай Сяргеем Абламейкам у ягоным эсэ «Каханы горад», прыйшлі вось якія думкі.

«Вызваленьне Менску... было сьвятам ня толькі савецкага народу, але і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва. Бо палі сьцены яшчэ аднаго бастыёну, узьведзенага гітлераўскімі разбойнікамі для ўтрыманьня пад сваёй уладай захопленых зямель». («Краткая история», Москва, военное издательство МО СССР, 1965)».

Цікава, дзе ў сталіцы былі сьцены гэтага «бастыёну». Нешта нічога пра гэта не было чуваць. Відаць, «Правда» мела на ўвазе зусім іншае — падчас вайны нямецкія акупацыйныя ўлады спрыялі, разьлічваючы на выкарыстаньне ў сваіх мэтах, імкненьню беларусаў да нацыянальнага адраджэньня. Менавіта ў гэтай чарговай, кволай і відавочна непаўнацэннай беларусізацыі Сталін і ўбачыў магчымую перашкоду ў Беларусі сваім плянам стварэньня пасьля Перамогі маналітнай «савецкай» імпэрыі. А таму давершыць разбурэньне Менску падчас баявых дзеяньняў, апраўдваючыся тым, што ён падчас акупацыі быў ператвораны ў нейкі варожы «бастыён», было цудоўным шанцам дасягнуць сапраўднай мэты. Каб на месцы руін пабудаваць для беларусаў новую, «сваю» сталіцу.

**В.Глеб-Яцкоўскі, Менск**

## Сваім розумам

Беларусь не павінна быць зноў чым-небудзь прыдаткам, не павінна выконваць чыіхсьці патрабаваньняў як па магічным узмаху дубчыка. Мы павінны стаць нечым асаблівым, незалежнай ад чужой палітыкі дзяржавай, навучыцца трымаць правільны і ўсебакова ўзважаны кірунак эканамічнага, палітычнага і сацыяльнага жыцьця грамадзтва.

**Паліна Кабакова, Жодзіна**

## Новая менская тапаніміка

Галоўным у любым перайменаваньні мусіць заставацца прынцып нацыянальнага піетэту, які мае ў аснове нацыянальную ідэю.

Хачу прапанаваць уласныя назвы слынных месцаў Менску.

Кастрычніцкую плошчу варта перайменаваць у Цэнтральны пляц;

плошчу Перамогі — у Круглую плошчу, пагатоў гэта старая назва;

праспэкту Незалежнасьці трэба вярнуць імя Ф.Скарыны, бо асобе аўтара першай беларускай Бібліі, не пасуе «вулічны» маштаб;

праспэкту П.Машэрава / Пераможцаў варта вярнуць назву Паркавая магістраль, што больш пасуе прыгажосьці гэтых мясьцін;

плошчу Прытыцкага перайменаваць у Новы Двор (гістарычная назва мясьціны, дзе нарадзіўся беларускі паэт Алесь Гарун);

праспэкт Пушкіна — у праспэкт Алеся Гаруна;

вуліцу Прытыцкага — у Ракаўскі тракт (гістарычная назва);

плошчу Калініна — у плошчу Каліноўскага;

вуліцу Маякоўскага — у вуліцу Лошыцкую;

плошчу Камуны — у Тэатральную плошчу.

Вартыя перайменаваньня наступныя вуліцы: Бельскага, Леніна, Маркса, Мэльнікайтэ, Мясьнікова, Панамарэнкі, Сьвярдлова, Сямашкі, Цэткін, Чарвякова, Энгельса, Харужай, гэтак жа як і вуліцы Гвардзейская, Камуністычная, Сапёраў, Сацыялістычная. Праспэкты ж Машэрава і Партызанскі — бо гэта спадчына той самай камуністычнай эпохі, якая для нашай краіны мела больш выдаткаў, чым станоўчага.

Неабходна пазбавіцца вуліц Талстога, Маякоўскага, Някрасава, Ясеніна, Лермантава — ніхто з вышэйпералічаных ня меў ніякага дачыненьня да беларускай культуры і ня вызначыўся сваёй прысутнасьцю ў Менску.

Куды лепей увекавечыць наступныя імёны:

пісьменьнікаў Ф.Аляхновіча, Н.Арсеньневай, С.Буднага, В.Быкава, К.Буйло, В.Віткі, А.Вялюгіна, С.Грахоўскага, У.Дубоўкі, У.Жылкі, С.Палуяна, А.Пісьмянкова, Я.Пушчы, К.Сваяка, А.Сыса;

кампазытараў і сьпевакоў — М.К.Агінскага, Л.Александроўскай, У.Алоўнікава, М.Забэйды-Суміцкага, С.Манюшкі;

мастакоў В.Бялыніцкага-Бярулі, В.Ваньковіча, Я.Драздовіча, А.Ісачова, П.Сергіевіча;

актораў і рэжысэраў І.Буйніцкага, У.Галубка, Ф.Ждановіча, Е.Міровіча, П.Мядзёлкі, С.Станюты;

навукоўцаў М.Доўнар-Запольскага, М.Байкова і С.Некрашэвіча (трэба назваць вуліцу адной назвай за легендарны слоўнік), В.Іваноўскага, Б.Кіта, братоў Луцкевічаў, В.Ластоўскага,Б.Тарашкевіча;

палітыкаў і грамадзкіх дзеячаў — а сярод іх каго толькі ні было ў розныя часы: Я.Варонкі, Вітаўта, Гедыміна (дарэчы, ягоным імем варта было б назваць і сучаснае вайсковае вучылішча), В.Захаркі, Т.Касьцюшкі, П.Крэчаўскага.

Ёсьць жа яшчэ і тапанімія былых вёсак, фальваркаў, хутароў... Або імёны архітэктараў — непасрэдных стваральнікаў нашай сучаснай сталіцы. Але асаблівую ўвагу хочацца зьвярнуць на назвы станцый мэтро, бо Менск — першы беларускі горад, які мае гэтую цывілізацыйную «штучку».

Прапаную перайменаваць наступныя станцыі мэтро:

«Плошчу Леніна» — на «старую новую» назву «Плошча Незалежнасьці»,

«Кастрычніцкую плошчу» — у «Цэнтральную плошчу»,

«Плошчу Перамогі» — у «Круглую плошчу»,

«Парк Чалюскінцаў» — у «Батанічны сад»,

«Маскоўскую» — у «Кінастудыю «Беларусьфільм»,

«Спартыўная» — у «Ракаўскую»,

«Пушкінскую» — у «Новы Двор»,

«Маладзёжную» — у «Кальварыйскую»,

«Фрунзэнскую» — у «Замкавую»,

«Партызанскую» — у «Даўгабродзкую»,

«Захад» — у «Цівалі».

Тое самае варта зрабіць мо і з назвамі мікрараёнаў, бо цалкам «індыфэрэнтныя» назвы «Паўднёвы Захад» альбо «Ўсход» ня маюць ніякага дачыненьня да гісторыі ні гораду, ні краіны. Што ўжо казаць пра такія назвы вуліц, як Інтэрнацыянальная, Ленінградзкая, Ангарская, Маскоўская. Няўжо, акрамя Ангары, у ваколіцах гораду няма сваёй «азёрна-рачной» тапаніміі! Сапраўды, глупства суцэльнае атрымоўваецца, дый толькі: не беларуская сталіца, а нейкі суцэльны збор рэліквій савецкага аўтарытарнага часу! Бо толькі адна з савецкіх назваў на сёньня, як і раней, адпавядае свайму існаму сэнсу, — гэта вуліца Валадарскага, славутага ката АГПУ, дзе як тады, так і цяпер пакутуюць беларускія патрыёты!

Таму галоўным у любым перайменаваньні мусіць заставацца прынцып нацыянальнага піетэту, які мае ў аснове нацыянальную ідэю ды спрыяе ўсталяваньню нацыянальнага сьвядомага пачатку ў мэнтальнасьці народу.

**Ян Белакрыўскі, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# Андрэй Стратан: «Найважнейшая мэта Малдовы — інтэграцыя ў Эўразьвяз»

Эксклюзіўнае інтэрвію міністра замежных спраў і эўрапейскай інтэграцыі Рэспублікі Малдова. З Андрэем Стратанам гутарыць **Раман Якаўлеўскі**.



WWW.VREMEA.NET

**— У Кішынёве адкрылася прадстаўніцтва Эўразьвязу. Якія першачарговыя задачы стаяць перад Рэспублікай Малдовай у сфэры яе інтэграцыі ў ЭЗ?**

— Хацеў бы ўдакладніць, што ў Малдове пакуль няма пастаяннага спэцпрадстаўніцтва ЭЗ, але з пачатку году Рада ЭЗ прызначыла спэцпрадстаўніка ў Малдове, місія якога — актыўнае спрыяньне мірнаму разьвязваньню прыднястроўскай праблемы і стабільнасьці ў рэгіёне. У верасьні ў Кішынёве распачнецца работа Дэлегацыі Эўракамісіі, заканчваецца распрацоўка Эўрапейскай стратэгіі РМ, якая прадстаўляе яшчэ больш дэталізаваны праект па ажыцьцяўленьні прыярытэтнай мэты малдаўскай унутранай і замежнай палітыкі.

Што наконт дасягненьня Малдовай найважнейшае мэты — інтэграцыі ў структуры ЭЗ. Краіна ўзяла на абавязацельствы выканаць да канца 2007 году захады, прадугледжаныя ў пляне дзеяньняў «Малдова—ЭЗ», а менавіта: мірнае ўрэгуляваньне прыднястроўскага канфлікту; далейшае ўмацаваньне стабільнасьці і эфэктыўнасьці інстытутаў, якія служаць гарантыяй дэмакратыі і вяршэнства закону; дэмакратычнае правядзеньне выбараў у адпаведнасьці з эўрапейскімі стандартамі; забесьпячэньне свабоды прэсы і выказваньня думак; паляпшэньне інвэстыцыйнага клімату і шэраг іншых прыярытэтаў.

**— Малдова — адзіная краіна з «новых суседзяў» ЭЗ — чалец СГА. Наколькі гэты статус можа дапамагчы ёй у эўраінтэграцыі?**

— Членства ў СГА ўключае шэраг абласьцей, якія супадаюць з правіламі і заканадаўствам адзінага рынку ЭЗ: дзяржаўнае набыцьцё, інтэлектуальная ўласнасьць, празрыстасьць і правілы гандлю паслугамі. Плян дзеяньняў «Малдова—ЭЗ» дае значную ступень эканамічнай інтэграцыі і больш паглыбленае палітычнае супрацоўніцтва, а таксама магчымасьць забесьпячэньня больш шырокага доступу малдаўскіх тавараў на рынак ЭЗ з дапамогай аўтаномных гандлёвых ільгот.

**— Дачыненьні ЭЗ зь Беларусьсю пакідаюць жадаць лепшага. Як Вы ахарактарызуеце цяперашні стан стасункаў Малдовы з нашай краінай?**

— Аснова дачыненьняў — цесныя гандлёва-эканамічныя сувязі. Беларусь займае 6-е месца сярод 128 гандлёвых партнэраў Малдовы. Летась агульны таваразварот між краінамі склаў $142 млн, што на 26% больш, чым у 2003 г. Малдова імпартуе нафтапрадукты, трактары, керамічну плітку, бітум, лядоўні, лекавыя сродкі, палімэры этылену, запчасткі для аўтамабіляў і трактароў, ДВП, шыны. Летась на гарадзкія лініі Бэлца ўпершыню выйшлі тралейбусы прадпрыемства «Белкамунмаш». Для перааснашчэньня прадпрыемстваў Малдовы пачаліся пастаўкі мэталаапрацоўчых станкоў, у мэдустановах зьявіліся беларускія мэдыцынскія прылады.

Артыкуламі экспарту ў Беларусь зьяўляецца плодагароднінная прадукцыя, вінна-каньячныя вырабы, насенная і фуражная кукуруза, сланечнікавы алей.

Не забудземся на традыцыйна добрыя сувязі нашых народаў. Мы падтрымліваем імкненьне беларусаў Малдовы (у краіне жыве 20 тыс. беларусаў. — «**НН**») у захаваньні культуры, нацыянальнай самабытнасьці і традыцый, вывучэньні гісторыі і мовы роднай краіны.

**— Лідэры краін ГУУАМ заяўляюць, што гэтай арганізацыі надаецца новы дынамізм і яе роля на постсавецкай прасторы будзе ўзрастаць. Як Малдова ставіцца да пэрспэктыў існаваньня СНД?**

— У рамках красавіцкага саміту ГУАМ у Кішынёве, прэзыдэнты Азэрбайджану, Грузіі, Малдовы і Украіны прынялі рашэньне актывізаваць дзеяньні ў рамках аб'яднаньня, акрэсьліўшы прыярытэтамі разьвіцьця супрацоўніцтва ў стратэгічна важных сфэрах: энэргетыка, бясьпека, супрацоўніцтва зь міжнароднымі арганізацымі і краінамі ЭЗ альбо кандыдатамі на ўступленьне ў Зьвяз. У той жа час гэта не пярэчыць супрацоўніцтву ГУАМ з краінамі СНД.

**— Паводле Канстытуцыі, Малдова — нэўтральная дзяржава. Як гэта палажэньне стасуецца зь яе імкненьнем уступіць у NATO?**

— На афіцыйным узроўні Малдова не рабіла заяў пра імкненьне ўступіць у NATO. Наша асноўная мэта — пашырэньне і паглыбленьне супрацоўніцтва з альянсам, але пра перагляд статусу нэўтралітэту гаворкі пакуль няма. NATO дапамагае нам у рэалізацыі некалькіх праектаў — зьнішчэньні шкодных пэстыцыдаў, што засталіся з ранейшых часоў і наносяць шкоду экалёгіі. Дзякуючы дапамозе NATO Малдова адной зь першых дзяржаў цалкам зьнішчыла запасы проціпяхотных мін у адпаведнасьці з палажэньнямі Атаўскай канвэнцыі. Як бачыце, карысьць ад супрацоўніцтва ёсьць, і мы імкнёмся яе павялічыць.

**— Якую сёлетнюю падзею Вы лічыце найважнейшай для Малдовы?**

— У апошнія гады малдаўская замежная палітыка актывізавалася, зрабілася больш пасьлядоўнай і выразнай. Эўрапейская інтэграцыя, працэс рашэньня прыднястроўскага канфлікту, падтрыманьне актыўных сувязяў з традыцыйнымі партнэрамі і разьвіцьцё дачыненьняў з новымі — дыяпазон дастаткова шырокі. І на кожным з гэтых напрамкаў будуць адбывацца важныя падзеі. А сярод найбольш значных дыпляматычных мерапрыемстваў хачу назваць верасьнёўскі саміт дзяржаў у рамках 60-й сэсіі Генасамблеі ААН

**Раман Якаўлеўскі, міжнародны партал «Wider Europe»**

# Маўчаньне жанчын

Пры ўсіх радыкальных адрозьненьнях між уладай і апазыцыяй іх аб'ядноўвае аднолькава абыякавае стаўленьне да жанчынаў. Жанчына застаецца «нябачнаю» ў беларускім грамадзтве. Зь філёзафам **Альміраю Усманавай** гутарыць **Андрэй Расінскі.**

**«НН»: Спадарыня Ўсманава, Вы працуеце ў Цэнтры гендэрных дасьледаваньняў пры Эўрапейскім гуманітарным унівэрсытэце, які займаецца жаночымі сацыяльнымі і гістарычнымі дасьледаваньнямі. Для паспалітага чалавека жаночыя дасьледаваньні здаюцца нечым надуманым. Хіба жанчына не абсалютна раўнапраўна прадстаўленая ў грамадзтве?**

**Альміра Ўсманава:** З аднаго боку, жанчына быццам бы прадстаўлена паўсюль, нават у парлямэнце, але гэта не азначае, што жанчына выступае як актыўны суб'ект, здольны прымаць рашэньні ў гісторыі, мастацтве, палітыцы. Вазьміце выяўленчае мастацтва: жанчыны да нядаўняга часу разглядаліся як пасіўны аб'ект чужога позірку, намаляваны мужчынамі і для мужчын. А паспрабуйце назваць жанчын-мастакоў. Калі вы іх ня ведаеце, гэта ня значыць, што жанчыны неталенавітыя, — проста ёсьць гістарычная грамадзкая практыка стварэньня «нябачнасьці»… Нешта падобнае і ў астатніх сфэрах.

**«НН»: Вы кажаце пра «нябачнасьць жанчын»? А як жа сьвята 8 Сакавіка?**

**АУ:** 8 Сакавіка — карнавальная падзея, калі мужчына і жанчына могуць памяняцца ролямі. Дзень, калі гераічны мужчына можа апрануць кухонны фартух без пагрозы, што яго прызнаюць нямужным. Але гэта толькі аднадзённае «сьвята непаслухмянасьці». Назаўтра ўсё вяртаецца да звыклых герархій. Лепей прыгадаць, што гэта дзень палітычнай салідарнасьці жанчын, што ня ўсё ў грамадзтве добра і ідэі раўнапраўя яшчэ ня зьдзейсьніліся.

**«НН»: А як зьмянялася жанчына ў беларускай гісторыі?**

**АУ:** Цікавей за ўсё паглядзець на XX ст., на савецкія практыкі. У 1920-х гадах можна знайсьці адказ на шматлікія пытаньні: тут і дзіўная трансфармацыя сьвята 8 Сакавіка, і адказ, чаму нашы грамадзяне так адмоўна ставяцца да ідэі раўнапраўя, і наша ўспрыманьне шэрагу нормаў і правілаў як натуральных, хаця для свайго часу яны былі выключнымі. Сёньня мы ўспрымаем разводы, дэкрэтныя адпачынкі як нешта, што нам проста абавязаны былі даць. Але гэта былі рэвалюцыйныя трансфармацыі, якія адбываліся ня так даўно. Увогуле, сёньняшнія жанчыны і мужчыны — гэта вынікі сацыяльнага канструяваньня полу, якое адбывалася з часоў Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ломка рэлігійных нормаў, ломка традыцыйнай сям'і, выхад жанчыны ў публічную прастору, дазвол на шэраг прафэсій — усё гэта рэчы, якія прысутнічаюць у нашым жыцьці, але яны ня дадзены нам ад прыроды і маюць сваю гісторыю.



Юлія Дарашкевіч

**«НН»: А якія сёньня пануюць стэрэатыпы?**

**АУ:** Старыя стэрэатыпы таксама застаюцца. Але калі паглядзець на рэклямныя вобразы, якія нам прапануюць, — пераважна эўрапейскія, — то яны прапітаныя постфэміністкім духам. Там няма дакладнага мэсыджу і ёсьць новыя ўяўленьні аб сэксуальнасьці, раўнапраўі полаў, маскулінасьці. Гэтыя пасланьні размытыя, адрасат іхні няпэўны, хісткі. Кампанія «Ікеа» нядаўна прапанавала ў рэкляме слоган, ідэя зьмены біялягічнага полу некалькі год таму падалася б проста неймавернай. Для сучаснага чалавека ідэя зьмены полу не ўспрымаецца як нешта абсалютна немагчымае і абсалютна табуяванае. Так што нават рэкляма дазваляе сабе быць двухсэнсоўнай.

**«НН»: Я зьдзіўлены меркаваньнем, што і ўлада, і апазыцыя аднолькава рэпрэсіўныя да жанчыны…**

**АУ:** Гэта так. Для мяне гэта сур'ёзная і цікавая для дасьледаваньня тэма, бо пры ўсіх радыкальных адрозьненьнях між уладай і апазыцыяй іх аб'ядноўвае аднолькава *абыякавае* стаўленьне да жанчыны. З аднаго боку, прэзыдэнт шмат гаворыць пра жанчын, адкрывае радзільні, патрабуе 30% для жанчын у парлямэнце. З другога боку, апазыцыя *нічога* не гаворыць пра жанчын. Гэтае рытарычнае адрозьненьне хавае галоўнае: выціснутасьць жанчыны на пэрыфэрыю.

Прэзыдэнт можа колькі хоча гаварыць пра ролю жанчын у парлямэнце, але гэта зусім ня значыць, што палітычна актыўныя жанчыны будуць здольныя прымаць там якія-небудзь рашэньні. А для апазыцыі гэта вельмі сур'ёзны і ўпушчаны козыр, страчаны шанец. Калі б удалося сфармуляваць дакладную праграму для жаночага электарату, то можна было б зьмяніць палітычную сытуацыю ў іншы бок.

У выпадку ўлады ёсьць непрыхаваная маніпуляцыя жаночым пытаньнем, дэкаратыўнае вырашэньне жаночых праблем, у выпадку апазыцыі — непрыхаванае ігнараваньне.

**«НН»: Статыстыка сьведчыць, што жанчыны — электарат Лукашэнкі… Яны яго падтрымліваюць.**

**АУ:** Апазыцыя нават не прыклала высілкаў, каб разабрацца, чаму жанчыны і пэнсіянэры галасуюць так, а не інакш, і як можна гэтую сытуацыю пераламіць… Чаму жанчыны галасуюць за Лукашэнку? Яны галасуюць ня столькі за яго, колькі за ідэю сацыяльнай дзяржавы і за ўласную стабільнасьць і спакой. Яны галасуюць за сукупнасьць прынцыпаў, якія гэты рэжым уголас абвяшчае.

Чаму не выбіраюць апазыцыі? Яна атаясамліваецца з ідэяй рынку, лібэральнай дэмакратыі — гэта значыць, чакаецца адыход ад сацыяльнай дзяржавы, прынамсі, напачатку. Прыход апазыцыі як лібэральнай дэмакратыі да ўлады азначаў бы для вялікай колькасьці жанчын страту і без таго нязначных прывілей і фінансавых паступленьняў — ня факт, што так будзе, але так успрымаецца.

Чаму жанчыны галасуюць за Лукашэнку? Яны галасуюць ня столькі за яго, колькі за ідэю сацыяльнай дзяржавы і за ўласную стабільнасьць ды спакой — за ўсё, што ім дала савецкая ўлада і што яны страцілі ў 1990-я, калі праблемы сям'і ператварыліся ў справу асабістай адказнасьці жанчыны. Яны галасуюць за сукупнасьць прынцыпаў, якія гэты рэжым уголас абвяшчае. Жанчыны галасуюць за сацыяльную дзяржаву.

**Альміра Ўсманава** — супрацоўнік Цэнтру гендэрных дасьледаваньняў, да нядаўняга часу дацэнт катэдры культуралёгіі і мастацтвазнаўства ЭГУ. Дырэктар праекту па культурных і візуальных дасьледаваньнях. Нарадзілася ў Асіповічах (Магілёўшчына). Кандыдат філязофскіх навук. Стажавалася ў ЗША, Францыі, Італіі і Нямеччыне. Аўтарка і ўкладальніца кніг «Умбэрта Эка: парадоксы тлумачэньня», «Гендэрныя гісторыі Ўсходняй Эўропы» (разам з Аленай Гапавай) «Бітэкстуальнасьць і кінэматограф» ды інш.

**«НН»: У жанчын ёсьць манаполія на нараджэньне, мужчыны кампэнсуюць гэта манаполіяй на забойства. Ці варта жанчынам дамагацца й гэтай манаполіі?**

**АУ:** У СМІ жанчына сапраўды прадстаўлена чалавекам, які заўжды будзе абараняць жыцьцё, а мужчына паказваецца воінам, разбуральнікам. Але мне здаецца, гэта спрошчаны падыход.

**«НН»: Сёньня гендэрныя дасьледаваньні, якія высьвятляюць сацыяльныя асновы полу і робяць чутнымі галасы рэпрэсаваных жанчын, злучаюцца з посткаляніяльнымі пошукамі. Як і чаму такое адбылося?**

**АУ:** Тут няма нічога дзіўнага: гендэрныя дасьледаваньні злучаюцца з посткаляніяльнымі, зь левымі і з «black studies» — дасьледаваньнямі расізму, таму што ва ўсіх гэтых выпадках ёсьць спроба даць выказацца тым, хто ня меў да гэтага такой магчымасьці. Даць права гаварыць пра саміх сябе — гэта тое, што ўсе гэтыя дысцыпліны збліжае. Што да гендэрных і посткаляніяльных дасьледаваньняў, то за апошнія 20 год паказана, што каляніяльныя рэпрэсіі абавязкова ўключаюць у сябе і гендэрную няроўнасьць.

**«НН»: У такім выпадку гендэрныя дасьледаваньні мусяць быць надзвычай каштоўныя для Беларусі як каляніяльнай краіны…**

**АУ:** У мяне няма ўпэўненасьці, што Беларусь можа быць прадметам посткаляніяльных дасьледаваньняў. Беларусь, хутчэй, *постсавецкая* краіна, а ня посткаляніяльная. Савецкая мадэрнізацыя вельмі моцна адрозьнівалася ад таго, што рабіў капіталістычны Захад у Афрыцы і Індыі. І гэта розныя формы ўзьдзеяньня. Але я лічу, што бяз гендэрнага складніку гісторыю ўвогуле зразумець складана, тым болей гісторыю з такім праблематычным спалучэньнем розных парадкаў — савецкага, расейскага, польскага…

**«НН»: Беларуская культура рэпрэсаваная. Беларуская мова ў загоне. Жанчыны таксама рэпрэсаваныя. Ці ня ёсьць псыхалёгія беларуса жаночай псыхалёгіяй?**

**АУ:** Кожны раз, калі прыгнечаную — у якога недастатковa ўлады, голасу, магчымасьцяў для рэалізацыі — трэба адчуць сябе чалавекам, ён знаходзіць яшчэ больш прыгнечанага і рэалізуе свае амбіцыі. Стан Беларусі няпросты, але заўжды знойдзецца нехта яшчэ слабейшы. Ня столькі Беларусь зьяўляецца жаноцкаю, колькі жанчына нязьменна ўспрымаецца як прыгнечаная, падпарадкаваная, слабая.

**«НН»: Калі нейкая група прыходзіць да ўлады, яна перастае быць рэпрэсаванай і піша гісторыю па-свойму. І гэта гераічнае — і мужчынскае! — апавяданьне. Ці не выходзіць, што жаночыя галасы — гэта заўжды гісторыі пераможаных?**

**АУ:** Няроўнасьць непазьбежная пры любой сыстэме — сацыялізм, капіталізм, каляніялізм, посткаляніялізм і г.д., — але спрабаваць палепшыць наяўны парадак нам нішто не перашкаджае. І калі жаночыя галасы ці галасы іншых дыскрымінаваных груп будуць чуваць болей, чым гэта было ўчора, то гэта будзе набліжэньнем да мэты.

# XX стагодзьдзе вяртаецца


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Лета. Адгрукаталі «Млыны», адтупалі «Маманты». Хто робіць моду ў нашым царстве? Што актуальна ў гэтым сэзоне?» Піша стыліст **Сьвятлана Длатоўская**.

У Беларусі няма ні прафэсійнага, ні папулярнага часопісу, цалкам прысьвечанага модзе. Таму скарыстаемся распрацоўкамі Беларускага цэнтру моды для айчынных вытворцаў адзеньня «Fashion trends» (тэндэнцыі моды) — вясна—лета-2005», — каб даведацца, з кім прапануецца сябе параўноўваць і куды рушыць гэтым летам.

Сёньня жанчына марыць пра рэтра, дух *deco*, эпоху джазу. Там, дзе ўвечары зьзяюць глямурныя строямі галівудзкіх зорак часоў «вялікага нямога», а на ранішнюю гарбату выходзяць у адмысловай сьветлай паветранай сукенцы з «рамантычных 30-х».

## Добрая дзяўчынка

У тыя часы якраз быў запачаткаваны культ спартовага адзеньня, пашырыліся баварскія і — як альтэрнатыва ім — лацінаамэрыканскія матывы, настальгія па віктарыянскай Англіі. У 1930-х нарадзіўся стыль «а-ля гарсон». Гэта маленькая чорная сукенка Шанэль і яе штодзённыя трыкатажныя касьцюмы, малюнкі да якіх распрацоўваў мастак зь дзіўным для шараговага француза імем Ільля Зданевіч.

Актуальнымі застаюцца павевы 1950-х — залатых часоў «haute couture». Гэта вяртаньне вытанчанай жаноцкасьці, зварот да адзеньня экстраклясы, сапраўднага мастацтва пашыву. Тут і «нью-лук» Дыёра з адточанымі сылюэтамі і — яму насуперак — позьняя Шанэль з мадэлямі «па-за часам, модай для любой жанчыны». Дадамо таксама Баленсіягавы вечаровыя «скульптурныя» сукенкі.

На зьмену банальным вобразам «мужчынападобнай» жанчыны і «звышсэксуальнай мужчынаедкі» вярнуліся «добрыя дзяўчаткі», пра што сьведчаць спадніцы-клёш да каленяў, кансэрватыўныя жакеты і элястычныя швэдры з V-падобным выразам.

Вярнуўся таксама клюбны пінжак 1980-х. Сёньня гэта — «сымбаль новага пакаленьня жанчын-работніц: двухбортны, з гербам на кішэні і зашпількай на тры рады тыповых для мужчынскага адзеньня пазалотных гузікаў». Апроч «добрых дзяўчатак», актуальныя вобразы «фэй і німфаў з думкамі такімі чыстымі і празрыстымі, што падзьме ветрык — і яны зьляцяць», і каляністак, захопленых сафары ды прыгодамі.

## Модна ўсё, што з Амэрыкі

Сёлета агучваецца лёзунг: «Модна ўсё, што з Амэрыкі!» Галоўнае, жанчыне трэба вызначыцца — за каўбояў яна ці за індзейцаў. Стыль «вэстэрн» носіць рамантычны налёт: каўбойскія боты з карункавымі сукенкамі, а індзейскае пончa — з калготкамі ў кветачкі.

Новы летні сэзон прасякнуты пачуцьцёвасьцю і адчуваньнем гарачага надвор'я. Мастакоў натхняюць разагрэтыя камяні, пясок і высушаныя на сонцы снапы саломы, пыл і зямля. Калі вада, то хвалістая, непразрыстая і чысьцюткая, зьменлівая, як у ф'ёрдах і каналах Поўначы.

У колерах асаблівая ўвага надаецца шэраму, які, хутчэй, зьдзіўляе, чым пераконвае ў сваёй нэўтральнасьці. Палітра халаднаватая і паветраная з дымчатымі тонамі пары, спалучэньнямі шэрага і карычневага — «птушынымі» афарбоўкамі.

## Герой нашага часу

Гэта гарадзкі жыхар, жыцьцё якога «працякае пад зласьвесным штармавым небам і грознымі хмарамі ў гарадзкім краявідзе — часткова старасьвецкім, часткова з будучыні». Абарона ад усіх навал прымушае экспэрымэнтаваць з рознымі паверхневымі пакрыцьцямі: тканіны з эфэктам аліўных плямаў на вадзе, выгараньня, глыбокай карозіі і разбурэньня.

Модны мужчына лета-2005 трохі жаноцкі, бы мастак з Манмартру, і разам з тым нагадвае тыповага жыхара мястэчка Сярэдняга Захаду ЗША. Ён ратуе ад усіх напасьцяў, прымае сонечныя ванны, а потым наведвае каліфарнійскую вечарынку ля басэйну, назіраючы за гульнёй адбіткаў сьвятла на мокрай кафлі.

## Паміж Дэлёнам і Брусам Лі

Наш герой пераборлівы ў колерах: у яго гардэробе цёплыя нэўтральныя тоны пустэльні, дымчатыя, палевыя з блакітнымі і тонкімі ружова-бэзавымі адценьнямі, вішнёвы, колер фуксіі. А яшчэ мужчыну немагчыма ўявіць улетку без паласатай кашулі і ўніформы. Апошняя можа быць мяккай і неагрэсіўнай, зь мінімумам «вайсковых» дэталяў, вытрыманая ў шакалядным і цукеркавым колерах, а таксама нагадваць спэцпрыкід з фантастычнымі наваротамі, высокатэхналягічнымі апрацоўкамі, галяграмамі і пэрфарацыямі. У адрозьненьне ад бясклапотнай сучасьніцы, наш абаронца ведае, *што* дапаможа выжыць у эпоху тэрарызму і зьменлівых вірусаў.

Элегантны вобраз мужчыны вагаецца паміж Рыўерай ды Аленам Дэлёнам 1970-х і стылем Бруса Лі: шырокія плечы, зацягнутая талія, клёшы і адпаведныя аксэсуары — сонечныя акуляры лётчыка, шыйная хустка і вельмі тонкія раменьчыкі. Колеры мяккія, пяшчотныя палевыя і атмасфэрныя шэрыя дадаюць настрою тонкай раскошы. Дарэчы будзе ружовы колер аголенага цела, мяккі цытрынава-жоўты і халаднаваты нэўтральны колер кіту. Можна дадаць крыху каштоўнага мэталу (ён, хутчэй, стрымана зьзяе, чым жудасна паблісквае): срэбра, плаціна, а таксама колер алавянага посуду.

## Што такое мода

Функцыі моды (а іх тры — рэгулятар сьвядомасьці, паказчык сацыяльнага статусу, паказчык эстэтычнай каштоўнасьці) могуць быць інтэрпрэтаваныя як адлюстраванае ў адзеньні стаўленьне чалавека да сябе, да іншых, да сьвету ўвогуле. Што да стасункаў з сабой любімым/любімай, то яны падаюцца проста трапяткімі і ашчаднымі. Што да адносінаў зь іншымі, то «яс» погляд падаецца больш таленавітым, а «яго» — усё такім жа дакучліва-традыцыйным. Апранутая ў сукенку а-ля «DECO», яна і сама ня больш за дарагі дэкор у ягоным жыцьці. Мода ніколі не гаворыць ні пра каханьне, ні пра гора. У адносінах са «сьветам увогуле» відавочны акцэнт на настальгіі па мінулым, якое наўрад ці стане цалкам «сваім», нават калі праштудыяваць усе падручнікі па гісторыі, у тым ліку па гісторыі моды. Звышзадача для будучыні падаецца адназначнай: выжыць.

## А што ў маладых

Як паказалі апошнія фэстывалі, у нас хапае пэрспэктыўных мастакоў. Асобныя калекцыі, паказаныя 24 чэрвеня на абароне дыплёмных праектаў выпускнікоў катэдры мадэляваньня адзеньня і мастацкага тэкстылю Беларускай акадэміі мастацтваў, атрымалі прызнаньне і на міжнародным узроўні. Але большую цікавасьць выклікаюць тэмы і кірункі пошуку, якія лічацца вызначальнымі. Навасьпечаны мастак (як мадэльер, так і тэкстыльшчык) услухоўваецца ў гукі старога Менску, пераасэнсоўвае паганскія вобразы і сымбалі, спрабуе адчуць сябе нечым значным і адметным у сусьветнай сталіцы Моды, не згубіцца на карнавале ў Вэнэцыі і адначасова стаць яго арганічнай часткай. Маладая жанчына параўноўвае свой творчы патэнцыял з унёскам у культуру такіх папярэднікаў, як паэты «сярэбранага веку», шукае прывабных вобразаў і зручных рэчаў для сваіх будучых дзяцей, яна хоча ляцець, распусьціўшыся ў паветры, і жыць на сваёй зямлі ў згодзе зь яе прыродай і гісторыяй. Пакуль яшчэ хоча.

**Герой лета** пераборлівы ў колерах: у ягоным гардэробе цёплыя нэўтральныя тоны пустэльні, дымчатыя, палевыя з блакітнымі і тонкімі ружова-бэзавымі адценьнямі, вішнёвы, колер фуксіі. А яшчэ паласатыя кашулі і ўніформы.

Галоўнае вызначыцца — за каўбояў Вы ці за індзейцаў.

**На зьмену «звышсэксуальнай мужчынаедкі»** вярнуўся вобраз «добрай дзяўчынкі»: спадніцы-клёш да каленяў, кансэрватыўныя жакеты і элястычныя швэдры з V-падобным выразам.

# Агрэст

Расьліна, безь якой цяжка ўявіць сёньня беларускі гародчык. Учэпістае, калючае кустоўе, зь ня дужа прывабнымі, на першы погляд, ягадамі. Агрэст, у гэтым сэнсе, вельмі беларуская расьліна. Дужа партызанская. Ласуецца **Зьміцер Дзядзенка**.

Слоўнікі пазначаюць агрэст (Grossularia) як «род кустовых расьлінаў сямейства агрэставых». Паўднёвая з паходжаньня расьліна (яе радзіма — Каўказ і Міжземнамор’е) настолькі добра абжылася ў нашых шыротах, што набыла эпітэт «паўночнага вінаграду». І нездарма: віно з агрэсту, пра што гаворка пойдзе ніжэй, мае вельмі прыемны смак.

З больш як 50 відаў агрэсту ў нас культывуецца агрэст адхілены, або эўрапейскі (G. reclinata), родапачынальнік большасьці культурных гатункаў — ягадны шматгадовы кустарнік вышынёй да 120 см з парасткамі, пакрытымі шыпамі. Дзікі агрэст, дарэчы, зрэдчас можна сустрэць на схілах, сярод хмызнякоў.

Наконт назвы агрэсту ёсьць некалькі меркаваньняў. Паводле аднаго зь іх, назва *агрэст* дасталася нам ад вядомых гурманаў — французаў: *groseillier a maquereaux* — «парэчкі для макрэлі», называюць яна ягады (у французскай кухні гатуюць макрэль у агрэставай поліўцы). Паводле другой вэрсіі, назву агрэсту, як і назву гарбаты, напрыклад, «падарылі» нам палякі, узяўшы яе з лаціны: польская назва *agrest* паходзіць ад лацінскага *agrestis* — дзікарослы, палявы, вясковы.

Ёсьць і трэцяя вэрсія назвы. «Агрыз» — такую назву расьліны захавалі старадаўнія пісьмовыя помнікі ўсходніх славянаў. Магчыма, наш «агрэст» паходзіць акурат ад гэтага слова. Пагатоў, што гісторыя агрэсту ва ўсходніх славянаў даўжэйшая, чым у Заходняй Эўропе. Нашыя продкі елі й вырошчвалі «паўночны вінаград» яшчэ ў XI ст. Эўрапейцы ж рассмакавалі ягады толькі ў XIII ст.: тады агрэст пачаў пашырацца ў Францыі. А рассмакаваўшы, упадабалі куды больш, чым нашыя продкі: заняліся вырошчваньнем і вывядзеньнем новых гатункаў. Так, у Брытаніі XVI ст. часоў Гэнрыха VIII і ягонай дачкі Элізабэт (у нас тады ўладарылі апошнія Ягайлавічы — Жыгімонт Стары ды Жыгімонт-Аўгуст) былі выведзены сорт памерам зь сьліву. Не беручы за прыклад французаў, ангельцы з агрэсту рабілі найперш поліўку для смажанага гуся. Адсюль і назва — gooseberry, гусіная ягада.

Так і атрымалася, што агрэст да нас прыйшоў другі раз — цяпер ужо ў XIX ст. з Заходняй Эўропы. Заходнеэўрапейскія гатункі сталі культывавацца паўсюдна. Тады да нас патрапілі й сталі традыцыйнымі гатункі ангельскі жоўты (ягады зеленавата-жоўтыя на пачатку высьпяваньня, сьпелыя маюць бурштынава-жоўты колер), варшаўскі (сьпелыя ягады маюць чырвоны колер), зялёны бутэлечны (цёмна-зялёныя ягады з чырванавата-брунатнымі кропкамі па жылках, ня маюць валаскоў). У «Літоўскай гаспадыні» Ганны Цюндзявіцкай (XIX ст.) згадваецца спосаб захаваньня агрэсту на зіму. Захаваныя ягады выкарыстоўваюць для пенак: іх вараць у вадзе да мяккасьці, праціраюць праз сіта, атрыманым мармэлядам запраўляюць пенкі, узьбітыя зь бялкоў, дадаючы ваніль. У кнізе Вінцэнтыны Завадзкай «Кухарка літоўская», асноўная частка якой была складзеная ў 1870 г., згадваюцца канфітуры, кісель і галярэтка з агрэсту.

Ямчэ адно «агрэставае» імя, якое нельга прамінуць, — Іван Сікора. Гэты настаўнік пасьля таго, як у 1927 г. польскія ўлады забаранілі яму працаваць паводле спэцыяльнасьці, заняўся садаводствам і атрымаў у гэтай галіне вялікую вядомасьць. Гатунак агрэсту «Сікора 200», выведзены ім, расьце на сядзібе Мічурына.

Але вернемся ад садаводства да кулінарыі. За час асваеньня агрэсту беларуская кухня пасьпела распрацаваць колькі рэцэптаў, ня горшых за французскія ці ангельскія. З агрэсту й часныку з сольлю можна прыгатаваць смачную прыправу для мясных страваў (захоўваць толькі ў халадзільніку). Сушаныя ягады ўжываюць для прыгатаваньня мясных і рыбных соўсаў.

Апрача разнастайных полівак і салодкіх прысмакаў, ужываюць агрэст і ў «дарослых» рэцэптах. Вельмі добра ягады прыдаюцца для вырабу сярэдніх і цяжкіх вінаў кшталту шэры, мадэры, такаю, марсалы й г.д. Дэсэртныя віны, выробленыя з агрэсту, паводле смаку й букету падобныя да вінаграднага херасу. Пры гэтым варта ўлічваць, што для вырабу віна (як і для варкі кампотаў) найчасьцей бяруць сьпелыя ягады, а вось для канфітураў і сочыва можна выкарыстоўваць і зялёныя.



**Зьміцер Дзядзенка** (нар. у 1972) — журналіст, літаратар.



### Агрэставая галярэтка

*(«Кухарка Літоўская» Вінцэнтыны Завадзкай, 1938)*

**Складнікі:** 2 шклянкі агрэставага соку, 4 шклянкі дробнага цукру, крыху цытрынавай цэдры.

Агрэст трэба сабраць яшчэ зялёным, да Купальля, пакуль ён мае найбольш соку, заліць невялікай колькасьцю вады, каб яна толькі закрыла ягады. Загатаваць, пакуль ягады ня пусьцяць сок. Узвар зьліць у чысты мяшэчак (не зафарбаваны ніякімі чырвонымі ягадамі), каб вольна сьцякаў. Калі набярэцца вадкасьць, узяць удвая большы аб’ём натоўчанага цукру й пячы на адкрытым агні, пакуль не згатуецца. Каштаваць часта, ставячы спробы на лёд. Для больш прыемнага паху зьверху пакласьці тоненькую цытрынавую цэдру. Перад астуджваньнем галярэткі дастаць цэдру. Гатовы прадукт наліць у моцна нагрэтыя слоікі.

# Далучыцеся да выданьня Лаўрышаўскага Эвангельля



Нашыя паўднёвыя суседзі разумеюць велізарнае духоўнае значэньне Эвангельляў. Украінскія прэзыдэнты даюць клятву на Перасопніцкім Эвангельлі XVI ст. — адным з найбольш старых напісаных стараўкраінскай мовай. Беларускія кіраўнікі могуць толькі зайздросьціць суседзям. Ад найстаражытнейшага пэргамiннага Тураўскага Эвангельля XI ст. захавалася 10 аркушаў, якія перахоўваюцца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы. У Вільні знаходзіцца і Мсьціскае Эвангельле XIII — пач. XIV ст., і Жыровіцкае Эвангельле (Эвангельле Сапегі). У Расейскай нацыянальнай бібліятэцы ў Пецярбургу захоўваюцца полацкія эвангельлі. У бібліятэцы Акадэміі навук Украіны — Аршанскае Эвангельле XII—XIII ст. Лаўрышаўскае Эвангельле, багата ілюмінаваны рукапіс XIV ст., захоўваецца ў бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве.

## Беларускі апракос

Лаўрышаўскае Эвангельле, дарэчы, як і Аршанскае, зьяўляецца поўным апракосам — яно складаецца з эвангельскіх тэкстаў на ўсе дні літургічнага году, акрамя будных дзён вялікага посту. У адрозьненьне ад іх у апракосах кароткіх (знакамітае Астрамірава Эвангельле) эвангельскія тэксты прызначаліся толькі на суботы і нядзелі, а таксама на будныя дні асобных пэрыядаў літургічнага году.

Ужо першы дотык да фаліянту, які захоўваецца як найвялікшы скарб у спэцыяльным футарале, загорнуты ў мяккую тканіну, выклікае ў дасьледчыка хваляваньне. Вокладку — драўляныя дошкі, абцягнутыя малінавым аксамітам, зрабілі ў XVIII ст. На першай — фігурная медная плакетка з выявай сьв.Дзмітрыя Салунскага, аздобленая смарагдамі і рубінамі, на апошняй — плакетка з укрыжаваным Хрыстом. Арыгінальная аправа манускрыпту, відаць, была абцягнута цісьнёнай скурай. Мода на рамяньчыкі, якімі цяпер завязваюцца дошкі, прыйшла пазьней.

## Мова Наваградчыны

Першапачаткова тэкст пісаўся на пэргамінных лістах. Яны складаліся ў асобныя сшыткі — кожны сшытак звычайна распачынаў новы пісар — і падшываліся ў кнігу. Вокладка так моцна злучыла сшыткі, што цяжка вызначыць іх колькасьць.

Эвангельле напісана ў дзьве калёнкі пераважна карычневым атрамантам уставам — вельмі выразным почыркам. Але вялікая колькасьць скарачэньняў, лігатур, адсутнасьць прабелаў між словамі і знакаў прыпынку робіць распазнаваньне тэксту няпростай справай.

Паасобныя абзацы пачынаюцца вельмі прыгожымі ініцыяламі зялёнага альбо чырвонага колеру. Рознымі фарбамі былі выкананы і мініятуры — сьв. Міхала Арханёла, эвангелістаў Яна, Мацея, Лукі. Васямнаццаць мініятур засталіся непафарбаванымі, гэта альбо дасканалая гравюра, альбо ледзь пазначаны эскіз пяром.

Паводле мовы Лаўрышаўскае Эвангельле — царкоўнаславянскі рукапіс так званай рускай рэдакцыі, які паўстаў на мяжы XIII і XIV ст. Аднак моўныя асаблівасьці прывязваюць яго да Наваградчыны, а менавіта манастыром Багародзіцы ў Лаўрышаве (Наваградзкі раён), заснаваньне якога зьвязваюць з міндоўгаым сынам Войшалкам. У Лаўрышаве Эвангельле захоўвалася да XIX ст. Як яно трапіла ў Кракаў — загадка.

## Мікрагісторыя Наваградчыны

Ужо на тытульнай старонцы Эвангельля ёсьць некалькі запісаў. У адным зь іх указваецца: «Се азъ князь Олексанъдро Володимировичъ и своию княгинею московъкою и своими детми далъ есмь десятину Святой Богородіцы оу Лаврошевъ манастырь и с Турца оу веки». Два іншыя фундушавыя запісы належаць князю Дзьмітрыю Альгердавічу і мясцоваму шляхціччу Волчку Ескавічу.

Час стварэньня кнігі праясьняе нататка на с. 88 «Ф.Коріата князя новогородского року 1329» (лічба запісана кірылічнымі літарамі) — пачатак XIV ст. На старонках Лаўрышаўскага Эвангельля фігуруюць імёны Гаўсовічаў, Харытановічаў, Глябовічаў, Пратасовічаў, Лебедзевічаў, Шубічаў і іншых беларускіх родаў. На падставе шматлікіх укладных запісаў можна рэканструяваць ня толькі гісторыю помніка, але і штодзённае жыцьцё наваградзкай шляхты, якая шчодра ахвяравала маёмасьць на манастыр.

## Справа факсыміле

На жаль, помнікаў XIII—XIV ст., падобных да Лаўрышаўскага Эвангельля, у Беларусі няма. Але сучасныя тэхнічныя сродкі дазваляюць наблізіць гэтыя культурныя здабыткі да беларускага чытача. Напрыклад, зрабіць факсымільнае выданьне Эвангельля, як у Расеі перавыдалі славуты Радзівілаўскі летапіс. Праект дарагі, але спадзяёмся, што ў Беларусі яшчэ ёсьць дабрадзеі, якім не абыякавы лёс нашай культуры.

Зьвяртаемся да беларускіх мэцэнатаў: выкарыстайце шанц пакінуць сваё імя ў гісторыі беларускай культуры, далучыцеся да выданьня бесьсьмяротнага помніка старажытнай духоўнасьці — Лаўрышаўскага Эвангельля! Магчымых дабрадзеяў просім зьвязвацца з рэдакцыяй штотыднёвіка «Наша Ніва».

**Альбіна Семянчук-Шмыгіна**

# Каханьне і мальвы

апавяданьне

## АЛЕНА ПУШЧЫНА

*Маёй маці Зосі Самовіч прысьвячаецца.*

Сьвята з нагоды скончэньня гімназіі займала думкі радаснымі мроямі і нэрвавала адначасова. Гэты дзень быў асаблівым — менавіта сёньня ўвечары ім дадуць атэстаты, якія пацьвердзяць права на дарослае жыцьцё, а для яе гэта доўгачаканая магчымасьць зьехаць вучыцца сьпевам у кансэрваторыю. Яна заўсёды сьпявала — і ў касьцёле, і ў хаце. Сьпявала і цяпер падчас працы ў гародзе:

Заходзе сонейка,
За лес каліновы,
Дробны дождж пада,
Дробны дождж пада
На садок вішнёвы.

І раптам пачула, як да яе далучыўся чыйсьці барытон. Яна азірнулася і ўбачыла хлопца ў вайсковай форме, высокага зь пяшчотнымі шэрымі вачыма і сьветлымі валасамі. Ён ласкава пасьміхнуўся і гучна запляскаў. Саромеючыся, яна схавалася за плот з мальваў і адтуль ледзь чутна прамармытала: «Дзякуй». А ўсё таму, што ў маладым чалавеку яна пазнала брата сваёй каляжанкі Барбары — Віктара Целяжынскага. Вясёлы і элегантны Вітак толькі што вярнуўся зь Вільні і ўжо прымусіў хутчэй біцца сэрцы мясцовых дзяўчат. Нягледзячы на маладосьць, Марыля ня мела ілюзій наконт Віктара, стоячы ў сваёй паркалёвай сукенцы перад гэтым прыгажуном. Яе вочы былі блакітнейшыя за неба, а валасы колерам нагадвалі лён, але яна ведала, што яна толькі дачка беднай удавы, а ён… Дый што там думаць, лепш не псаваць настрою, і яна з радасьцю зьбегла дадому, як толькі малодшы брат паклікаў яе.

Якім жа было яе зьдзіўленьне, калі пасьля ганаровага ўручэньня атэстатаў пад гукі палянэзу Барбара падышла да яе, каб пазнаёміць з братам — Віктарам Целяжынскім, які прыехаў з інспэкцыяй у вайсковую часьць, што знаходзілася ў маёнтку на беразе Дзьвіны, па якой праходзіла мяжа з Латвіяй. Віктар беражліва ўзяў Марылю за талію, і яны далучыліся да пар, якія, быццам восеньскае лісьце, кружыліся ў танцы. Аркестар іграў і павольныя танцы, і тыя, што прымушалі рухацца хутчэй і хутчэй.

Адна мэлёдыя зьмяняла другую ў музычным вянку, робячы на фоне аксамітнай ночы бясконца прыгожым непаўторны для гэтых маладых людзей момант. Усе прысутныя, у тым ліку і Марыля зь Вітакам, адчувалі гэта. Музыка чаравала, стварала для іх казачную хвіліну харaства і каханьня. А потым узышло сонца, зазірнула першымі прамянямі ў твары. Дубы, што стагодзьдзямі стаялі ў гэтым парку каля гімназіі, усьцешана паглядалі, як надыходзіў новы дзень 1939 году.

А потым былі сустрэчы, шпацыры, лісты, шмат лістоў — бо кожнаму ведама, як тое, чаго ня скажаш падчас сустрэчы, саромеючыся погляду закаханых вачэй, само пішацца на паперы, адкрываючы самыя патаемныя думкі, мары і пляны на будучыню. Вось і цяпер, трымаючы ў руках лісты, яна чытала і перачытвала іх.

«Каханая! Я знаходжуся так далёка ад цябе, хвіліны як дні, дні як стагодзьдзі. Усе думкі толькі побач з табою. Ня можаш сабе нават уявіць, як моцна я сумую, бо няма тут тваго погляду, усьмешкі… Мне не хапае цябе як паветра, безь якога немагчыма жыцьцё. Я сьніў цябе ўчора, сёньня і буду сьніць заўтра. Сумую. Кахаю. Вітак».

«Марыля! Няма і хвіліны, каб я ня марыў пра наша спатканьне. Увесь час я перажываю, думаю і баюся за цябе. Разумееш, цяпер, калі вайна ўварвалася ў наша жыцьцё і мы так далёка адно ад аднаго, адчуваеш, які ненадзейны гэты сьвет. Праз два дні я адпраўляюся на фронт, я буду думаць пра цябе, пра маіх родных і маю зямлю, якая так цяжка пакутуе. Невядома, як доўга мы ня ўбачымся яшчэ. Мае сябры па зброі таксама ўжо даўно падрыхтаваліся сустрэцца тварам да твара са сьмерцю і забойствам. Гэта будзе наша пакута — пакута дзеля вызваленьня нашай зямлі. Кахаю цябе. Вітак».

«Мая адзіная! Сёньня была апошняя імша перад адбыцьцём на фронт. Я доўга стаяў перад Маткай Боскай і маліўся ў інтэнцыі нашай перамогі і хуткага спатканьня з табой. Увесь час прыгадваю нашу першую сустрэчу, ніколі на яе не забудуся. Я вельмі, вельмі, вельмі…»

«Марыля! Пэрлака мая! Сёньня быў наш першы бой. Танкі паўзьлі на нас, быццам жудасныя пачвары. Але мы падарвалі два зь іх. Я амаль аглух ад грукату, але ня згасла маё жаданьне перамогі. Хлопцы пасьля казалі, што яны будуць бараніцца да канца. І мы будзем, хоць з шабляй на кані… А цяпер, калі ў мяне ёсьць вольная хвілінка, вырашыў напісаць табе некалькі слоў. Мае думкі зноў з табою і пра цябе. Як мне хочацца хутчэй пацалаваць твае пальчыкі, зазірнуць у вочы, зноў пачуць водар тваіх валасоў і пачуць слова «каханы». У марах і думках я заўсёды з табою».

Марыля чытала і перачытвала гэтыя лісты бясконца. Іх ужо была цэлая шуфляда. Як раптам яны перасталі прыходзіць. Адзіная нітка, якая зьвязвала два іх Сусьветы, зьнікла.

Не было жаданьня выходзіць на вуліцу, не было жаданьня піць, есьці, углядацца ў твары знаёмых і незнаёмых, колькасьць якіх павялічвалася з кожным днем. Вайна ўжо распасьцерла свае чорныя крылы над гэтым мястэчкам, і ўсё часьцей можна было пачуць чужынскую гаворку.

Зь места вярнулася нездаволеная стомленая маці. Знаёмы солтыс расказаў ёй па сакрэце, што ўжо сфармаваны сьпісы маладых людзей, якія павінны зьехаць на працу ў Германію. Гэты раз быў пяты. Маці не магла даваць больш падарункаў, каб не павезьлі яе дзяцей. Яна затрымала паветра ў грудзях, а потым сказала тое, што сказаць даўно ўжо намагалася, але не хапала моцы:

— Марыля, рыхтуйся да замужжа.

— Але я нікога не кахаю.

— Ведаю, нікога, акрамя Віктара Целяжынскага. Але ад яго тры месяцы няма аніводнай весткі. Можа, не жыве ён ужо. Дык што, да старасьці ў дзеўках сядзець? Пра сябе думай, пра брата сваго Рамана. Мяне пашкадуй! Я ноччу спаць не магу — думаю: вось заўтра, зараз пагрукаюць у дзьверы і забяруць вас не на працу, дык у лягер. Што, думаеш, лёгка? І ня плач, я не ў дамавіну цябе кладу. Вось Міхал ужо зараз можа ажаніцца з табою — яго маці мне так і казала. І Ян ужо тры разы сватоў засылаў. А зобач які, зобач — ня п'е, ня паліць, адзін на гаспадарцы, а яна не маленькая — зямлі пятнаццаць гектараў, жывёлы колькі. Зь сям'і — нікога, адна толькі маці, Яну ўжо даўно гаспадыня патрэбна. А што на сямнаццаць гадоў старэйшы — дык што, людзі і з большай розьніцай жывуць. На фронт таксама ня возьмуць — забраніраваны на чыгунцы.

Марыля чула словы маці, быццам у сьне. Усё жыцьцё — такое маленькае — пранеслася перад вачыма — шчасьлівае дзяцінства, пакуль не памёр бацька, сьвята, надзеі, зьвязаныя з вучобай у кансэрваторыі, і яшчэ чамусьці прыгадвалася засохлая мальва, што стаяла за акном…

Яна думала, што страціла прытомнасьць, і спадзявалася — мо гэта толькі сон? Але адразу зразумела, што памылілася, — удава ўжо адправіла брата Марылі да Яна перадаць згоду нявесты на замужжа. А раніцай ксёндз з амбону сказаў пра заручыны. Вясельле было назначана на другога лютага, пакуль яшчэ не надышоў пост.

Для маленькага места гэта было вялікай падзеяй — браліся шлюбам добра знаёмыя людзі. Ян быў вядомым чалавекам, адукаваным, размаўляў на некалькіх мовах. Нявеста была прыгажуняй з добрым характарам. У працы не было ёй роўных — на гародзе ці за швейнай машынкай. Марыля сьпявала ў касьцельным хоры, і яе сьпеў «Вітай, Марыя» выклікаў радасьць і слёзы ва ўсёй акрузе. Здавалася, што душа ляціць да самога Айца Нябеснага.

Ян прыехаў па яе на трох канях, якія літаральна танчылі ля дзьвярэй Марылі, і псаломшчык Стэфан тлумачыў усім прысутным, што жаніх, напэўна, напаіў іх гарэлкай. На яго ніхто не зьвяртаў увагі, але потым многія прыгадалі яго словы.

Падрыхтоўка да вянчаньня заняла доўгі час — раскаталі чырвоную дарожку, каб падкрэсьліць важнасьць падзеі, уздоўж яе ўжо стаялі кошыкі з разалямі і ружамі Марціна. Сьвяточна гудзеў арган, хор разьліваўся мноствам галасоў, сонечныя прамяні зазіралі ў вокны.

— Марыля, — гучна пачаў самы старэйшы са сьвятароў, — у цябе ёсьць тры хвіліны, каб падумаць — ці правільна ты зрабіла: твой нарачоны нашмат старэйшы за цябе, а ты — маладая, прыгожая, ты добра падумала?

— Так, я ўжо дала слова маці і магу даць слова Богу.

Імша доўжылася каля дзьвюх гадзін. Ян з Марыляй стаялі ля аўтара, але яна, нягледзячы на вялікую колькасьць людзей, адчувала сябе, быццам у пустэчы. Падавалася, што раптоўна патрапіла на чужое вясельле, а яе шлюб павінен быў адбыцца толькі зь Віктарам, ні з кім больш. А гэты чорнавалосы мужчына з карымі вачыма, які так пяшчотна паглядаў на яе, быў чужым.

Быццам праз туман яна пачула яго голас: «Я, Ян, бяру ў жонкі цябе…» — і свой адказ: «Я бяру Яна сваім мужам, пакуль сьмерць не разлучыць нас…» — і з жахам падумала пра тое, што толькі што сказала. Вянчаньне скончылася, калі на поўную моц загучаў марш Мэндэльсона, і прысутныя натоўп пацягнуўся віншаваць маладых.

Яны выйшлі на сходкі, дзе з усіх бакоў іх пачалі абкідваць зернем — сымбалем шчасьця і згоды. Ян, схапіўшы Марылю за рукі, пасадзіў яе ў вазок. Коні, адчуваючы волю, панесьліся рысьсю і, калі на іх шляху сустрэлася толькі што зробленая брамка для затрыманьня маладых, перамахнулі цераз яе і панесьліся далей. Сыціхлы натоўп ахнуў і яшчэ доўгі час абмяркоўваў жаданьне жаніха прывабіць да сябе маладую. А ён чакаў гэтага моманту ўсё сваё жыцьцё — назіраў, як яна з даўганогага, нясккладнага дзяўчаці ператварылася ў чароўную паненку зь пяшчотнай усьмешкай. Падчас выпадковых сустрэч ён хацеў пагутарыць зь ёй, расказаць нешта, але стрымліваўся, баючыся напужаць. Вось і цяпер, паглядаючы на Марылю, думаў, што патрэбен час, каб яна магла прызвычаіцца да свайго новага становішча, але ён і падумаць ня мог, што яе сэрца належала іншаму.

Паміж тым вясельная працэсія пад гукі скрыпак і альтоў павольна рухалася да Марылінай хаты. Маладых ужо чакалі маткі — абедзьве ўдавы, абедзьве сівыя, вельмі падобныя, толькі маці Марылі больш усьміхалася, а Янава маці падавалася маўклівай з вострым халодным позіркам шэрых вачэй. Яны блаславілі маладых хлебам-сольлю і прымусілі іх увайсьці ў хату пад вышытым ручніком па кажусе пад сьпеў традыцыйных вясельных песень. Перад іх вачыма зьявіўся багаты па ваенных часах стол — смачна прыгатаваная і па-мастацку аздобленая зяленівам рыба. Тут быў і вялікі жэрах у алеі, фаршыраваныя шчупакі, якія зьдзіўлена пазіралі на прысутных вочкамі-гузікамі, апэтытныя ліні ў тэсьце і складзеныя колцамі заліўныя вугры.

Усе гэтыя стравы адбіваліся ў халодным бляску потных бутэлек, якія хаваліся ў склепе з даваенных часоў, а цяпер нарэшце ўбачылі сьвет. А вясельныя каравaі з вывай маладых запрашалі да танцаў. Ды і як было ня танчыць, калі музыка напоўніла ўсю прастору. Потым з маладой зьнялі вэлюм і падаравалі хустку зь пеўнямі, а надалей стомленае вясельле разышлося хто куды.

Іх правялі ў самы далёкі пакой. Марыля не магла стрымацца ад ускрыку, калі ўбачыла вялізны ложак, які займаў амаль палову пакою. Да таго ж ён быў вельмі высокі — перад тым як пакласьці пярыну, на дно насыпалі прагрэтае збожжа. Ад яго ішла цеплыня, распаўсюджваючы навокал сябе пах лета, хаця ж на двары ўжо даўно стаяла восень. Побач зь печчу на палічцы зьзялі пакладзеныя на чырвонае лісьце явару хлебіны.

Марыля азірнулася, саромеючыся. Як паводзіць сябе цяпер? Ян адчыніў печ, паварушыў вугольле, падкінуў яшчэ паленьня для падтрыманьня агню. У дзьверы пагрукала Янава маці, і ён выйшаў. Марыля ўмомант скінула сукенку і схавалася пад коўдру. Ян заходзіў некалькі разоў, выносіў хлеб з пакою. Цікава, для каго? Толькі потым яна даведалася, што гэто было для нейкіх людзей, што хаваліся ў лесе.

Яна намагалася зразумець, пра што размаўляюць за дзьвярыма, але патрохі да яе падбіраўся сон, і, як ні супраціўлялася, яна нічога не магла зрабіць. Раптам яна адчула пацалунак, нехта абдымаў яе і яшчэ нешта, разам з чым раптам стала цёпла-цёпла і яна ператварылася ў іншую, зусім іншую… Немагчыма было зьбегчы — Ян моцна трымаў яе ў абдымках, сон і стомленасьць былі яго саюзьнікамі.

Калі надышла раніца, Марыля прачнулася ад вясёлай музыкі — гэта музыканты прыйшлі правесьці маладых у новую хату, дзе павінен быў прайсьці другі дзень вясельля.

Якім жа было яе зьдзіўленьне, калі яна села ў вазок і раптам яе быццам нешта адштурхнула. Чыйсьці погляд… Такі знаёмы… Яна пазнала схуднелага з забінтаванай рукою, але да болю знаёмага і каханага Віктара Целяжынскага.

Спазьніўся — зразумела яна яго погляд. Спазьніўся — грукала ў грудзях. Спазьніўся — крычала ўсё навокал, і сьлёзы зьбягалі на бок саней, быццам наўмысна размаляваных мальвамі; яны ўсё беглі і беглі, ператвараючыся ў маленькія крышталікі на паверхні кветак.

Так і зьехалі Ян і Марыля насустрач сваёй будучыні, пакідаючы пасьля сябе натоўп і пасярод яго — Віктара Целяжынскага, які толькі што вярнуўся са шпіталю…



**Алена Пушчына** (нар. у Друі, 1951) — працуе мэнэджарам у доме гандлю «Копцева» ў Полацку. Доўгі час жыла ў Рызе, скончыла там Латвійскі дзяржаўны ўнівэрсытэт імя П.Стучкі, потым вярнулася на Радзіму. Замужам. Мае дзьвюх дачок. У «НН» друкуецца ўпершыню.

## Юрась Нераток

ВЕЧАРОВАЕ

Вечар дражніцца ценямі
Без трагедый і драм.
Спачуваю я геніям
І зайздрошчу майстрам.

Час ня мае каштоўнасьці —
Гразь ляціць з-пад падкоў.
Пазьбягаю шматслоўнасьці
І даўжэзных радкоў.

Працяло думкай гадкаю,
Як у цемя — лядзяш:
Хутка шлёпнуць пячаткаю,
Каб сьпісаць у тыраж.

За прарочымі вершамі
Шлейфам цягнеца дым.
Саступаю старэйшым я,
А пара — маладым.

І зь бясстраснасьцю рыцара,
Што змагаўся, як мог,
Ганарлівасьць-амбіцыю
Пакладу пад замок.

Нагуляўся, бы з цацкаю,
І ня буду ханжой:
Сьмешна быць сталым дзядзькаю
Ды зь юнацкай душой.

Сонца з промнямі нізкімі
І спакой-цішыня
Выніковымі рыскамі
Абвядуць контур дня.

І якая ўжо розьніца —
Будзе горш, будзе лепш?
Ноч суцэльна накоціцца —
І закончыцца верш.

## Вадзім Карцаў

***
Суткі бяз сонца,
Суткі бязь ветру,
Сілаў — на донцы,
Паляцца нэрвы.

Плавіцца воля,
Розум нямее...
Цяжкую ролю
Выбраў сабе я.
Ролю ў спэктаклі
Зь дзеяй па коле.
Цягнуцца акты,
Скончу — ніколі.

Граю ахвяру,
Потым — тырана...
— Баўся, глядачу,
Сыходзіць рана!

## Іван Іванцоў

МАЯ БЕЛАРУСЬ

Ты як вясёлка з навальніцы па-над вёскаю,
Як ясны дзень з туману над ракой,
Зноў адрадзілася па волі Боскай
Вэнэра зь небыцьця, як зь пены той марской.
За тысячу гадоў тваёй гісторыі
Дзясяткі войнаў парушалі твой спакой,
Народ твой білі, вешалі, рабілі зь вёсак крэматорыі,
Вэнэра зь небыцьця, як зь пены той марской.
Пад бел-чырвона-белымі сьцягамі і «Пагоняю»
Сыны твае ішлі ў сьмяротны бой,
Каб вольнай была ты, а не калёніяй,
Вэнэра зь небыцьця, як зь пены той марской.
Але ж зноў вырадкі ў Беларусі ўладараць,
Праклiцьце здраднікам у памяці людзкой.
Ўсе не мінуць Суда Народу, хай ня мараць,
Вэнэры зь небыцьця, як зь пены той марской.
Я ведаю, і зараз беларусам хопіць розуму
Зноў адстаяць свабоду, незалежнасьць і спакой.
Сабой Айчыну засланіць бяз роздуму —
Вэнэру зь небыцьця, як зь пены той марской.
І прыйдзе час, і будзе ў Хаце нашай Сьвята,
Паднімем тост мы за сталом сьвяточным грамадой,
Каб больш у войнах не губляць бацькоў, сястру ці брата,
Вэнэру зь небыцця, як зь пены той марской.
Будзь вольнай Беларусь, родная, любая,
Каб стаў народ багаты і шчасьлівы твой,
Каб зь песьняй сябраваў, з усьмешкай белазубаю,
Вэнэра зь небыцьця, як зь пены той марской.

## Sany Dragonfly

* * *
Цішэй...
Грае дождж па званюткай вадзе,
Грае дождж ці гуканьне, ці шэпт...
Я змарную сваю надзею,
Я змарную сваю надзею,
Дзе я, дзе я,
Дзе?
Глядзі:
Мы сустрэліся, зблытаўшы сны,
Пад нагамі дрыжыць маладзік...
Мы тут воляю чараўніцы,
Мы тут воляю чараўніцы,
Сьніцца, сьніцца...
Зьнік.
Хадзем,
Я цябе правяду да нябёс,
Ты — чужы, як і я, між людзей...
Вочы твае — чысьцюткія росы,
Вочы твае — чысьцюткія росы,
Сьлёзы, сьлёзы,
Лёс.
Я змарную сваю надзею.
Дзе я,
Дзе я,
Дзе я...

## Ганна Матусэвіч

КОСТУСЮ КАЛІНОЎСКАМУ

Дзень Страты Нашай,
Дзень Зьвеставаньня,
Вялікадня Дзень,
Мы — Літва Белая, ня сьцень!
Боль абернецца
Нашай Воляй,
Страта — памяцьцю
Пра Былое...
Хто быў большы —
Здалёку ня ўбачыць;
А ўлада ў таго,
Дзе ахвяры найбольш.
Мой ты Шляхціц найлюбы!
Суворы Літоўскі дыктатар!
Бога ты пакахаў,
І цябе кахаў Бог.
Са Сьвятымі спакою
Табе не жадаю,
Проста ведаю:
Гэткім, як ты, — неспакой.
А суцешыць — суцешу:
Тыя не паміраюць,
Хто за нашую й вашую
Вольнасьць душу аддаюць.
Героі вяртаюцца зь Неба
На Літву Нашу зноў,
Каб яе ўратаваць
Аб прыгнобленых, сьлізкіх,
Зласьлівых і шэрых,
Каб Сусьветны Агонь
На Літве заснаваць!

## Алесь Скілондзь

ПАГОНЯ

Гэты герб паважалі заўсёды,
Ён праходзіў праз брамы вякоў,
Гэта помнік таму чалавеку,
Што жыцьцё аддаваў за любоў.
За любоў да уласнай краіны,
За людзей, што на гэтай зямлі.
Іх хаваў за шырокую сьпіну
Ды памёр, каб яны жылі.
Гэта сымбаль магутнай веры,
Што сябе бараніла мячом.
Калі моцы змагацца ня мелі,
Крыж чырвоны іх поўніў зноў.
Крыж ня просты — знак Эўфрасіньні,
Не забудуць імя яе.
Ды нашчадкі яго згубілі,
Разам з тым, што быў на шчыце.
Не бароніць за гэта Бог,
Самі болей не маюць рады,
Бо падман ахапіў зямлю,
Ды яму належыць улада.
Тут ня любяць складаных слоў,
Чалавека цанілі раней,
Тым, хто побач, зычылі шчасця,
А ня проста спакою сабе.
Разам зь вершнікам зьнішчылі веру
Ў тых, хто рыдзелем быць гатовы,
Падабаецца жыць ў спакоі,
Баязьліва схіліўшы галовы.
Яго латы ляжаць на зямлі,
Забірай, хто захоча, дарма.
Паважаны чужымі народамі,
Цёмны свой, не жадае сьвятла.
Толькі вораг яго баіцца:
Ён памёр, а прывід — жывы,
Ціха збожжа ў краі каласіцца,
Дзе яго падрастаюць сыны.


WORLDPRESSPHOTO.COM
**Дзіўзная садавіна. Фота Джо Шугнэсі (Ірляндыя). Трэцяе месца на сусьветным конкурсе World Press Photo 2005 у катэгорыі «Мастацтва і забавы».**

## Антон Брыль

НАВАЛЬНІЦА

Передвосеньскае патрыятычнае

Ад чаго нечакана трава зеляней, чым была,
Ды паветра такое, што нават у сьне не прысьніцца?
Ад таго, што ў дзівосным праменьні агню ды сьвятла
На старую Літву па нябёсах паўзе навальніца.

І паволі сьвінец афарбоўвае ўвесь небакрай,
Ды крычаць крумкачы ўсё грамчэй над пустою ральлёю.
Мне трывожна ды радасна слухаць іх велічны грай,
Я народжаны гэтаю чорнаю злою зямлёю.

Вось яна, што рабіла мяне год ад году дзічэй,
На сваё падабенства расьціла мяне ад маленства.
Ад таго ў глыбіні маіх сонных тарфяных вачэй
Бы падземны пажар палымнее таемна шаленства.

Ад яе атрымаў я дзіклівасьць літоўскіх лясоў,
Бы кара налібоцкіх дубоў зьдзірванелую скуру,
Паламаны прагнілы счарнелы чарот валасоў
Ды камень у грудзях з гарадзенскага княскага муру.

Вось у воі вятроў разрываюцца пасмы смугі,
Ды далёка на захадзе неба маланкі пякельныя,
І рака звар'яцела раве ды ірве берагі,
І з бурлівых віроў пасьміхаюцца твары тапельніц.

Хмары рушацца ўніз і зямля пад нагамі плыве,
Навальніца нясецца па шэраму цяжкаму небу.
Я стаю басанож у пажоўклай пажухлай траве,
Мае ногі пускаюць карэньне ў няплодную глебу.

## Мікола Бельскі

* * *
Хто памяне Курапаты,
Хай таму прысьняцца краты
Той ня стане дэпутатам
Хто ня вучыць Таты «матаў»!

* * *
Даражэе хлеб, сабакам
Дастаецца дуля з макам.
Кошт «загнулі» удвая...
Спасе бульбачка свая!

* * *
Плахішы краінаў NATO
Хочуць зьняць з пасады Тату:
— Стаў дарослы, Кібальчыш,
За так возьмеш хлеба шыш!

ПАЗНАЧЫЦЬ, АДКУЛЬ АЎТАР

## Ігар Севяранін

НЯ БОЛЕЙ ЧЫМ СОН

Пераклад Анатоля Трафімчыка

Неверагодны мне прысьніўся ўчора сон:
Я ехаў з паннай, што чытала вершы Блока.
Кабылка ціха йшла, ступаўшы ва ўнісон,
Віліся пасмачкі і вільгатнела вока.

І больш зусім нічога ў сьне тым не было,
Ды, ўсхваляваны ім, узрушаны глыбока,
Жыву цалюткі дзень з трывогай і цяплом
І думаю аб той, што памятае Блока.

## Тацяна Васілінчык

З ГАННЫ АХМАТАВАЙ

Нашы сэрцы не скаваныя
І каханьне — не астрог.
Многа шчасьця канаванага
Знойдзеш вольны на шляхох.

Я ня жалюся, ня плачу, не:
Шчаснай долі мне ня мець.
Не цалуй стамлёных вуснаў мне —
Цалаваці прыйдзе сьмерць.

Адышла туга нясьцерпная,
На ёй сьнежнае сяйво...
Лепшы ты — чаму, ня ведаю —
Ад выбраньніка майго.

# Эпілятары Настасьсі Слуцкай

СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ

## Шампунь ад Неўскага

Гісторыя даўно стала служкаю дзяржаўных ідэалёгій. Не адстае і рэклямны бізнэс. Покуль мы спрачаемся пра бляск і марнасьць містыфікацый, рэклямнікі скідваюць замок з клямкі весьнічак сваёй фантазіі. І натхнёна блытаюць спажыўца. На адных гомельскіх «гандлёвых радох» ты з *упоением* і пісьменьніцкай зайздрасьцю прачытаў этыкетку расейскага лопухавага шампуню з сэрыі «Русское поле». Ананімны аўтар паведаміў, што лекавыя ўласьцівасьці лопухавага алею былі знаныя спакон вякоў, што асабісты лекар «русского князя» Аляксандра Неўскага таксама карыстаўся гэтым зельлем. Насамрэч пра гэнага князя так мала інфармацыі захавалася, што нават гады жыцьця яго дакладна не вядомыя.

Пацешыў майстар сучаснага расейскага дэтэктыву Аляксандар Бушкоў. У сваёй «гістарыёіднай» кнізе «Расея, якой не было» ён досыць сьмела атаясамлівае князя Аляксандра Неўскага (чамусьці разам з бацькам Яраславам) і хана Батыя. Што да рэклямы, дык для беларускіх мэнэджараў плойма магчымасьцяў, якія варта выкарыстоўваць. Можна кінуць на рынак якуюкольвек туалетную ваду, вырабленую па традыцыйных старабеларускіх рэцэптах часоў Усяслава Чарадзея. І слоган быў бы канкрэтны: «Нават у кіеўскім порубе ён пах як трэба!» Ня лішнім было б пакарыстацца вобразам збольшага раскручанай княгіні Слуцкай Настасьсі. «Нашы эпілятары вострыя, як ейны меч», — мусіла б красаваць на бігбордзе. Як ня верыш вачам, то памацай сам.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Сталіца, Няміга, 3 ліпеня. Батут.

## Салата з Гордзіевага вузла

За царскім часам у Гомелі былі свае Амэрыка і Каўказ. У савецкім Гомелі зьявілася ўласная Кітайская сьцяна. Горад у палоне чужых міталягем, ахвочы да запазычаньняў. Нездарма ж некалі зьявілася выслоўе: «Ёсьць Бадэн-Бадэн, а ёсьць Гомель-Гомель». Спробы вярнуць (прыдумаць?) Гомелю беларускі кантэкст пакуль не займелі дзейсных вынікаў. На шалях гарадзкое сьвядомасьці пераважваюць палац і парк расейскіх князёў у суполцы зь любымі артэфактамі нетутэйшасьці… Як ільга назваць рэстаран, які месьціцца на цокальным паверсе стандартнага, хіба толькі доўгага, шматпад’езднага хмаранедачосіка? «Акропаль» — вырашыў незнаёмы табе хазяін гэнага спажыўнага месьцейка. І *дрэўнягрэчаскі крэмль* успомнены, і будыніна атрымала вобразнае *нязьдзешняе* найменьне. Над уваходам — лацінскі надпіс «Veni». Намякаюць на Юлія Цэзара, які, калі верыць прадаўняй прымаўцы, «veni, vidi, vici». А ад Цэзара да Македонскага адзін крок. Гэткай калейкай тамтэйшая кухня мусіць прапаноўваць адбіўныя зь мяса баявых сланоў, палеглых у бітве ля Гаўгамэлаў… Зрэшты, спраўджваць тое няма ніякай ахвоты — ні гастранамічнай, ні ідэалягічнай. «Якось так воно все у глибокій дірі», — цэдзіш праз зубы словы зь вершу Юр’я Андруховіча. Рэстарану «Майдан» у Гомелі ўжо некалькі год не існуе.

АДАМ ГЛЁБУС



# Сучасьнікі

## 2005. Зюганаў і незалежнасьць

Сталіца прыбралася ў сьвяточныя агні. Праспэкт Незалежнасьці зіхаціць мірыядамі рознакаляровых лямпачак і шкельцаў. Куды ні зірні, паўсюль «незалежнасьць» і «незалежнасьць». Нават у вітрынах бутыку «Бронкс» побач з постмадэрнісцкімі скульптурамі вісяць плякаты з заклікамі сьвяткаваць 3 ліпеня Дзень Незалежнасьці Рэспублікі Беларусі. Разглядаючы вітрыну, падумаў: «Прапаганда сьвята Незалежнасьці набыла ў Беларусі амэрыканскую форму. Мясцовыя мастакі-прапагандысты вельмі хутка з савецкіх перакінуліся ў амэрыканскіх, а трэба было б выкарыстоўваць эўрапейскія стандарты, яны больш сьціплыя, але ня менш дзейсныя. У савецка-амэрыканскай прапагандзе зашмат чыста зьнешніх эфэктаў». Не пасьпеў я скончыць свае развагі, як, адварочваючыся ад вітрыны, ледзь не наляцеў на Зюганава. Галоўны расейскі камуніст шлэпаў проста на мяне. У сталічна-сьвяточным зіхаценьні Зюганаў глядзеўся блякла. Ня так і даўно, гадоў якіх трыццаць таму, партыя расейскіх камуністаў кіравала большай паловаю сьвету, а цяпер яе кіраўнік сьціпла тэпае па незалежным Менску ў 11 вечара, сярод вясёлай і абыякавай да палітыкі беларускай моладзі. Выпадковая сустрэча зь Зюганавым мяне пацешыла яшчэ і тым, што галоўны расейскі камуняка ростам меншы за мяне. Лісьлівае тэлебачаньне (тэлебачаньне скрозь лісьлівае, тэлебачаньне — форма лісьлівасьці) навучылася рабіць з розных атопкаў вялікіх людзей, а ў рэальнасьці яны зусім невялікія і няяркія. Прынамсі, даволі бляклую асобу Генадзя Зюганава я ўбачыў на менскім праспэкце Незалежнасьці, каля бутыку «Бронкс».

*1.07.2005, 12:45*

## 1971. Камісарава і Эрмітаж

Мастацтвавед Кіра Камісарава працавала навуковым супрацоўнікам у Эрмітажы, таму, зрабіўшы ласку, прапанавала мне наведаць музэй у выходны дзень, калі можна паглядзець музэй у цішыні і спакоі. Ні турыстаў, ні наглядальнікаў. Бязьлюдныя залі, поўныя мастацтва. Леанарда, Рафаэль, Рэмбрант… Раптам Камісарава заварочвае ў анфіляды з царска-расейскім барахлом. «Чамусьці ніхто ня любіць хадзіць да рускіх экспанатаў», — абураецца Кіра Камісарава, стоячы каля васковай маскі Пятра Першага. «І я не люблю…» — «Чаму?» — «Пётар Першы сына свайго забіў…» Моўчкі мы вярнуліся ў залі з жывапісам. Кіра Юр’еўна чамусьці пакрыўдзілася.

*1.07.2005, 12:07*

## 1974. Міхайлоўскі і «двоечка»

Выкладчык фізкультуры Міхайлоўскі любіў паўтараць «пастаўлю двоечку». Так ён заклікаў навучэнцаў да дысцыпліны. «Двоечак» Міхайлоўскі нікому ня ставіў, дабрадушны быў чалавек. Навучэнцы ставіліся да Міхайлоўскага добразычліва. Яны нават не заўважалі, што «паставіць двоечку» выкладчык абяцаў толькі гарэзьлівым навучэнкам. Міхайлоўскі быў у тым паважаным перадпэнсійным веку, калі з усіх варыянтаў нешта там некаму паставіць выбіраецца і ставіцца бутэлька зь віном.

*26.06.2005, 12:43*

# Знакі прыпынку



УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ

* * *

Здаецца, што ўжо ўсё парушылася, а ўсё яшчэ нешта рушыцца, рушыцца, рушыцца… І не спыніць. А чалавеку трэба мець штосьці непарушнае — на чым стаяць.

Ангельскі вучоны Філіп Гасэ быў праўдзейным сябрам Каралеўскага навуковага таварыства, спэцыялістам па марской біялёгіі. Усё ў ягоным жыцьці было хораша і надзейна зладжана, апроч часу, у якім разбураўся міт аб стварэньні сьвету. Страх перад гэтым разбурэньнем змусіў яго, *вучонага-біёляга,* за два гады да публікацыі дарвінскага «Паходжаньня відаў…» надрукаваць свой трактат «Пуп Зямлі, або Спроба разьвязаць геалягічны вузел», у якім супярэчнасьці паміж біблейскай легендай і тэорыяй эвалюцыі ліквідоўваліся даволі хітра. «У той жа дзень, — даводзіў Гасэ, — калі Гасподзь сварыў Адама, ён стварыў і ўсе выкапні, усе вымерлыя формы жыцьця».

Сьмешна, але шчымліва.

Гасэ не ерэтык, а я ведаў папа, які, калі выпіваў і мучаўся тою ж праблемаю, што і ангельскі біёляг, дазваляў сабе ерась: першапачатковы сьвет стварыў Сатана, сваволны і амбітны анёл Гасподні. Стварыў ён сьвет на свой сатанінскі капыл: зь яшчарамі, дыназаўрамі і ўсёй астатняй дагістарычнай брыдой. Богу ў той час не да Зямлі было, Ён нечым (поп слаба тлумачыў, чым) надта важным займаўся, а пасьля бачыць: Зямля ўся ў сатанінскіх вычварынах! Сатану Гасподзь адразу ў пекла ўпёк — і ўсё на Зямлі перарабіў. Брыду ўсю зьнішчыў, на вычварын ледавік насунуў… Шкілеты іх замерзлыя і знаходзяць палеантолягі, ня дзіва.

* * *

Ісьціна — там і тады, дзе і калі ёсьць адказнасьць. Гісторыя чалавецтва — гісторыя дактрын, бездказных падробак пад ісьціну.

# Уімбэлдан. Чаму трава такая хуткая?

Чаму Рафаэль Надаль, чэмпіён «Ралян Гарос», ня мае найменшых шанцаў на Ўімбэлдане? Чаму на траве куды лепей адчуваюць сябе гульцы з магутнай падачай — такія, як Родык, — ці тыя, што атакуюць каля самай сеткі — як Фэдэрэр? Рэч у фізыцы.



PHOTO910.TUPOD.COM

Вікторыя Азаранка — двухразовая пераможца Ўімбэлданскага турніру ў парным разрадзе сярод юніёраў. Сёлета Вікторыя перамагла таксама ў пары юніёрскага турніру на Australian Open і Roland Garros.

Кажуць, што травяныя корты Ўімбэлдану — найхутчэйшая тэнісная пляцоўка. Гэта праўда, але ня хуткасьць перамяшчэньня мяча робіць яе найхутчэйшай. Наадварот, як устанавілі навукоўцы, трава мацней за ўсё запавольвае мяч. Хуткасьць Уімбэлдану вызначаецца вугламі адбіцьця мяча, а таксама вышынёй і адлегласьцю, на якіх ён ляціць пасьля адбіцьця. Усе гэтыя велічыні для травяністых кортаў зьяўляюцца самымі нізкімі — найменшы вугал, найніжэйшае адбіцьцё, найкарацейшы лёт. У тэнісістаў застаецца вельмі мала часу на рэакцыю, ім даводзіцца хутчэй рухацца па корце і хутчэй здабываць пункты. Але зусім ня хуткасьць самога мяча робіць Уімбэлдан найхутчэйшым і найцяжэйшым турнірам. Як такое магчыма?

**1. Пад якім вуглом адбіваецца мяч?**

Звычайны (някручаны) мяч:
гард («US Open») — 32,9°;
грунт («Ралян Гарос») — 34,7°;
трава (Уімбэлдан) — 28,6°*.
Моцна кручаны наперад мяч (так званы топ–сьпін):
гард («US Open») — 24,8°;
грунт («Ралян Гарос») — 26,4°;
трава (Уімбэлдан) — 16,8°**.
Кручаны назад мяч (андэрсьпін):
гард («US Open») — 38,1°;
грунт («Ралян Гарос») — 40,8°;
трава (Уімбэлдан) — 26,1°***.

**2. На якую вышыню ў сярэднім адбіваецца мяч?**

гард — 114 см;
грунт — 111 см;
трава — 68 см****.

**3. На якую адлегласьць (па гарызанталі) ляціць мяч пасьля адбіцьця, перш чым дасягнуць найбольшай вышыні (у сярэднім)?**

гард — 3 м;
грунт — 2,8 м;
трава — 2,3 м*****.

**4. Якая будзе хуткасьць мяча пасьля адьбіцьця (перад адбіцьцём — каля 48 км/г)?**

гард — 32 км/г;
грунт — 30,5 км/г;
трава — 28,9 км/г******.

## Высновы для навукі

Трава запавольвае мяч больш, чым любая іншая паверхня! Чаму ж тады гэта найхутчэйшая паверхня? Бо хуткасьць мяча складаецца зь дзьвюх хуткасьцяў — вэртыкальнай і гарызантальнай. Напрыклад, на земляным корце мяч ляціць у цэлым хутчэй, але адбіваецца пад вялікім вуглом, ляціць вышэй і праз тое даўжэй пераадольвае тую самую гарызантальную адлегласьць. Такім чынам, яго гарызантальная скорасьць аказваецца ніжэйшай. На траве вугал падзеньня меншы. Мяч ляціць у цэлым зь мінімальнай хуткасьцю, але пераадольвае меншы шлях — і гарызантальная хуткасьць аказваецца вышэйшай. А для гульца, які стаіць, напрыклад, за чатыры мэтры ад месца адбіцьця мяча, найвялікшае значэньне мае тое, як хутка ён дасягне яго — інакш кажучы, як хутка ён рухаецца па гарызанталі, а ня тое, як хутка ён рухаецца наагул.

Высновы для тэнісу:

— мяч адбіваецца на траве пад найменшым вуглом з прычыны сьлізганьня;

— праз гэта адбіваецца найніжэй;

— дзякуючы гэтаму найхутчэй пераадольвае адлегласьць паміж месцам адбіцьця і тэнісістам, хоць рухаецца павольней, чым на бэтоне ці зямлі;

— тэнісіст мае менш часу на рэакцыю, перадачы мяча адбываюцца хутчэй, лепшых вынікаў дасягаюць тэнісісты, здольныя хутка здабываць пункты (пасьля моцных падач ці дзеяньняў перад сеткай — напрыклад, Эндзі Родык, Роджэр Фэдэрэр); тыя, хто любіць бегаць (напрыклад, Рафаэль Надаль, Гілерма Корыя), ня маюць шанцаў.

Былі выкарыстаны вынікі дасьледаваньняў, праведзеных карпарацыяй «Cislunar Aerospace» (поўны пералік экспэрымэнтаў можна знайсьці на інтэрнэт-старонцы па адрасе: http://wings.avkids.com/tennis у разьдзеле «Тэніс. Наш дасьледчы праект»).

* Вугал адбіцьця на траве найніжэйшы. Гэта эфэкт сьлізганьня.
** У выпадку моцна кручанага мяча розьніца яшчэ больш выразная. Такі мяч сьлізгае больш і адбіваецца пад яшчэ меншым вуглом.
*** Мяч з адваротным кручэньнем на корце зь земляным і цьвёрдым пакрыцьцём сустракае моцнае супраціўленьне паверхні і адбіваецца пад вялікім кутом. На траве — зноў з прычыны сьлізганьня — трэньне намнога меншае і мяч не адбіваецца пад вялікім вуглом.
**** Розьніца ўражвае. На траве мяч адбіваецца больш як на 40 см ніжэй!
***** На траве мяч найхутчэй пачынае падаць.
****** Трава мяккая, больш пругкая, чым ард і грунт. Таму скорасьць мяча ніжэйшая.

СПОРТ СЬЦІСЛА

## Хамутоўскі вяртаецца ў «Сьцяўа»

Галкіпэр нацыянальнай футбольнай зборнай Беларусі Васіль Хамутоўскі вярнуўся ў Бухарэст, дзе распачаў трэніроўкі ў складзе «Сьцяўа». Незадоўга да заканчэньня мінулага чэмпіянату беларускі легіянэр пакінуў клюб праз канфлікт з тагачасным галоўным трэнэрам Вальтэрам Дзэнгам, дарэчы, у «мінулым» жыцьці галкіпэрам зборнай Італіі. Паслугамі Хамутоўскага адразу зацікавілася кіеўскае «Дынама», але ўкраінцаў не задаволіла цана, якую запытала «Сьцяўа», — $1 000 000. Тым часам у бухарэсцкага клюбу зьмяніўся трэнэр, клюб узначаліў экс-гулец днепрапятроўскага «Дняпра» і былы трэнэр грэцкага «Алімпіякосу» Алег Пратасаў. Прагледзеўшы некалькі касэт з гульнёй Хамутоўскага, ён папрасіў вярнуць Васіля ў Бухарэст, назваўшы крок Дзэнгі памылковым.

## Пра коней на пераправе

1 ліпеня ў менскім «Дынама» другі раз за паўтара месяца зьмяніўся галоўны трэнэр. Аляксандар Башмакоў, які займаў гэтую пасаду толькі паўтара месяца, адпраўлены ў адстаўку — старшыня праўленьня клюбу бізнэсовец Юры Чыж аказаўся незадаволеным вынікамі, паказанымі клюбам. Цяпер трэніраваць «Дынама» будзе ўкраінскі спэцыяліст Аляксандар Рабаконь, які ў мінулым сэзоне няўдала трэніраваў барыспальскі «Барысфен» і кіеўскую «Абалонь» — каманды пакінулі элітны дывізіён. Між іншым, Рабаконь выступаў як футбаліст у чэмпіянаце Беларусі: у 1994/1995 г. ён гуляў за магілёўскае «Тарпэда». Дапамагаць Рабаконю на трэнэрскім мастку будзе вядомы ў мінулым футбаліст Юры Максімаў.
На наступным тыдні «Дынама» возьме старт у Лізе чэмпіёнаў. У першым кваліфікацыйным раўндзе менчукі згуляюць з кіпрскім «Анартосісам». Першы матч 12 ліпеня на сталічным стадыёне «Дынама».

## Беларускі бэйсбол

3 ліпеня ў Берасьці адкрыўся першы ў Беларусі бэйсбольны стадыён. Арэна разьмясьцілася побач зь Лядовым палацам і Лёгкаатлетычным манэжам. Спартовае збудаваньне цалкам адпавядае ўсім міжнародным стандартам і ўжо атрымала прапанову ад старшыні тэхнічнай камісіі Эўрапейскай бэйсбольнай канфэдэрацыі на правядзеньне ў Берасьці гульняў Кубку эўрапейскіх чэмпіёнаў.
На стадыёне ўжо адбыліся фінальныя гульні турніру па бэйсболе, што праходзіў 1—3 ліпеня. Першае месца заняла каманда ЦСКА-УУС (Расея), другое месца — у «Берасьцейскіх зуброў», трэцяе — у «Вільні» (Літва).

## Нашы на Ўімбэлдане

Някепска выступілі беларускія тэнісісты на Адкрытым чэмпіянаце Англіі па тэнісе.
Вікторыя Азаранка разам з вугоркай Агнэш Шаваі выйграла тэнісны турнір сярод юніёрак у парным разрадзе. Летась Вікторыя перамагала на Ўімбэлдане разам з Вольгай Гаварцовай, а сёлета разам з А.Шаваі перамагла на «Ралян Гарос», разам з Марынай Еракавіч (Новая Зэляндыя) — на «Аўстраліян Оўпэн», дзе выйграла турнір у індывідуальным разрадзе.
Максім Мірны дайшоў да паўфіналу парнага разраду і 1/8 фіналу індывідуальнага разраду, што дало яму магчымасьць павысіць свае пазыцыі ў рэйтынгах Асацыяцыі тэнісістаў-прафэсіяналаў. У «Чэмпіёнскай гонцы-2005» Мірны ўзьняўся з 29-га на 24-е месца. У рэйтынгу парных гульцоў беларус перамясьціўся з чацьвёртай на другую пазыцыю.

**АГ, belapan.com, football.by**

# Саўны



**Саўна-люкс**
вул.Смаленская, 49
238-45-41
Басэйн, пакой адпачынку, кухня
**«Сава»**
вул.Шаранговіча, 17
8-029-639-82-89
Басэйн, трэнажэры, банкетная заля, пакой адпачынку
**«XXI стагодзьдзе»**
пр.Ф.Скарыны, 169
228-77-71
Басэйн, масаж, пакой адпачынку, бар-рэстаран
**Саўна-люкс гатэлю «Арбіта»**
пр.Пушкіна, 39
257-46-06

**Саўны з гідрамасажам**
**«Nature»**
вул.Я.Коласа, 35
276-35-56, 8-029-653-53-95
Басэйн, гідрамасажны душ
**«Акула»**
вул.Талбухіна, 3 (гатэль «Дружба»)
281-63-63
Трэнажэры, басэйн, пакой адпачынку
**«Даліна гейзэраў»**
вул.М.Багдановіча, 153
232-62-23
Басэйн, трэнажэрная заля, масаж
**«Кенгуру»**
вул.Брылеўская, 2 (гатэль «Спадарожнік»)
205-46-20
Басэйн, пакой адпачынку, трэнажэры
**«Мэга»**
вул.Лынькова, 11
209-60-10
Басэйн, душ Шарка, салярый, трэнажэры, бар
**«Мола»**
вул.Даўгабродзкая, 14
230-67-07
Басэйн, трэнажэры, пакой адпачынку
**«На палях»**
пр.Машэрава, 22
250-29-75, 8-029-658-47-03
Басэйн, гідрамасаж, пакой адпачынку
**Аздараўленчы цэнтар**
вул.Прытыцкага, 60/5
258-78-26
Басэйн, душ Шарка, трэнажэры, пакой адпачынку
**Аздараўленчы цэнтар «Алімп»**
вул.Я.Коласа, 2
232-20-61, 239-18-01
Басэйн
**«Саўна на Берасьцейскай»**
вул.Берасьцейская, 2
278-23-48
Басэйн, пакой адпачынку
**Саўна-люкс**
вул.Смаленская, 49
238-45-41
Басэйн, пакой адпачынку, кухня
**Саўна-люкс**
вул.Скрыганава, 6а
259-18-73
Басэйн, пакой адпачынку
**Саўна-люкс**
1-шы Цьвёрды зав., 11
236-50-95, 8-029-636-50-95
Басэйн, пакой адпачынку
**Саўна**
вул.Грушаўская, 85
222-06-06
Басэйн, пакой адпачынку
**«У Петруся»**
вул.П.Броўкі, 12
232-70-22
Басэйн-джакузі, пакой адпачынку, салярый, трэнажэры
**«Ля фантану»**
вул.Амуратарская, 4
223-14-00
Басэйн, масаж, пакой адпачынку, салярый, трэнажэры
**ФАЦ імя П.Машэрава**
пр.Машэрава, 23
226-68-66
Басэйн, трэнажэрная заля, масаж, бар
**Спартовы комплекс «Футбольны цэнтар»**
пр.Машэрова, 22
250-26-87, 254-81-07
Басэйн, гідрамасаж, пакой адпачынку
«**Царскае паляваньне»**
пр.Партызанскі, 14
291-15-55
Басэйн, пакой адпачынку
**«Заімка»**
вул.Кальварыйская, 30а
204-09-77
Басэйн, пакой адпачынку
**«Касатка»**
пр.Ракасоўскага, 1
249-44-55, 249-44-49
Басэйн, джакузі, душ Шарка, пакой адпачынку
**«Лягуна»**
вул.Смалячкова, 9
284-50-72
Басэйн, пакой адпачынку, банкетная заля, масаж, бар
**«Ладэ»**
вул.Акадэмічная, 28
284-09-04
Басэйн, пакой адпачынку, масаж
**Саўна МТЗ**
вул.Стаханаўская, 16
230-86-12
Басэйн, джакузі, трэнажэры, салярый
**«Новая саўна»**
пр.Машэрава, 22
250-26-87
Басэйн, гідрамасаж, пакой адпачынку
**«Скрыжаваньне»**
вул.Панамарэнкі, 3а
252-15-07
Басэйн, пакой адпачынку, масаж
**Спарткомплекс «Алімпійскі»**
вул.Каліноўскага, 111
264-94-55, 264-00-06
Басэйн, саўна

KAICA

# Dzie vy, pa ladoŭniki Jani a?

Badaj, niama lepšaha srodku, kab abudzić u pačatkoŭca cikavaść da šachmat, čym *skachahrafičnyja*, abo vyjaŭlenčyja, zadačy. Niekali miane duža zaachvociła da hulni zadača rasiejca Karła Janiša, pakazanaja ŭ šachmatnaj pieradačy na BT. Kampazycyja 1849 h., u jakoj biełyja rabili śpiorty mat za 10 chadoŭ — abaviazkova śpiorty, bo prosty dajecca za adzin chod, — nazyvałasia «Žaleznaja kletka Tamerłana» (dyjahr. 1). Paśla 1. f3+ gf 2. ed+ cd 3. Sf5+ ef 4. Te6+ de 5. Td4+ cd 6. a8S+ Fd5 7. Sd5+ ed 8. Kf6+ gf 9. Fe5+ fe 10. Kg5X finalnaja pazycyja nadzvyčaj malaŭničaja — čorny karol trapiŭ u kletku z vaśmi piešak. Zadaču aŭtar pryśviaciŭ vajnie pamiž turkami i manhołami — čorny karol udavaŭ sułtana, biely koń — Tamerłana, jaki zapior Bajazida ŭ viaźnicu.

Paźniej, vypraviŭšysia na mižnarodny šachturnir u Pinsk, u hateli razam ź inšymi ŭdzielnikami ja paru viečaroŭ biŭsia nad zadačami, padrychtavanymi tamtejšym kampazytaram dziela našaj zabavy (i dla reklamy miesta!). U kožnaj z zadač figury vyjaŭlali na došcy znak, a znaki stvarali nazvu turniru: «Полесский этюд-91». Dahetul škaduju, što nie zachavaŭ arkušyk z daścipnymi zadańniami.

Jašče da Janiša pieršy rasejski majstar Alaksandar Piatroŭ šachmatnymi srodkami pakazaŭ ucioki Napaleona z Maskvy, dzie rolu źvilistaj raki Biareziny vykonvała… dyjahanal a8-h1. Dyk čamu b nie adlustravać na šachmatnaj došcy padzeji z sučasnaha biełaruskaha žyćcia? Naprykład, čakajuć uvasableńnia kampazycyji, što ilustravali b nabyćcio niezaležnaści, prezydenckija vybary, «revalucyju» ŭ sakaviku 2005 h… Admysłovy šachmatna-historyčny zbornik, biez sumnievu, upryhožyŭ by knižnyja vystavy TBM dy BNF. Što praŭda, balšynia biełaruskich kampazytaraŭ addaje pieravahu tradycyjnym žanram: voś i hazeta «Žviazda» da Dniu Pieramohi abviaściła była konkurs rašeńnia nie skachahrafičnych, a zvyčajnych šachmatnych problem.

Kirujučysia lozunham «zrabi sam», da stahodździa «Našaj Nivy» viadučy rubryki skłaŭ seryju skachahrafičnych zadačak (dyjahr. 2, 3). Kali chtości zdoleje lepšym čynam vyjavić litary «N» («H») albo ličby «1+0+0» na čorna-biełym pałatnie — napišycie pra heta ŭ «Kaisu». Karektnyja zadačy buduć apublikavanyja.

**V. Rubinnyk**

Як бы вы згулялі?

**Dyjahr. 1**



**Adkazy:**

U levaj «H» nie prachodzić 1. ń8F? z pahrozaj 2. Fb7X z-za 1...K~a5! Vyrašaje 1. ń8E+! i 2. Kc7X. U pravaj «H» słaba 1. Kg6? z-za 1...h4! Rašaje tolki 1. Kd2 ł 2. h3X.

U «adzincy» da mety viadzie 1. Kra1 Sb4 2. b1S! Sc3X. U nižnim «nuliku» biełyja staviać kaapmat paśla 1. f1T Tf3 2. Tg1 Tf2X. U vierchnim pamyłkova adrazu 1. Th7X? — nieskładany retraanaliz pakazvaje, što ŭ hetaj pazycyi chod čornych. Tady na 0...Ff8+ — 1. Tf8X, na 0...g5 — 1. Th7X.

**Dyjahr. 2** — źleva i sprava mat za dva chady.



**Dyjahr. 3** — źleva i sprava unizie kaaperatyŭny mat za dva chady (čornyja pačynajuć i dapamahajuć pastavić sabie mat). Sprava ŭviersie: mat za adzin chod.



ВАРТА БАЧЫЦЬ

## Пятніца, 8 ліпеня

**СТВ, 20.55**

«Крыльца ці ножка».

Францыя, 1976, рэж. Клод Зыдзі.

Камэдыя.

Дзюшэмэн (Люі дэ Фюнэс) — гурман і экспэрт, выклікае трымценьне ў гаспадароў рэстаранаў, бо выпускае штогоднікі, дзе зьедліва рэцэнзуе францускія ўстановы грамадзкага харчаваньня. Каб трапіць на варожую тэрыторыю, гурману прыходзіцца пераапранацца. Але аднойчы Дзюшэмэна распазнаюць і закормліваюць (благой ежай) да страты пачуцьця смаку й нюху. Гэта тым больш прыкра, што наперадзе ў дэгустатара — кулінарнае змаганьне з прамысловым магнатам…

## Субота, 9 ліпеня

**НТВ, 19.05**

«Францускі пацалунак».

ЗША, 1995, рэж. Лоўрэнз Каздан.

Рамантычная камэдыя.

Калі маладая амэрыканка Кэйт (Мэг Раян) даведваецца, што муж страціў галаву ад француженкі, гераіня пераадольвае страх перад палётам — і адпраўляецца ў Парыж, каб разабрацца зь нягоднікамі. Там жанчыну чакае гісторыя з кантрабандай, паліцыя (Жан Рэно) — і выпадковы нахабны таварыш (Кевін Кляйн — «Рыбка па імені Ванда»), які вучыць Кэйт майстэрству спакушэньня.

**БТ, 23.10**

«Шасьціструнны самурай».

ЗША, 1998, рэж. Лэнс Манджыя.

Постапакаліптычны рок-н-рольна-самурайскі фільм.

У 1957 годзе Амэрыка была разбамбаваная… У пустыні пануюць банды дзікуноў і галаварэзаў. Герой (Джэфры Фэлкан) жадае трапіць у Лас-Вэгас, дзе толькі што памёр Элвіс Прэслі, які сорак год кіраваў барбарскаю Амэрыкай. Звышгерой — адзін з прэтэндэнтаў на прастол: ён выдатна грае на гітары й валодае самурайскім мячом.

Карціна зьнята амэрыканскімі «паралельшчыкамі» й адзначана на кінафэстывалі ў Слэмдэнсе за найлепшы мантаж і найлепшую апэратарскую работу.



**АНТ, 23.15**

«Благое выхаваньне».

Гішпанія, 2004, рэж. Пэдра Альмадовар.

Драма.

Да вядомага рэжысэра Энрыка (Фэле Мартынэс — «Паразмаўляй зь ёй») прыходзіць стары сябар, зь якім яны калісьці вучыліся ў каталіцкай школе. Сябар прапануе сцэнар, заснаваны на гісторыі іхніх колішніх стасункаў. Але госьць зусім ня той чалавек, за якога сябе выдае…

Пэдра Альмадовар старанна пляце любоўна-дэтэктыўны трохкутнік, зь якога выдалены жанчыны.

**СТВ, 23.25**

«Пусты дом».

Паўднёвая Карэя—Японія, 2004, 2004, рэж. Кім Кі-Дук.

Паэтычная драма, прыпавесьць.

Маўклівы герой карціны пранікае ў чужыя і пустыя дамы. Там ён фатаграфуецца побач зь сямейным партрэтам і раніцай зьнікае, анічога ня скраўшы. У адной з кватэр юнак (Йе Хі) сутыкаецца зь пекнай фотамадэлькай (Лі Сын-Ён), якая далучаецца да бадзягі. Але аднойчы бадзяжныя вандроўнікі знаходзяць труп…

Карціна Кім Кі-Дука, расьпешчаная ўзнагародамі Вэнэцыянскага кінафэстывалю.

Кім Кі-Дук растлумачыў сваю карціну: «Кожны з нас — пусты дом, які з трывогай чакае, каб хтосьці адкрыў нас і скраў…»

## Нядзеля, 10 ліпеня

**«Лад», 12.25**

«Казка вандраваньняў».

Расея—Чэхаславакія—Румынія, 1982, рэж. Аляксандар Міта.

Казка-прыпавесьць.

Два нягоднікі выкрадаюць маленькага сірату, які валодае дарам адчуваць закапаныя скарбы. Сястра хлопчыка Марта адпраўляецца на пошукі брата. У вандраваньнях ёй дапамагае добры сябар Арланда (Андрэй Міронаў) — лекар, паэт і філёзаф.

Карціна Аляксандра Міты — глыбокая, мудрая і чалавечная казка-прыпавесьць. Андрэй Міронаў сыграў у гэтым фільме адну з найлепшых сваіх роляў, а ягоны Арланда — рэнэсансны дзівак, які змагаецца за дабро, калі вакол цемра.

Нават эпізадычныя пэрсанажы фільму аб'ёмныя, а геніяльная (!) музыка Альфрэда Шнітке стварае непаўторную шчымліва-велічную атмасфэру.

**«Лад», 21.25**

«Чараўніца».

Францыя—Італія—Швэцыя, 1955, рэж. Андрэ Мішэль.

Мэлядрама.

Інжынэр Ляран прыязджае з Парыжу ў глухі закутак Скандынавіі. Ён зачараваны пекнаю прыгажуняй Інгай (Марына Ўладзі), якую мясцовыя жыхары лічаць ведзьмаю…

Карціна мела шалёны посьпех у гледачоў усяго сьвету, а для Марыны Ўладзі стала квітком у сусьветны кінэматограф.

**Андрэй Расінскі**

## ІМПРЭЗА

Сьвяточныя Купалавы чытаньні 7 ліпеня а 17-й ля помніка Паэту. Аматары творчасьці Купалы.

## ТЭАТАР

**Гастролі купалаўцаў у Горадні**

**7 ліпеня** на сцэне Гарадзенскага абласнога тэатру акторы Купалаўскага тэатру пакажуць камэдыю па п'есе Яраслава Стэльмаха «Каханьне ў стылі барока».
**8 ліпеня** — трагічны парадокс польскага драматурга Вітольда Гамбровіча «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**9 ліпеня** — «Чорная панна Нясьвіжу» А.Дударава.
**10 ліпеня** — крымінальная мэлядрама «Кім» — «казка на нашых рэаліях. Так не бывае, але так можа быць...».
**11 ліпеня** — кранальная камэдыя Анатоля Дзялендзіка «Смак яблыка».
На закрыцьці гастроляў **12 ліпеня** гарадзенцы ўбачаць трагікамэдыю «Я не пакіну цябе...», створаную паводле п'есы «Інструкцыя на выжываньне для Old Ladies» Маё Саймана.

**Гастролі гарадзенцаў у Менску**

**З 6 да 12 ліпеня** Гарадзенскі абласны драматычны тэатар наведае Менск (сцэна Купалаўскага тэатру).
**7—8 ліпеня** менчукам прапануецца яркі і вясёлы спэктакль польскага аўтара М.Хэмара «Цудоўная Люцында» з музыкай, танцамі, забаўнымі куплетамі — усім наборам сапраўднага вадэвілю.
Гэтымі ж днямі на **Малой сцэне** — монаспэктакль заслужанага артыста Расеі Юр'я Трашкеева.
**9 ліпеня** — камэдыя Вудзі Алена «Сыграй гэта яшчэ раз, Сэм».
**10 ліпеня** — камэдыя ірляндзкага драматурга М.Макдонага «Адзінокі захад».
**11—12 ліпеня** — сцэнічная фантазія на падставе сюжэтаў Р.Горына «Рок-канцэрт з Рыгорам Горыным».

**Опэра**
**13** (ср) — канцэрт салістаў Беларускай Опэры.

**Балет**
**7** (чц), **8** (чц) — «Баядэрка».

**Тэатар імя Горкага**
**7** (чц) — «Опэра жабракоў».
**8** (пт) — «Суцяшальнік удоў».
**9** (сб) — «Амфітрыён».

**Купалаўскі тэатар**
**14** (чц) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**15** (пт) — «Кім».
**17** (ндз) — «Каханьне ў стылі барока».
**Малая сцэна**
**15** (пт) — «Адчыніце кантралёру!».

## КАНЦЭРТЫ

**Белдзяржфілярмонія**
**Вялікая заля**
**7** (чц) — «Песьні мінулых гадоў».
**11** (пн) — «Летнія прэм'еры».
**13** (ср) — дыплямант нацыянальных конкурсаў Багдан Бярозкін (баян).
**14** (чц) — «Allegro amabile».
**Заля камэрнай музыкі**
**7** (чц) — канцэрт фартэпіяннай музыкі.
**11** (пн) — «Ад Баха да Афэнбаха». «Клясык-Авангард».
**12** (аўт) — арганная музыка.

## ВЫСТАВЫ

**Стэфанія Станюта**
**Да 1 верасьня** ў музэі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (Музычны завулак, 5) будзе працаваць выстава, прысьвечаная 100-годзьдзю легендарнай актрысы Купалаўскага Тэатру Стэфаніі Станюты.

**Concerto Grosso Арлена Кашкурэвіча**
У Мастацкім музэі з **14 ліпеня да 25 жніўня** будзе працаваць выстаўка твораў Арлена Кашкурэвіча «Concerto Grosso».

**Менск: аблічча гораду**
**Да 20 жніўня** ў мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) працуе фатавыстаўка «Менск: аблічча гораду».

## РЫЦАРСТВА

**Ля сівых муроў Міра**
**9—10 ліпеня** з 9.30 да 17.30 наведнікі Мірскага замку змогуць убачыць часовы Рыцарскі Стан, арганізаваны ўдзельнікамі вайскова-гістарычнага клюбу «Волат» з Баранавіч. У ім будуць дэманстравацца пляценьне кальчугі, пашыў строяў і вышываньне, выраб кашалькоў і іншых старадаўніх прадметаў са скуры. Тамсама можна будзе ўбачыць ваярскія бойкі «тры на тры», рыцарскі турнір, танцы і рукапашныя бой. На жаданьні — бойка з рыцарам, стральба зь сярэднявечная лука, кіданьне бервяна і суліцаў.




## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Рэактар** (649-08-88, 766-24-25)
**15** (пн), 17.00 — міжнародны фэстываль «Metall-summer international». Квіткі: 9 500 (танцпол), 12 000 (столік).
**Bronx** (223-93-55)
**7** (чц), 22.00 — dj Laurel.
**8** (пт), 21.45 — жывая музыка: Тані Фарэда/dj Dust.
**9** (сб), 23.00 — dj Arsenti Tchouprina, dj Dasha Pushkina.
**10** (ндз), 17.00 — нядзельны кінасэанс.
**Izюм** (206-66-18)
**7** (чц), 22.00 — Royalty R'n'B.
**8** (пт), 22.00 — dj-bar.
**9** (сб), 22.00 — dj-bar.
**10** (ндз), 19.00 — «Sunday dance».
**Madison** (219-00-10)
**7** (чц), 22.00 — dj Nice.
**8** (пт), 22.00 — dj Nice.
**9** (сб), 22.00 — dj Nice.
**10** (ндз), 23.00 — «Staff party».
**Белая вежа** (284-69-22, 239-16-00)
**7** (чц), 23.00 — «White Tower»: dj Top, dj Grizzly, dj Bergamo, dj Alex.
**8** (пт), 23.00 — жывая музыка: «Acoustic Band»/dj Mixell, dj Dee.
**9** (сб), 1.00 — dj Mixell, dj Alex.
**10** (ндз), 23.00 — жывая музыка: «Acoustic Band»/dj Mixell.
**Бліндаж** (219-00-10)
**7** (чц), 23.00 — dj Egor.
**8** (пт), 23.00 — dj Макс Лайтаў.
**9** (сб), 23.00 — dj Макс Лайтаў, dj Egor.
**10** (ндз), 23.00 — dj Max Laitov, dj Egor.
**X-Ray** (223-93-55)
**8** (пт), 22.00 —dj-bar.
**9** (сб), 22.00 — dj-bar.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Вайна сусьветаў»: **8** (пт) 14.30 (іл), 16.40, 18.50, 20.00, 21.00; **9, 10** (сб, ндз) 12.20 (іл), 14.30, 16.40, 18.50, 20.00, 21.00.
«Пэрэпалах у інтэрнаце»: **8—10** (пт—ндз) 16.00, 18.00.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Містэр і місіс Сміт» (2с): **8** (пт) 13.30, 16.00, 18.30, 21.00; **9, 10** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Ля мора»: **8, 10** (пт, ндз) 16.40; **9** (сб) 18.50 (іл).
«Бой зь ценем»: **8, 10** (пт, ндз) 18.50 (іл), 21.00; **9** (сб) 16.40, 21.00.
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Вайна сусьветаў»: **8** (пт) 15.10, 17.20, 19.30, 21.40; **9, 10** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.10, 17.20, 19.30.
«Жмуркі»*** (прэм'ера): **9, 10** (сб, ндз) 21.40.
**«Масква»** (203-14-48)
«Вайна сусьветаў»: **8** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **9, 10** (сб, ндз) 15.00 (іл), 19.00.
«Жмуркі»*** (прэм'ера): **9, 10** (сб, ндз) 17.00, 21.00.
**«Мір»** (288-22-33)
«Містэр і місіс Сміт» (2с): **8** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **9, 10** (сб, ндз) 16.20 (іл), 18.40, 21.00.
«12 сяброў Оўшэна»: **8—10** (пт—ндз) 18.00, 20.00.
**«Перамога»** (203-77-66)
«Містэр і місіс Сміт» (2с): **8** (пт) 13.40, 16.10, 18.40; **9, 10** (сб, ндз) 13.40 (іл), 16.10, 18.40.
«Горад грахоў»****: **8—10** (пт—ндз) 21.10.
**«Піянэр»** (227-64-87)
«Жах Амітывілю»****: **8—10** (пт—ндз) 17.00, 21.00.
«Брыджыт Джонз: межы разумнага»: **8—10** (пт—ндз) 19.00.
**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Правілы здыманьня: Хітчаў мэтад»: **8—10** (пт—ндз) 13.30, 18.30.
«Адзін у цемры»: **8** (пт) 15.50, 21.00; **9, 10** (іл) 11.00 (іл), 15.50, 21.00.
(2с) — кінафільм падоўжанай працяглясьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 гадоў не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 гадоў.




## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатар**
**Тэатар юнага гледача**
**7** (чц) — «А досьвіткі тут ціхія».
**8** (пт) — «Залатое сэрцайка».

**Экспэрымэнтальная сцэна**
**11** (пн), **12** (аўт) — «Залатое сэрцайка».

**На сцэне Купалаўскага тэатру**
**10** (ндз) — «Жылі сабе дзьве лісічкі».

## КІНО ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**«Аўрора»**
«Пітэр Пэн у Нідзеляндыі»: **8** (пт) 10.30; **9, 10** (сб, ндз) 12.00.
«Гарэзы»: **9, 10** (сб, ндз) 14.00.
**«Берасьце»**
«Чатыры таксісты і сабака»: **8—10** (пт—ндз) 11.00.
**«Дружба»**
«Карпарацыя монстраў»: **8** (пт) 10.30; **9, 10** (сб, ндз) 15.00.
«Плянэта скарбаў»: **8, 9** (пт, сб) 13.00; **10** (ндз) 11.00.
«Маленькія ўцекачы»: **8** (пт) 15.00; **9** (сб) 11.00; **10** (ндз) 13.00.
**«Масква»**
«Гарфілд»: **10** (ндз) 13.00.
**«Мір»**
«Падводная братва»: **8** (пт) 10.30; **9, 10** (сб, ндз) 15.00.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **8—10** (пт—ндз) 14.00.
**«Піянэр»**
«Ліла і Стыч»: **8—10** (пт—ндз) 10.20.
«Легенда пра рыцара»: **8—10** (пт—ндз) 12.20.
«Я — Цэзар»: **8—10** (пт—ндз) 14.20.
**«Цэнтральны»**
«Супэрсямейка»: **8** (пт) 11.00.

## КІНО НА DVD

MASTER RECORDS

**«Азумі 2: сьмерць ці каханьне»**
Самурайскі баявік, Японія, 2005, рэж. **Шузуке Канэка**
У ролях: **Ая Ўета, Чыакі Курыяма, Юма Ішыгакі**
Толькі прыгожая ваярка Азумі здольная спыніць галоўнага ворага Такугавы насуперак цэлай арміі нанятых ніндзя.

**«Матылёк»**
Мэлядрама, Ганконг, 2004, рэж. **Ян Ян Мак**
У ролях: **Джозі Хо, Стэфані Чэ**
Сустрэча замужняй настаўніцы Флавіі з прыгожай Йіп выклікае забытыя ўспаміны. Гераіня разрываецца паміж пачуцьцямі і абавязкам...
Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Другое прышэсьце марсіянаў

**«Вайна сусьветаў» («War of the Worlds»)**
ЗША, 2005, каляровы, 116 хв.
**Жанр:** жудасная фантастыка паводле аднайменнага раману Гэрбэрта Ўэлза
**Адзнака:** 7,5 (з 10)


WWW.MOVIEWEB.COM

Атмасфэра разгубленасьці, трывогі й жаху адрозьнівае «Вайну сусьветаў» Сьпілбэрга ад бравурна-аптымістычнага «Дня Незалежнасьці» Раланда Эмэрыха, а кампутарныя эфэкты зьдзяйсьняюць пэсымістычныя прароцтвы Г.Ўэлза.

«Гэта тэрарысты? Тэрарысты?» — некалькі разоў пытаецца ў карціне юнак. Амаль што так: схаваныя ў зямлі чужынскія баявыя машыны былі абуджаны «маланкавым» дэсантам іншаплянэцян — і вось ужо пачварныя трыножкі зьнішчаюць гарады й паляць прамянямі людзей.

Сьпілбэрг перанёс дзеяньне раману Ўэлза з Англіі ў ЗША (а першае ўварваньне ворагаў, згодна з рэжысэрам і сцэнарыстам, адбылося ва Ўкраіне). Рэй (Том Круз), якому былая жонка прывезла на выходныя дачку й сына, імкнецца выратаваць дзяцей.

У фільме ёсьць абавязковыя для карціны такога кшталту сцэны панікі, разгрому зямных войскаў і трыюмфу іншаплянэцян. Але рэжысэру цікава дакрануцца да экзыстэнцыйнага шоку, стану краху й крызісу, калі адзінае збавеньне — сям'я. Спэцэфэктаў у «Вайне сусьветаў» ня шмат, але Сьпілбэрг выдае іх акуратнымі дозамі, надзвычай умела вымотваючы нэрвы гледачам, каб каранаваць чаканьне лазэрнымі прамянямі, чырвонапластыкавымі водарасьцямі й агідными іншаплянэтнымі пысамі.

Як і ангельскі фантаст, Сьпілбэрг зрабіў пераможцамі не людзей, а выпадак, схаваны ў мірыядах часьцінак. Ад гэтага карціна сталася яшчэ страшнейшай. Зацягвае і не адпускае нават пасьля прагляду.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Рэнтабэльная памяць



Беларускае царства мёртвых — гэта нешта накшталт рынку турыстычных апэратараў. Фэльетон Лёліка Ушкіна.

Гэтай зімой «Навінкі» спрабавалі зьняць ролік.

Прыдумалі фантасмагарычны сцэнар: працягваючы практыку аднаўленьня гістарычнага ляндшафту, улады не прыпыніліся на «Лініі Сталіна». Каб аднавіць вобраз Менску часоў Усяслава Чарадзея, насыпалі вал па вуліцы Гарадзкі Вал. І калі на «Лініі Сталіна» турыст можа пастраляць з кулямёта «Максім» па імправізаваных фашыстах, на вале за адпаведныя грошы аматары гістарычнай экзотыкі могуць выліць на імправізаваных татар кіпень з гарбатніка. Шкада, што праз наша разьдзяўбайства стужка так і ня ўбачыць сьвету.

Сэнс у тым, што амаль да ўчора ўсе былі ўпэўнены, што «Лінія Сталіна» — звычайны атракцыён. Як вынік, словы прэзыдэнта «Комплекс павінен быць самаакупным», якія прагучалі падчас адкрыцьця, былі абсалютна зразумелымі. Незразумела, праўда, хто папрэцца пад Заслаўе і яшчэ выкладзе лавэ, каб паглядзець гармату ЗІС-3 выпуску 1942 году. Яе можна зазырыць і ў музэі ВАВ. Прычым на дурня.

Прыкалола іншае — калі наш лідэр усклаў кветкі да мэмарыяльнай дошкі героям — абаронцам беларускай «лініі Мажыно».

Оба-на! Ступень праяўленьня памяці да герояў абароны ЛС залежыць ад рэнтабэльнасці. Ня будзе адрэстаўраваны дот прыносіць лавандос — мэмарыял, трэба разумець, зачыняць. Натуральна, сцяжыначка да мэмарыяльнай шыльды абсалютна не зарасьце. Аднак хеўры сяброў БРСМ, якіх хутка прыгоняць сюды, ня будзе.

Яшчэ цікавей паглядзець на ініцыятыву з пункту гледжаньня тэорый танаталёгіі — навукі аб разуменьні сьмерці. Пазбавіўшыся хваста, чалавек выпрацаваў некалькі мадэляў стаўленьня да памерлых: анімістычную (мёртвыя — раўнапраўныя суб'екты жыцьця), рэлігійную (рабі як Хрыстос — і пазьбегнеш сьмерці), сэкулярызаваную (татальная актуалізацыя асобы), нэкрарэалізм (эстэтыка сьмерці). Канцэпт памяці «Лініі Сталіна» — апошні піск.

Ушанаваньне мёртвых адбываецца ў форме эксплюатацыі іхніх імёнаў на рынку. Сьмерць у такім разе можа разглядацца як пераход зь фізычнага статусу ў статус таварны. Чым больш шануеш продкаў, тым больш на іх рубіш капусты. Застаецца прыняць адпаведны ўказ аб формах культу мёртвых.

Радаўніца і Дзяды могуць набыць фармат вялікіх базараў турыстычных паслуг. Прыходзіш на могілкі і рэклямуеш свайго, скажам, дзеда: «Шаноўныя, наведайце магілу прадзеда. Усяго за тысячу рублёў вы ўбачыце героя японска-расейскай вайны. Калектыўным наведвальнікам бонус…» Або: «Прагляд магілы маёй прабабкі, якая бачыла прыгон!» Вось гэта сапраўды памяць! Гэта вам не гарэлку на могілках глушыць.


АЛЯКСАНДАР АРЦЕМ'ЕЎ

САПЕГА ВЯРНУЎСЯ ў горад-герой Быхаў. Старонка 7.

ПАДЗЯКА

Дзякуй Кастусю Акулу з Таронта за падтрымку.

Ліцэнзія №02310100189 ад 24 траўня 2001 году
**АЛЬТУС ПЛЮС**
**Наведайце разам з намі**
**Самыя прыгожыя замкі Ўкраіны**
**Камянец-Падольскі і Хоцін**
**22–25 ліпеня**
**Праграма туру**
Адпраўленьне зь Менску а 18-й.
**1-шы дзень**
Прыбыцьцё ў Камянец-Падольскі;
Разьмяшчэньне ў гатэлі турклясы;
Паездка ў **«Крышталёвыя пячоры»**;
Экскурсія ў **Хоцінскую крэпасьць**;
**2-гі дзень**
Аглядная пешаходная экскурсія па старажытным Камянцы;
Экскурсія ў Катэдральны касьцёл;
Экскурсія ў Старую крэпасьць;
**Прыбыцьцё ў Менск зранку**
Кошт туру 45 у.е. + 22 000 рублёў.
У кошт уваходзяць транспартныя паслугі, пражываньне ў гатэлі турклясы, экскурсійнае абслугоўваньне.
Уваходныя квіткі аплочваюцца дадаткова.
Адрас: Менск, вул.Кастрычніцкая, 5-320
Т.: 222-46-51

**Вокны, дзьверы. ПВХ. Т.: 342-91-94**

Прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна даслаць поштай (а/с 537, 220050, Менск), праз e-mail на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ТАМАДА

**Шукаем** беларускамоўнага тамаду (пажадана з баянам ці акардэонам) для вясельля. Т.: 680-71-52

### ВІТАНЬНІ

Z Dniom Narodzinaŭ, vielmi šanounaja pani Malinoŭskaja! Ulad

### КАНТАКТЫ

**Куплю ўзнагароды** БНР, БЦР, БКА, манэты ВКЛ, Рэчы Паспалітай, фота ваенных (беларускія нацыянальныя фармаваньні часоў 2-е сусьветнае вайны). E-mail: zmagar@yahoo.com. Т.: 8-029-722-46-04

**Цікавіць інфармацыя**, дакумэнты, фота, зьвязаныя з Булак-Балаховічам, «Зялёным дубам», «Чорным катом», беларускай партызанкай, — набуду.

E-mail: zmagar@yahoo.com. Т.: 8-029-722-46-04

**Шукаю этнаграфічныя** і гістарычныя матэрыялы, прысьвечаныя беларускай Смаленшчыне. Лістуйце на e-mail: faberr@mail15.com

### КНІГІ

**Кнігаабмен**: 753-91-96

**Прадам кнігі**: «Беларускае народнае адзеньне» М.Раманюка, «Беларускі кнігазбор»: Гётэ, «Філяматы і філярэты», Баршчэўскі. «Тэўтонскі ордэн», Ян Чачот, «Армія Краёва на Беларусі», «Да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне 1939—1951 г.» ды іншае, багаты выбар. Т.: 753-70-05

**Прадам кнігі**: «Споведзь», «Ад родных ніў» Л.Геніюш, «Добрыя весьці» У.Сыракомлі, факс., Прага, 1942; кнігі па архітэктуры, гісторыі, археалёгіі, этнаграфіі, багаты выбар. Т.: 753-70-05

**Новыя** ды рэдкія кнігі на ўсе густы ды ўзросты, відэа, аўдыё, CD, футболкі, значкі, налепкі на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (13.00—19.00). Т.: 707-40-01, 234-93-71

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юры

**Запрашаем у Грунвальд**

**10 ліпеня (нядзеля)**
**Менск — Іўе — Ліпнішкі — Суботнікі — Геранёны — Беняконі — Жамыслава — Тракелі — Гайцюнішкі — Менск.**

**15-18 ліпеня**
**Грунвальд — Мальбарк — Гданьск.**

**21-24 ліпеня**
**Басовішча.**

**Т.: 232-54-58; 622-57-20 (Зьміцер) 264-12-38; 776-24-35 (Павал)**

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3287. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 20.00 06.07.2005.
Замова № 3870.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а